Г. А. КАХАНОЎСКІ

# АРХЕАЛОГІЯ І ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ

## у XVI–XIX стст.



Г. А. КАХАНОЎСКІ

# АРХЕАЛОГІЯ І ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ ў XVI—XIX стст.

Навуковы рэдактар
доктар гістарычных навук
Л. Д. ПОБАЛЬ

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1984

ББК 63.3(2Б)
К30

Рэцэнзенты:
М. М. Улашчык, д-р гіст. навук,
М. А. Ткачоў, канд. гіст. навук,
М. М. Чарняўскі, канд. гіст. навук

**Каханоўскі Г. А.**

К 30 Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI—XIX стст. / Навук. рэд. Л. Д. Побаль.— Мн.: Навука і тэхніка, 1984.— 120 с.

У пер.: 1 р. 40 к.

Манаграфія змяшчае багаты крыніцазнаўчы матэрыял па праблемах развіцця археалогіі і краязнаўства Беларусі ў дарэвалюцыйны час, уклад у навуку З. Даленгі-Хадакоўскага, Т. Нарбута, Я. і К. Тышкевічаў, А. Кіркора, У. Сыракомлі і інш. Расказана пра дзейнасць Віленскага музея старажытнасцей, Археалагічнай камісіі, некаторых прыватнаўласніцкіх музеяў.

Разлічана на выкладчыкаў і студэнтаў, навукоўцаў, работнікаў Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

К $\frac{0505040000-149}{М316-84}$ 17—84

ББК 63.3(2Б)

© Выдавецтва
«Навука і тэхніка», 1984.

# УВОДЗІНЫ

Зямля, на якой мы жывём, стагоддзямі захоўвае незлічоныя помнікі старажытнасці. З маленства яны ўваходзілі ў нашу свядомасць праз легенды, паданні і песні. Рэшткі мінулага ў выглядзе курганоў, гарадзішчаў, замкаў заўсёды захаплялі сваёй таямнічасцю. Разгадкі іх — вось стымул пазнання, які захапляе этнографаў, фальклярыстаў, а найбольш і найперш становіцца кампетэнцыяй археалогіі — навукі, якая даследуе гістарычнае мінулае па помніках старажытнасці на падставе рэчавых крыніц, здабытых у асноўным шляхам раскопак.

Першавытокам археалогіі з'яўляецца гістарычнае краязнаўства — галіна гістарычнай навукі, якая займаецца вывучэннем мінулага краю, акрэсленай, параўнальна невялікай тэрыторыі ці асобнага населенага пункта, што праводзіцца пераважна мясцовымі аматарамі вывучэння рэгіёна. Менавіта гістарычнае краязнаўства да XIX ст. заставалася вызначальнай з'явай у вывучэнні мінулага краю. І толькі на рубяжы XVIII і XIX стст. археалогія вылучылася ў самастойную галіну ведаў. Хоць і ў гэты час у іх развіцці вялікай розніцы не было. Толькі з канца XIX— пачатку XX ст. археалогія стала вядучай навукай у даследаванні далетапіснай гісторыі.

Сучасная археалагічная навука мае вялікія магчымасці для свайго развіцця. Штогод у экспедыцыі па Беларусі накіроўваюцца дзесяткі атрадаў даследчыкаў. Шляхам разведак і раскопак вывучаюцца самыя разнастайныя помнікі ад часоў палеаліту да позняга сярэдневякоўя. Грунтоўней і глыбей даследуюцца археалагічныя культуры з прыцягненнем вынікаў дасягненняў іншых галін ведаў. На падставе археалагічных крыніц больш аргументавана распрацавана дапісьмовая гісторыя Беларусі.

Поспехаў дасягнула і гістарычнае краязнаўства. У рэспубліцы працуе каля 50 музеяў гэтага профілю, пад уплывам якіх сотні аматараў вывучаюць родныя мясціны. Сучаснае краязнаўства грунтуецца толькі на навуковай аснове даследаванняў і спрыяе вывучэнню і ахове помнікаў гісторыі і культуры, у тым ліку і помнікаў археалогіі.

Выдавецтвы рэспублікі ў пасляваенны перыяд выпусцілі каля 50 кніг пра беларускія гарады, а таксама брашуры, буклеты пра найбольш славутыя мясціны, што яскрава сведчыць пра інтэнсіўнасць развіцця краязнаўства на сучасным этапе. Прапагандуе помнікі старажытнасці інфармацыйна-метадычны бюлетэнь «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», на старонках якога пастаянна змяшчаюцца артыкулы і даследаванні па археалогіі і гістарычным краязнаўстве.

14 ліпеня 1978 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры», у якім знайшлі адлюстраванне і помнікі археалогіі. У Канстытуцыі БССР (раздзел «Асноўныя правы, свабоды і абавязкі грамадзян БССР») у арт. 66 запісана: «Клопат аб захаванні гістарычных помнікаў і іншых культурных каштоўнасцей — доўг і аба-

вязак грамадзян Беларускай ССР». Гэта значыць, што турботы аб захаванні помнікаў гісторыі і культуры, у тым ліку і археалогіі, маюць характар канстытуцыйнага патрабавання.

Гісторыя археалогіі Беларусі — гэта маладая галіна гістарычнай навукі. Даследчыкі-археолагі пераважна пісалі толькі пра свае адкрыцці і вельмі рэдка цікавіліся перадгісторыяй адкрыцця. Бясспрэчна, гэта прыносіла шкоду самой жа навуцы. Ніхто цяпер не стане адмаўляць, што вытокі сённяшніх поспехаў археолагаў і краязнаўцаў у намаганнях многіх пакаленняў вучоных і нават аматараў-даследчыкаў, якія яшчэ да XX ст. назапасілі багаты эмпірычны матэрыял, закладвалі асновы археалагічнай навукі і гістарычнага краязнаўства. На ўсіх этапах развіцця кожнай навукі, у тым ліку і археалогіі Беларусі, уласціва падсумоўваць свае дасягненні, і тады кожны вынік уваходзіць у яе фонд, пры гэтым не перакрэсліваецца пазнейшымі поспехамі, а толькі крытычна ацэньваецца і ўдакладняецца. Між тым некаторыя адкрыцці ў археалогіі Беларусі былі зроблены ў першай палове XIX ст., якія не страцілі сваёй актуальнасці нават і зараз. Так, Я. П. Тышкевіч, вывучаючы пахавальны абрад крывіцкіх курганоў, першым адзначыў іх асаблівасць — скроневыя кольцы ў жанчын. А спосаб вызначэння па форме скроневага кальца месца жыхарства крывіцкіх плямёнаў быў унікальным для свайго часу. Археолагі Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы першымі ў Расіі звярнулі ўвагу на важнасць вывучэння эпохі каменя. Яны сваімі даследаваннямі першымі ў Расіі практычна пацвердзілі тэорыю трох эпох дацкага археолага К. Томсена. Такіх прыкладаў ёсць нямала. Цікавыя і самі прадметы знаходак, інтэрпрэтацыю якіх можна даваць незалежна ад той, якую давалі іх адкрывальнікі. А значыць, і цяпер яны могуць быць на службе археалагічнай навукі.

Аўтар манаграфіі паставіў задачу на аснове апублікаваных і выяўленых у архівах і музеях матэрыялаў падсумаваць звесткі пра развіццё археалогіі і гістарычнага краязнаўства Беларусі ў эпоху феадалізму, канчаючы перадрэформенным перыядам XIX ст. Пачаткам даследавання паслужылі краязнаўчыя матэрыялы XVI—XVII стст., у якіх сустракаем першыя ўпамінанні пра помнікі старажытнасці Беларусі. Звернута асаблівая ўвага на гістарычны працэс развіцця навукі, на тыя цяжкасці не толькі даследчыцкага, але і сацыяльнага плана, пры якіх працавалі археолагі і краязнаўцы ў эпоху феадалізму, на праблемы, якія ўзнікалі перад імі. Бясспрэчна, што пры вывучэнні гістарычнага працэсу станаўлення навукі нельга абысці маўчаннем тагачаснае палітычнае становішча на Беларусі, якое адбівалася на дзейнасці арганізацый, навуковых таварыстваў і асобных даследчыкаў. Аўтар гэтай працы правёў адбор найважнейшых матэрыялаў, звёў некаторыя факты з гісторыі вывучэння і аховы помнікаў, погляды на іх захаванне з боку розных колаў, і ў першую чаргу дзяржаўных устаноў і прыватных асоб.

Акрамя таго, пры напісанні гэтай кнігі былі цяжкасці і такога роду, як вызначэнне этнаграфічных межаў Беларусі. Многія тагачасныя даследчыкі па-рознаму яе называлі. Як гэта ні парадаксальна гучыць сёння, але ў эпоху феадалізму Беларусь не мела сваёй адзінай назвы. Сама назва «беларусы» канчаткова ўсталявалася ў другой палове XIX— пачатку XX ст. У ранейшыя часы жыхары Беларусі называлі сябе «рускімі», «палякамі», «ліцвінамі», «тутэйшымі», «палешукамі», «пінчукамі» і г. д. Асабліва ўплывала на самавызначэнне мясцовых жыхароў іх веравызнанне: праваслаўныя лічылі сябе рускімі, католікі — палякамі. Гэта ў пэўнай меры ўскладняла даследчую работу.

У гэтай кнізе ў асобныя падраздзелы вылучана даследаванне дзейнасці такіх вядомых дзеячаў археалагічнай навукі, як Зарыян Даленга-Хадакоўскі, Тэадор Нарбут, Яўстафій Тышкевіч, Канстанцін Тышкевіч, Адам Кіркор і інш., чый уклад у вывучэнне беларускіх старажытнасцей найбольш значны на фоне аматарскіх захапленняў.

У кнізе даецца характарыстыка развіцця археалогіі і гістарычнага краязнаўства Беларусі ў эпоху капіталізму. У гэты час з найбольш грунтоўнымі даследаваннямі выступілі Е. Р. Раманаў, А. П. Сапуноў, М. Ф. Кусцінскі, М. М. Турбін, У. З. Завітневіч і інш. Аўтар завяршае сваё даследаванне IX Археалагічным з'ездам у Вільні (1893 г.), які даў штуршок развіццю музейнай справы і краязнаўства.

Улічваючы, што ранейшыя даследчыкі глядзелі на прадмет археалогіі вельмі шырока, намі адбіраліся тыя матэрыялы, звесткі і факты, якія характарызавалі іх уяўленні па важнейшых пытаннях навукі і якія маюць цікавасць для сённяшніх даследаванняў (этнагенез славян, некаторыя аспекты метадалагічнага парадку і інш). Тэрміны «каменны век», «бронзавы век», «жалезны век» і іншыя ўжыты намі ў тым значэнні і сэнсе, як іх разумелі даследчыкі эпохі феадалізму.

Асобны раздзел кнігі прысвечаны вывучэнню археалагічных калекцый, якія былі ў тагачасных музеях і ў прыватных асоб. Асаблівая ўвага звернута на дзейнасць Віленскага музея старажытнасцей і Віленскай археалагічнай камісіі, дзе працавала большасць выхадцаў з Беларусі і якія зрабілі важкі ўклад у станаўленне і развіццё археалагічнай навукі, ахову помнікаў гісторыі і культуры.

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Той узровень, якога дасягнула беларуская археалогія, — гэта плён не аднаго пакалення вучоных і аматараў краязнаўства. Першыя старонкі гістарыяграфіі археалогіі Беларусі пісаліся амаль аднаЧасова з узнікненнем гэтай галіны ведаў. Ужо ў сярэдзіне XIX ст. К. П. Тышкевіч у сваіх працах[1] пазнаёміў чытачоў не толькі з тагачаснымі даследаваннямі археолагаў і краязнаўцаў, але ўпершыню паспрабаваў ахарактарызаваць іх погляды на старажытную гісторыю, разгледзець ідэі і гіпотэзы сваіх папярэднікаў. Найбольш высока ацаніў ён уклад З. Даленгі-Хадакоўскага. К. П. Тышкевіч пісаў пра навуковыя поспехі Т. Я. Нарбута, А. К. Кіркора, Я. П. Тышкевіча, У. А. Сыракомлі, М. Ф. Кусцінскага, адзначыўшы іх уклад у зараджэнне і станаўленне беларускай археалогіі і гістарычнага краязнаўства. Ён параўнаў іх працы з аналагічнымі працамі вучоных Расіі, Польшчы, Украіны і некаторых заходнееўрапейскіх краін і зрабіў выснову, што мясцовая археалогія ў асноўным знаходзілася на ўзроўні свайго часу. Кожную наступную манаграфію ён пачынаў з гістарыяграфічнага агляду, уводзячы ў навуковы ўжытак новыя імёны даследчыкаў. Напрыклад, сярод ранніх даследчыкаў мясцовых старажытнасцей ён назваў Крыштафа Яна Хартнюха (1644—1687)[2].

Больш сцісла сказана пра пачаткі краязнаўства і археалогіі Беларусі ў працах Я. П. Тышкевіча [3], які абмінаў такія важныя моманты, як методыка збірання матэрыялаў, храналагічна-паслядоўнае развіццё археалагічных ведаў. Ды і публікацыі сваіх папярэднікаў аўтар разглядаў павярхоўна. Тым не менш у яго манаграфіі пра Барысаўскі павет упершыню знаходзім матэрыял аб мясцовых краязнаўцах, археолагах, этнографах, фалькларыстах, пра іх навуковыя захапленні, а таксама пра аматараў збірання хатніх калекцый.

Паведамленні аб працах сваіх папярэднікаў мы знаходзім у А. К. Кіркора, І. І. Крашэўскага, У. А. Сыракомлі, П. М. Шпілеўскага, В. А. Каратынскага і іншых аўтараў, аднак усе яны разглядалі дзейнасць мясцовых аматараў археалогіі і краязнаўства павярхоўна і бегла.

Шмат працавалі над вывучэннем гісторыі старажытнай Беларусі А. П. Сапуноў, Е. Р. Раманаў, М. В. Доўнар-Запольскі, В. А. Шукевіч, Ф. В. Пакроўскі і інш. Амаль усе яны ў прадмовах да публікацый рабілі экскурс у гісторыю развіцця беларускага краязнаўства і археалогіі. На жаль, ніхто з іх не прысвяціў даследаванню гэтай тэмы асобнай работы, хоць, як вядома, Е. Р. Раманаў, М. В. Доўнар-Запольскі, А. П. Сапуноў — вучоныя шырокага дыяпазону, іх спадчына шматгранная, яны не раз звярталіся да археалагічных крыніц з мэтай атрымання неабходных даных для пабудовы сваіх канцэпцый па старажытнай гісторыі.

Як вядома, гістарыяграфія пішацца па выніках дзейнасці даследчыкаў розных пакаленняў. У дакастрычніцкі перыяд навуковы вопыт у

галіне археалогіі і гістарычнага краязнаўства быў яшчэ небагаты і займацца гістарыяграфіяй было тады яшчэ рана. Засталіся толькі сціслыя публікацыі на гэтую тэму.

У 20—30-х гадах XX ст. задачу напісання гістарыяграфічнага агляду вывучэння старажытнасцей паўночнай Беларусі ўзяў на сябе Б. Р. Брэжга [4]. У сваіх публікацыях ён паказаў дабратворны ўплыў лепшых прадстаўнікоў суседніх народаў на вывучэнне і ахову помнікаў археалогіі і старажытнай архітэктуры паўночнай Беларусі і Латгаліі. Б. Р. Брэжга паказаў, што было зроблена на кожным гістарычным адрэзку часу ў вывучэнні старажытнасцей, пачынаючы ад першых заснавальнікаў прыватных музеяў і збіральнікаў археалагічных матэрыялаў і да першых краязнаўча-археалагічных публікацый. Пра некаторых краязнаўцаў (як А. А. Плятар, М. І. Борх) ён упершыню падае кароткія біяграфічныя звесткі. Аднак, на наш погляд, Б. Р. Брэжга памылкова адносіць пачатак музейна-збіральніцкай дзейнасці А. А. Плятара да 1800 г., калі апошняму споўнілася ўсяго 8 гадоў [5]. Як і многія іншыя даследчыкі, Б. Р. Брэжга аддаў глыбокую даніну павагі З. Я. Даленгу-Хадакоўскаму, назваўшы яго першым сапраўдным археолагам, які пачаў весці рэгулярныя раскопкі. Адзначана была таксама і паспяховая навуковая дзейнасць па вывучэнню віцебскіх старажытнасцей А. М. Семянтоўскага, М. Ф. Кусцінскага, Е. Р. Раманава, Э. Вольтара, Ф. Крузе, В. Сізова і інш. Асобную кнігу Б. Р. Брэжга прысвяціў музеям Віцебшчыны [6].

У савецкі час беларускае краязнаўства і археалогія атрымалі далейшае развіццё, якое рэгулявалася дзяржаўнымі і навуковымі ўстановамі. Па-новаму асэнсоўваліся дасягненні даследчыкаў, якія жылі і працавалі ў дарэвалюцыйны час. Гістарыяграфіі беларускага краязнаўства прысвяціў свае працы М. І. Касяровіч [7], археалогіі — С. А. Дубінскі [8]. М. І. Касяровіч [9] па праву гістарыёграфа ахарактарызаваў станаўленне і развіццё беларускага краязнаўства як з'яву шматгранную, а сам працэс развіцця як паслядоўны і няспынны. Праўда, даследаваў вучоны гэтую галіну ведаў толькі з сярэдзіны XIX ст. Больш грунтоўна аўтар разгледзеў вывучэнне краю ў пазнейшы час. З марксісцкіх пазіцый ён падсумаваў увесь вопыт вывучэння Беларусі ў дакастрычніцкі перыяд і ўказаў на істотную розніцу прызначэння краязнаўства ў эпоху сацыялізму. У царскай Расіі краязнаўства было справай энтузіястаў. Задачы беларускага савецкага краязнаўства былі сфармуляваны на першай канферэнцыі краязнаўцаў у Мінску ў 1924 г., дзе прызналі лічыць «краязнаўчую працу неабходнай прадпасылкай сацыялістычнай гаспадаркі, якая вымагае самага шырокага і свядомага з боку нашага кожнага працаўніка выкарыстання вытворчых сіл краю, і асновай культурнага будаўніцтва».

Упершыню стварыўшы абагульненую «Бібліяграфію па археалогіі Беларусі», С. А. Дубінскі [10] тым самым прадэманстраваў поспехі ў гэтай галіне. Адначасова кніга выявіла, што тады яшчэ мала было на Беларусі даследаванняў па эпохах каменю і бронзы, хаця складальнік бібліяграфіі пералічыў працы ўсіх яму вядомых даследчыкаў беларускай археалогіі з пачатку XIX ст. і да 30-х гадоў XX ст. Да гэтага ж часу адносяцца кароткія гістарыяграфічныя публікацыі М. Ламакі [11], Д. Васілеўскага [12], М. М. Нікольскага [13], У. І. Пічэты [14], у якіх закраналіся пытанні развіцця гістарычнай навукі.

Некаторыя аспекты вывучэння беларускай археалогіі і краязнаўства закранаў У. М. Перцаў [15], які адначасова патрабаваў перагледзець

спадчыну дарэвалюцыйных гісторыкаў і даць ім ацэнку з пазіцый марксізму-ленінізму.

Навуковыя дасягненні даследчыкаў матэрыяльнай культуры Беларусі XIX ст. разгледжаны В. К. Бандарчыкам, які засяродзіў увагу на станоўчым у дзейнасці дарэвалюцыйных этнографаў, прывёў новыя гістарыяграфічныя факты, хаця некаторыя з іх патрабуюць далейшага вывучэння і ўдакладнення [16]. Асобны гістарыяграфічны раздзел М. Ф. Піліпенка з пазіцый дасягненняў сучаснай этнаграфіі ўвёў у сваім дапаможніку для ВНУ [17]. А. У. Арцыхоўскі ў аглядзе тэарэтычных даследаванняў і палявых работ археолагаў дарэвалюцыйнай Расіі асабліва значэнне надаваў даследчыку старажытнасцей З. Я. Даленгу-Хадакоўскаму як найбольш самабытнаму вучонаму сярод сваіх сучаснікаў [18]. Сярод сённяшніх гістарыёграфаў археалогіі пачэснае месца належыць А. А. Фармозаву, які прапанаваў свае прынцыпы ў адборы гістарыяграфічных матэрыялаў. Галоўны з іх: перш-наперш звяртаць увагу на навуковыя ідэі, а не на палявыя адкрыцці [19]. Гэта методыка А. А. Фармозава каштоўная з пункту гледжання гісторыі навукі. Вывучыўшы дзейнасць шматлікіх даследчыкаў археалогіі XIX ст., ён у асноўным правільна ацаніў іх дасягненні з улікам тагачасных умоў, у якіх працавалі вучоныя, а таксама прывёў прыклады творчай пераемнасці паміж рознымі пакаленнямі гісторыкаў-старажытнікаў. А. А. Фармозаў лічыць важнай задачай гістарыёграфаў збіраць звесткі пра археалагічныя знаходкі, якія былі выяўлены ў розныя часы, яны каштоўныя «для складання археалагічных карт, і для статыстыкі, і самі па сабе» [20]. Ён таксама раіць трымаць у полі зроку пісьмовыя крыніцы з інфармацыяй пра неадкрытыя помнікі, «старадаўнія апісанні і малюнкі старажытнасцей, якія ўцалелі да сённяшняга дня» [21]. Хоць А. А. Фармозаў спецыяльна гісторыяй беларускай археалогіі не займаўся, але ўказаў на каштоўнасць навуковых адкрыццяў і пошукаў З. Я. Даленгі-Хадакоўскага [22].

Нягледзячы на высокі ўзровень сучаснай беларускай археалогіі, да гэтага часу яшчэ мала напісана гістарыяграфічных даследаванняў. Праўда, амаль кожны з сучасных археолагаў Беларусі лічыць абавязковым сваю працу пачынаць з аналізу даследаванасці той або іншай праблемы, з рэтраспектыўнага агляду неабходнай літаратуры. На жаль, гістарыяграфія ў большасці гэтых аўтараў пачынаецца з агляду прац, якія з'явіліся не так даўно, а часцей за ўсё бярэцца пад увагу вопыт археолагаў і краязнаўцаў толькі апошніх дзесяцігоддзяў. Самі ж публікацыі вучоных XIX ст. дэталёва не аналізуюцца. Падагуліць вынікі дзейнасці ранейшых археолагаў і краязнаўцаў пакуль што ніхто не ставіў сваёй мэтай. Змястоўнасцю вылучаюцца гістарыяграфічныя агляды дакастрычніцкай археалогіі Беларусі Л. В. Аляксеева [23] і савецкай — У. Д. Будзько і А. Р. Мітрафанава [24]. Нарыс Л. В. Аляксеева ў «Советской археологии» з'яўляецца больш поўным апісаннем развіцця дарэвалюцыйнай беларускай археалогіі, у меншай меры краязнаўства. Аўтар станоўча ацаніў дзейнасць Т. Я. Нарбута, З. Я. Даленгі-Хадакоўскага, Я. П. Тышкевіча, К. П. Тышкевіча, К. А. Гаворскага і іншых, услед за беларускімі літаратуразнаўцамі А. І. Мальдзісам, Г. В. Кісялёвым, С. Х. Александровічам аб'ектыўна паставіўся да ацэнкі складанай грамадскай дзейнасці А. К. Кіркора. Аднак Л. В. Аляксееў не прайшоў і міма недахопаў у рабоце археолагаў XIX ст., так, ён расказаў пра шкодную дзейнасць калекцыянера-дылетанта І. К. Гесэ, настаўніка Слуцкай гімназіі.

У пяцітомным выданні «Гісторыя Беларускай ССР» выкарыстана «шмат археалагічных матэрыялаў і пісьмовых крыніц, значная частка якіх упершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак»[25]. Адзначаецца, што да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі «гістарычнае развіццё Беларусі не з'яўлялася самастойным прадметам даследавання. Гэта тлумачыцца тым, што дваранскія і буржуазныя гісторыкі не прызнавалі самога факта існавання беларускага народа і беларускай нацыі»[26].

Для гістарычных факультэтаў ВНУ супрацоўнікі кафедры археалогіі і дапаможных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна А. М. Ваганава, Э. М. Загарульскі, В. С. Касмылёў, М. Ф. Піліпенка, А. М. Плавінскі, В. Н. Рабцэвіч, А. А. Стуканаў выдалі вучэбны дапаможнік «Историческое краеведение Белоруссии» (Мн. 1980), у якім характарызуюцца розныя віды помнікаў і выкладаецца методыка іх вывучэння. На жаль, у гэтым дапаможніку толькі невялікі раздзел прысвечаны гістарыяграфіі краязнаўства.

У кнізе Л. Д. Побаля «Древности Белоруссии в музеях Польши» (Мн., 1980) ёсць нямала гістарыяграфічных звестак пра беларускіх археолагаў розных пакаленняў і матэрыялы, якія пры розных акалічнасцях трапілі ў музеі Польшчы.

Гістарыяграфіі літаратурнага, навуковага і культурнага жыцця Гродзеншчыны і Брэстчыны аддалі належнае А. М. Пяткевіч[27] і У. А. Калеснік[28], якія, між іншым, упамінаюць пра даследчыцкую дзейнасць сваіх землякоў-краязнаўцаў, прыводзяць новыя факты з іх жыцця. Падобныя матэрыялы маюцца і ў кнізе А. І. Мальдзіса пра Астравеччыну[29]. На жаль, такіх выданняў няшмат.

Да пытанняў мясцовага краязнаўства і археалогіі звярталіся і польскія даследчыкі. Археолаг Ю. Кастшэўскі[30], аналізуючы развіццё гістарычнага краязнаўства і археалогіі сваёй краіны, назваў імёны Т. Нарбута, Ю. Нямцэвіча, З. Даленгі-Хадакоўскага, братоў Яўстафія і Канстанціна Тышкевічаў і іншых, даў адпаведныя ацэнкі іх навуковай дзейнасці, вызначыў іх месца ў развіцці навукі.

Сучасны польскі археолаг А. Абрамовіч[31] выбраў з гісторыі агульнага развіцця археалагічнай навукі важнейшыя вехі, якія стымулявалі выпрацоўку навуковых поглядаў, складанне ў ёй пэўных кірункаў. На наш погляд, А. Абрамовіч найбольш поўна разгледзеў пытанне пра ўзаемаўплывы археолагаў Польшчы, Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы ў XIX ст. Ён аб'ектыўна ацаніў навуковую спадчыну не толькі польскіх археолагаў, але і тых, якія паходзяць з Беларусі, іх уклад у развіццё навукі. А. Абрамовіч высока цаніў дзейнасць З. Даленгі-Хадакоўскага, А. Кіркора, Я. Тышкевіча, М. Маліноўскага, але найбольшую даніну павагі аддаваў К. Тышкевічу[32]. З даследаванняў польскага вучонага вынікае, што ён не атаясамліваў дзейнасць некаторых даследчыкаў беларускіх старажытнасцей з польскай навукай і культурай толькі на той падставе, што яны пісалі па-польску.

Л. В. Аляксееў у сваім нарысе зрабіў агляд гістарыяграфіі археалогіі і краязнаўства паўночнай Беларусі. Пра даследчыкаў жа другіх рэгіёнаў аўтар піша менш падрабязна, часам спыняючыся на найбольш вядомых. Ён абмежаваўся толькі ўпамінаннем імёнаў У. А. Сыракомлі, П. М. Шпілеўскага, І. І. Крашэўскага, М. І. Без-Карніловіча. Аўтар, на наш погляд, быў недастаткова ўважлівы да пытання аб узаемаўплывах і сувязях археолагаў са сваімі калегамі з суседніх краін. Канцэнтруючы ўвагу на дасягненнях і стане сучаснай беларускай археалогіі, аўтары

«Очерков по археологии Белоруссии» ў дзвюх кнігах (1971, ч. I; 1973, ч. II) толькі зрэдку рабілі экскурс у ранейшае вывучэнне асобных праблем, але няма раздзела па гістарыяграфіі.

Такім чынам, пераважна ў апошнія гады рознымі аўтарамі распрацоўваліся пытанні развіцця беларускай археалагічнай навукі. Аднак іх увагу ў асноўным займалі даследаванні апошняга паўстагоддзя, да таго ж праведзеныя ў асобных рэгіёнах, і часцей за ўсё цікавілі помнікі якой-небудзь адной археалагічнай эпохі. На сённяшні дзень пакуль што няма абагульняльнай працы, якая б на падставе аналізу ўсяго назапашанага вопыту нашых папярэднікаў усебакова асвятляла працэс зараджэння і станаўлення беларускай археалогіі. Яшчэ ў большай ступені гэта датычыцца краязнаўства.

# РАННІ ЭТАП ГІСТАРЫЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА

Першыя ўпамінанні гістарычных падзей, а таксама звесткі пра старажытнабеларускія гарады, паселішчы, абарончыя збудаванні сустракаюцца ў пісьмовых крыніцах часоў Кіеўскай Русі. Найбольш ранняй была «Аповесць мінулых часоў» («Повесть временных лет»), якая напісана паміж 1111 і 1113 гг., а таксама Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі летапісы. Усе яны ўзнаўляюць і даносяць да нас гісторыю ўсходніх славян. У «Аповесці мінулых часоў» не толькі названы ўсходнеславянскія плямёны, але і ўказана месца іх рассялення. Так, адны «прыйшлі і селі па Дняпры і назваліся палянамі, а другія — драўлянамі, таму што селі ў лясах, а яшчэ другія селі паміж Прыпяццю і Дзвіною і назваліся дрыгавічамі, ішыя селі па Дзвіне і назваліся палачанамі па рацэ, якая ўпадае ў Дзвіну і носіць назву Палата» [1]. «...Ад гэтых апошніх пайшлі крывічы» [2].

Летапісец упамінае бужан, якія «сядзелі па Бугу, а затым сталі называцца валынянамі» [3]. Крывічы, паводле летапісу, «сядзелі ў вярхоўях Волгі, і ў вярхоўях Дзвіны, і ў вярхоўях Дняпра» [4]. А па Сожу пасяліліся радзімічы [5].

«Аповесць мінулых часоў», а таксама Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі летапісы даносяць звесткі аб першых полацкіх князях, у прыватнасці пра Усяслава Брачыславіча, аб бітвах на тэрыторыі краю, а таксама аб некаторых старажытных гарадах. Паводле гэтых крыніц, Полацк вядзе сваё летавылічэнне з 862 г.[6] Да X ст. адносяцца ўпамінанні Ізяслаўля, Турава. Звесткі пра Брэст, Віцебск, Друцк, Копысь, Мінск, Галоцічаск, Оршу, Пінск знаходзім сярод іншых матэрыялаў XI ст. У XII ст. упамінаюцца Барысаў, Слуцк, Гродна, Гарадзец, Гомель, Стрэжаў, Некалач, Мазыр, Мсціслаў, Брагін, Клецк, Рагачоў, Чачэрск, а ў XIII ст. — Ваўкавыск, Здзітаў, Кобрын, Капыль, Камянец, Навагрудак (Наваградак), Рэчыца, Слонім.

Раскопкі культурных напластаванняў на месцы бытавання старажытных гарадоў пацвярджаюць і дапаўняюць летапісныя звесткі [7]. У XIX ст. было адзначана даследчыкамі, наколькі важныя летапісы для вывучэння гісторыі. Адзначана таксама верагоднасць звестак некаторых літаратурных помнікаў. Так, у «Поучении» Уладзіміра Манамаха сказана, што ў барацьбе з Усяславам Полацкім кіеўскі князь «пожегь землю і пославь до Лукомля і до Логожьска, та на Дрьютьскь воюя, та Чернигову» [8]. Тут упершыню сустракаем назвы Лагойска і Лукомля.

Летапісанне Беларусі прайшло асноўныя этапы: зараджэнне (XII—XIV стст.), росквіт (XV—XVI стст.) і заняпад (XVII—XVIII стст.)[9]. Выклікае цікавасць той факт, што ў эпоху феадальнай раздробленасці летапісанне на Беларусі, як і на іншых усходнеславянскіх землях, мела мясцовы характар, паколькі пад уплывам новых гістарычных умоў паступова перамагаў, як пра гэта піша В. А. Чамярыцкі, мясцовы пункт гледжання на гісторыю [10].

Сярод немалой колькасці спісаў беларускіх летапісаў і хронік найбольш «краязнаўчымі» з'яўляюцца «Хроніка Быхаўца», «Баркулабаўскі летапіс» [11] і «Хроніка горада Магілёва» (Магілёўская хроніка Сурты і Трубніцкіх) [12]. Няма сумнення, што ў кожным летапісе краязнаўцы розных часоў маглі знаходзіць патрэбны для сябе матэрыял, асабліва калі там гаворка ідзе пра пэўную мясцовасць. Так, аўтару «Баркулабаўскага летапісу» былі знаёмы гістарычныя падзеі з 1562 па 1608 г., такія, як Лівонская вайна, Брэсцкая царкоўная унія. Хаця аўтар паведамляе пра Мінск, Вільню, пра больш аддаленыя Пскоў, Львоў, але яму блізкая перш за ўсё мясцовая гісторыя Баркулабава і Магілёва. І тут ужо аўтар выступае як краязнавец: «...на лесе глухом, на кгрунте лесном, на врочищу, прозываемом Брус, закликавши на волю и давши свободы год дванадцать людем прохожим, ...заложил замок имем свом Баркулабов року 1564» [13]. Прыводзяцца аўтарам звесткі аб тым, як ішло засяленне сярэдневяковага Магілёва, як «засели люди прихожие на Леткове, к Печерску идучи, то вотчичи... около места прихожие селяне с Княжич, с Головчина, з сел многих». Летапісец паведамляе пра закладку замка: «Лета 1526 большой замок зароблен і принято много горы Могилы, на которой теперь замок Могилев стоит; по горце Могиле назван Могилев» [14]. Далей у летапісе гаворыцца, што Баркулаб Корсак разам з Раманам Хадкевічам залажылі «замак Дзісну, замак Воронічы, замак Леплю, замак Чашнікі» [15].

Заўважана, што ў аўтара «Баркулабаўскага летапісу» пастаянна жыла цікавасць да гісторыі роднай яму мясцовасці. Ён зазначыў, у якіх умовах адбывалася заснаванне і засяленне некаторых вёсак і сёл, калі, дзе і з выпадку чаго будаваўся той ці іншы храм, паказаў, «на якім узроўні тады знаходзілася эканамічнае жыццё сялянскіх мас» [16].

Магілёўская хроніка (з 1526 па 1701 г.) была распачата купецкім старастам Т. Суртам і прадоўжана мясцовым родам Трубніцкіх, якія давялі апісанне падзей да 1856 г. У гэтай крыніцы знаходзім звесткі перш за ўсё пра Магілёў, фрагментарныя паведамленні па гісторыі Шклова, Быхава. На жаль, у названай хроніцы абыдзены ўвагай помнікі мясцовых старажытнасцей.

У форме аналаў напісаны Віцебскі летапіс Аверкі і Панцырскага (1768). Тут кароткі пераказ гісторыі Віцебска і часткова ўсёй Беларусі, без адступленняў і каментарыяў.

Затое куды больш прастору для разважанняў і ацэнак у «Хроніцы Быхаўца» [17], насычанай падзеямі сярэдневякоўя. Для нас маюць цікавасць эпізоды з мінулага Навагрудка, Крэва, Мсціслава, Полацка і іншых гарадоў, а таксама апісанні некаторых мясцін. У хроніцы гаворка ідзе не пра асобнае «сяльцо Баркулабава», а пра ўсё Вялікае княства Літоўскае ад часоў заснавання да 1506 г., што з'яўляецца каштоўнай крыніцай у вывучэнні старажытнай Беларусі. Сярод адлюстраваных у «Хроніцы Быхаўца» важных гістарычных і палітычных падзей ёсць паведамленне, што ў другой палове XII ст. горад Полацк і мужы полацкія «кіраваліся вечам, як Вялікі Ноўгарад і Пскоў» [18].

Спецыфічнай крыніцай для краязнаўцаў і археолагаў з'яўляецца «Хроніка польская, жмудская і ўсёй Русі» [19] Мацея Стрыйкоўскага [20]. Аўтара цікавілі фартэцыі, гарадзішчы, замчышчы, храмы. Знаходзячыся на вайсковай службе і падарожнічаючы па Беларусі, ён распытваў сялян пра знаходкі зброі і амуніцыі ў зямлі, адначасова знаёміўся з мясцовымі летапісамі і нават такімі ўскоснымі крыніцамі, як, напрыклад, Цвярскі летапіс або ўкраінская хроніка П. Каханоўскага. Храніст

карыстаўся бібліятэчнымі зборамі князёў Заслаўскіх, Слуцкіх, а таксама Яна Хадкевіча. М. Стрыйкоўскаму ўдалося выявіць сямейныя летапісы, хронікі, метрыкі, мемуары. Асабліва вялікую паслугу ў зборы матэрыялаў зрабіў яму Супрасльскі манастыр — багатае сховішча старажытнабеларускіх рукапісаў, дзе ў 1557 г., па вопісу, захоўвалася 209 манускрыптаў [21]. Усе прачытанае, убачанае і пачутае М. Стрыйкоўскі занатаваў у «Хроніцы». Вось чаму ў ёй знаходзім звесткі з мінулага Заслаўя, Слуцка, Полацка, Ліды, Гальшан і іншых мясцін Беларусі. Ёсць тут і рэдкія звесткі, як, напрыклад, пра заснаванне Свера (Svіра) князем Доўмантам [22].

Некаторыя звесткі з «Хронікі» М. Стрыйкоўскага вучоныя ўспрынялі як домыслы. Напрыклад, даследчыкі старажытнага Гродна не верылі ў магчымасць існавання больш ранняга замка на месцы сучаснага, хаця М. М. Вароніным у канцы 40-х — пачатку 50-х гадоў тут былі адкрыты старажытныя каменныя збудаванні, што пацвердзіла здагадку храніста [23]. На шматлікіх супастаўленнях звестак з «Хронікі» М. Стрыйкоўскага і з апошнімі дакументаванымі матэрыяламі даследаванняў А. І. Рогаву ўдалося даказаць, што ў сваёй аснове праца М. Стрыйкоўскага можа служыць крыніцай па гісторыі Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны, Расіі, Латвіі. Для нас «Хроніка» каштоўная сваімі звесткамі пра старажытныя помнікі. Так, у ёй сказана, што яшчэ ў старажытны час у Полацку існаваў Сафійскі сабор, манастыр на Бельчыцы, які быў акружаны сцяной з вежамі, а таксама жаночы манастыр на Палаце і царква св. Спаса. Даследаванні М. К. Каргера, на якога спасылаецца А. І. Рогаў, якраз і паказваюць, што акрамя трох храмаў, якія ўпамінаюцца ў летапісах XII ст., у Полацку існавалі і іншыя культавыя збудаванні [24].

У «Хроніцы» М. Стрыйкоўскага ёсць і блытаніна ў падачы летапіснага і аўтарскага матэрыялу. Храніст няправільна піша пра заснаванне г. Барысава на р. Бярэзіне. Першым назваў дату заснавання Барысава гісторык В. М. Тацішчаў [25]. Няправільна М. Стрыйкоўскі апісаў Барысавы камяні. Замест арыгінальнага тэксту ён прывёў лацінскі пераклад, да таго ж сказіў і сапраўднае імя бацькі Барыса, відавочна, каб даказаць, што ён нібыта быў сынам полацкага князя Гінгвіла, а значыць, літоўскага паходжання. На гэтыя памылкі храніста ўказалі А. П. Сапуноў [26], Е. Р. Раманаў [27], М. П. Пагодзін [28], В. П. Тарановіч [29], М. І. Ермаловіч [30]. Апошні лічыць, што «Хроніка» прасякнута ідэяй узвышэння жамойцкіх князёў, паколькі выдавалася з блаславлення актыўнага ідэолага жамойцкіх феадалаў епіскапа Гедройца.

М. Стрыйкоўскі памылкова тлумачыць тэрмін «Чорная Русь» тым, што мясцовае насельніцтва быццам «змяшалася з масквой і татарамі» [31]. Гэта думка, здаецца, больш нікім не паўтаралася.

Над помнікамі беларускіх старажытнасцей праводзіў свае назіранні сучаснік М. Стрыйкоўскага А. Гваньіні [32], які падарожнічаў па Беларусі ў трэцяй чвэрці XVI ст. Ён аўтар некалькіх сачыненняў, у тым ліку «Апісання ўсёй краіны, падпарадкаванай цару Масковіі». Для нас найбольш каштоўнай крыніцай з'яўляецца яго «Хроніка Еўрапейскай Сарматыі». Тут сустракаем ранняе апісанне Барысава і яго драўлянага замка з вежамі і ахоўнымі равамі, сціслыя звесткі пра замак у Оршы, які быў узведзены «на зліцці Дняпра і Оршыцы», пра замкі ў Лагожаску (Лагойску), Копысі і Стрэжэве [33]. Пра Мінск А. Гваньіні так сказаў: «Горад вялікі, замак з дрэва будаваны... Здольнасці людзей вялікія» [34]. У гэтым плане нельга абысці ўвагай інфармацыю А. Гваньіні аб

Ніжняй Рудні, дзе сяляне з даўняга часу «сеюць хлеб, косяць сена, сякуць лес і, галоўнае, капаюць у балотах жалезную руду, вырабляюць з яе пасля выплаўкі на жалеза розныя гаспадарчыя земляробчыя прылады» [35]. Вартасць працы сярэдневяковага храніста павышаецца яшчэ і з-за таго, што суправаджаецца рэдкімі дакументальнымі графічнымі малюнкамі.

Асветніцкая дзейнасць Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага, Я. Намыслоўскага спрыяла пашырэнню ідэй гуманізму, павагі да свайго краю. Іх спадчына каштоўная сваёй публіцыстычнасцю. Уласнае кнігадрукаванне, што ўзнікла ў XVI ст., спрыяла развіццю культуры. Разам з ажыўленнем гандлю і эканамічным станаўленнем гарадоў ішло фарміраванне беларускай народнасці.

Гімнамі роднаму краю з'яўляюцца творы Міколы Гусоўскага, асабліва яго паэма «Песня пра зубра». Як слушна зазначыў У. А. Калеснік, «М. Гусоўскі спадзяваўся ўвесці і беларускае жыццё і гісторыю ў кантэкст гуманістычнай культуры Еўропы» [36].

Крыніцамі для вывучэння краю служылі і служаць шматлікія дзённікі, апісанні падарожжаў не толькі мясцовых аўтараў, але і выхадцаў з Расіі, Польшчы, Германіі і іншых краін. Для даследчыкаў яны цікавыя тым, як іншаземцы разумелі этнаграфічную Беларусь, якой яна ім бачылася ў тыя часы. Пасол Рымскай імперыі С. Герберштэйн (1486—1556), праязджаючы па Беларусі, зрабіў вывад, што яна ляжыць «бліжэй за ўсіх да Масковіі і Літвы. Я гавару зараз не пра адну толькі вобласць, але аб краінах, якія да яе прылягаюць і разумеюцца пад агульнай назвай Літва» [37]. Другі падарожнік, С. Хейс (1593 г.), выказаў думку, што этнаграфічная мяжа Беларусі пралягае праз Радашковічы. Ён жа пісаў пра шпаркі рост гарадоў і іншых паселішчаў у XVI ст. І як прыклад прывёў закладку ў 1584 г. паселішча Нача. Напэўна, дзеля спрыяння такога росту кароль на 20 гадоў вызваліў мясцовых жыхароў ад усіх павіннасцей і падаткаў [38]. Пра Барысаў С. Хейс пісаў як аб даволі ладным па памерах горадзе, паблізу якога знаходзіцца вялікі замак з дрэва. Рускі дзяк Трыфан Карабейнікаў (1593 г.) засведчыў: «У Літоўскай зямлі горад Арш (Орша. — *Г. К.*) каменны, стаіць на Няпры (Дняпры. — *Г. К.*) рацэ, на беразе... а ў горадзе на пасадзе сем цэркваў» [39]. Цікавыя звесткі аб Беларусі можна прачытаць ва ўспамінах-мемуарах А. Кантарыні, Д. Барбары, Д. Герасімава, Р. Барберыні, Б. Танера і іншых падарожнікаў. Невядомы аўтар «Рэляцыі» (1553 г.) [40] даволі спрошчана ўяўляў Беларусь, калі пісаў, што яна знаходзіцца на захад ад Рускай дзяржавы. Падарожнічаў па Беларусі і аўстрыйскі пасол Даніэль фон Бухаў (1576 г.), які зацікавіўся насыпанымі тут «штучнымі ўзвышэннямі, якія мясцовыя жыхары называюць па-свойму «курганы» [41].

Беларускімі старадаўнімі звычаямі зацікавіўся пазнанскі шляхціц Ян Ласіцкі [42], які праводзіў свае назіранні ў раёне Заслаўя, Радашковіч, Дуброў, вынікам чаго стала кніга «Пра рэлігію, ахвярапрынашэнні, вясельныя, пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў, татар...» [43]. Гэтую працу некаторыя даследчыкі залічаюць да царкоўна-палемічнай літаратуры, хаця яна перш за ўсё этнаграфічна-краязнаўчая. У сваіх адносінах да беларускага народа і яго спадчыны Ян Ласіцкі стаяў на аб'ектыўных пазіцыях, паважаў яго старадаўнія звычаі, культуру, творчасць. Не толькі для этнографаў, краязнаўцаў, але і для археолагаў некаторую цікавасць мае апісанне мясцовых абрадаў, якія, на думку Яна Ласіцкага, ідуць з паганскіх часоў. Напрыклад, ён лічыў, што ад

радзімічаў пайшоў абрад пахавання, у якім у той час было шмат старадаўніх элементаў [44]. Ад радзімічаў таксама запазычаны абрад выкрадання — «умыкаху у воды девица». Ян Ласіцкі апісаў тры старажытныя збудаванні Полацка і вельмі шкадаваў, што ўсё іншае ў 1583 г. зруйнаваў цар Іван IV. Пішучы пра ўсходніх славян, Ян Ласіцкі паказаў шырокія веды па этнаграфіі, карыстаючыся распаўсюджанымі тады тэрмінамі: маскавіты (рускія), русіны, рутэнцы (беларусы і ўкраінцы). Амаль у тым жа плане напісаны і іншыя работы, асабліва «Пра багоў жмудзінаў і другіх сарматаў» (Базель, 1615).

Краязнаўчая дзейнасць Саламона Рысінскага [45] заключалася ў зборы тапанімічных матэрыялаў аб паходжанні мясцовых геаграфічных назваў, у якіх ён бачыў ключ для адгадкі таямніц старажытнай гісторыі. Праўда, яго найбольш любімым і грунтоўным заняткам з'яўляўся збор прыказак, якія ім былі апрацаваны і выдадзены ў друкарні Пятра Бласта Кміты ў Любчы [46]. Першым папулярызатарам кніг С. Рысінскага на Беларусі быў вядомы беларускі паэт XIX ст. В. Каратынскі [47]. Апошні сцвярджаў, што «большая частка змешчаных у яго працах прыказак і прымавак да гэтага часу жыве ў вуснах наднёманскага люду, у беларускай мове» [48]. Абапіраючыся на пісьмы 1620 г. Б. Красневіча да К. Радзівіла з Вільні ў Нясвіж, В. Каратынскі робіць вывад, што Саламон Рысінскі добра ведаў гісторыю краю [49]. Зрэшты, кніга «Сармацкіх прымавак» С. Рысінскага засведчыла, што аўтар яе ведаў культуру краю, так што меркаванні В. Каратынскага небеспадстаўныя.

На працягу цэлых стагоддзяў Беларусь знаходзілася ў складзе Рэчы Паспалітай з яе агрэсіўнай каталіцкай рэлігіяй. Беларусь раней іншых славянскіх народаў прыняла на сябе ўдар контррэфармацыі (XVI—XVII стст.), якая наступала ў саюзе з жорсткай палітыкай кіруючых колаў. У складаных умовах апынуліся не толькі краязнаўства, але і ўся культура тагачаснай Беларусі. Актывізаваліся розныя клерыкалы. Адным з выказнікаў ідэй ордэна езуітаў на Беларусі быў польскі гісторык Віюк Войцех Каяловіч (1609—1677), які доўга тут быў і шмат падарожнічаў па беларускіх землях. У Слоніме ён завяршыў сваю вялікую працу па складанні гербоўніка беларускай і літоўскай шляхты. Частка рукапісу яго загінула ў Вільні ў час ваенных падзей 1655 г.[50] Аднак частка гэтай працы была апублікавана [51]. Вывучаў ён таксама геральдыку, нумізматыку. З кансерватыўна-клерыкальных пазіцый напісаў вялікую работу па гісторыі Літвы [52].

У першай частцы працы Каяловіч зрабіў апісанне стану дахрысціянскай Літвы. Фактычна ўсё звялося да паказу перавагі хрысціянскай рэлігіі над язычніцтвам. У другой частцы аўтар захапіўся апісаннем гістарычных падзей на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Польшчы. Асноўнай крыніцай для яго «Гісторыі Літвы» паслужыла вядомая «Хроніка» М. Стрыйкоўскага.

Да краязнаўчых можна аднесці працу Міхаілона Літвіна пра мінулае Літвы [53], у якой аўтар прывёў звесткі па старажытнай гісторыі, а таксама па этнаграфіі Літвы і Беларусі. Ён быў уражаны на беларускіх землях разнастайнасцю абрадаў, у некаторых з якіх вытокі трэба шукаць у далёкім мінулым.

У другой палове XVIII ст. вывучаў Падняпроўе Андрэй Меер [54]. Вынікам яго падарожжаў па ўсходняй Магілёўшчыне з'явілася «Апісанне Крычаўскага графства 1786 года» [55]. Сюды ж прыкладзена карта Крычаўскага графства. Ад прыведзеных аўтарам каштоўных матэрыялаў і фактаў веяла навізной не толькі для XVIII ст., яны з'яўляюцца

каштоўнымі і для сучасных даследчыкаў, перш за ўсё краязнаўцаў-этнографаў. Аўтар прывёў падрабязныя гістарычныя звесткі пра Мсціслаў[56], апісаў вядомыя і ў XVIII ст. паганскія абрады. Найбольш папулярным у народзе было купалле. Акрамя Крычава, які яму быў добра знаёмы, краязнавец апісаў таксама іншыя мясціны графства, якое ён адносіў да Полацкай зямлі.

У 1700—1701 гг. у Вене на лацінскай мове Іаган Георг Корб (каля 1670 — каля 1742) выдаў «Дзённік падарожжа ў Маскоўскую дзяржаву». Шлях яго пралягаў праз Ашмяны, Мінск, Барысаў, Шклоў, Магілёў, Горкі. Падарожнік занатаваў усё бачанае, пачутае, а таксама і прачытанае пра гандлёва-эканамічны стан беларускіх гарадоў[57].

Недастатковасць краязнаўчай інфармацыі пра Беларусь XVIII ст. пэўным чынам кампенсавала своеасаблівая энцыклапедыя Г. Карпінскага. У яго «Лексіконе» знаходзім кароткія звесткі пра Полацк, Мінск, Пінск, Гродна, Слуцк і іншыя гарады Беларусі. У трактоўку тэрміна «Русь» Г. Карпінскі ўкладае сваё разуменне: «Русь заключае ў сабе акрамя Русі Маскоўскай Літоўскую Русь, якая дзеліцца на Белую і Чорную Русь. Белая Русь мае ваяводствы Мсціслаўскае, Полацкае, Віцебскае і Смаленскае, Чорная Русь — Навагрудскае, Мінскае...»[58] Некалькі інакш гаворыцца ў падручніку па гісторыі і геаграфіі Польшчы, у якім чытаем, што Белую Русь складаюць Навагрудскае, Віцебскае, Мсціслаўскае, Мінскае ваяводствы[59].

Сузіральным з'яўляецца «Дыяруш падарожжа на гродзенскі сейм» (1752)[60], у якім аўтар перадае свае ўражанні аб паездцы ў Гродна. Апісанне самога горада чытаецца з цікавасцю, паколькі тут ёсць інфармацыя пра будову Старога і Новага замкаў, пра гродзенскія вуліцы, плошчы, палацы.

У другой палове XVIII ст. практычна сталі займацца даследаваннем старажытнасцей Полацкай зямлі. Археалагічныя раскопкі курганоў у маёнтку Мосар на Віцебшчыне зацікавілі караля Станіслава Аўгуста[61]. Гэта была першая спроба весці археалагічныя раскопкі, ранняя спроба распазнаць помнікі старажытнасці ў палявых умовах шляхам раскопак.

Раней за многіх гісторыкаў пазнаёміў грамадскасць Расіі са старажытнасцямі Беларусі вядомы рускі вучоны В. М. Тацішчаў[62]. Аўтар «Гісторыі Расійскай» першы назваў даты заснавання Навагрудка (1044 г.) і Барысава (1102 г.)[63]. Яго даціроўка заснавання Барысава (1102 г.) прынята гістарычнай навукай, хоць канчаткова не адхілена і другая дата — 1127 г. Звесткі В. М. Тацішчава пра заснаванне Навагрудка ў 1044 г. слушныя, бо «того ж году ходил Ярослав на Литву и с великою победою возвратился, а на весну заложил Новгород»[64], аднак некаторымі гісторыкамі гэта дата ўзята пад сумненне[65]. Ён жа высветліў, дзе адбылася бітва кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча са сваім братам Яраполкам на р. Друць, а таксама паведаміў гісторыю гвалтоўнага ўзяцця ў жонкі Рагнеды[66]. З тацішчаўскага даследавання даведваемся аб раздзеле Уладзімірам сваіх уладанняў: Ізяславу — Полацк, Святаславу — Тураў, Вячаславу — Чарнігаў[67]. Трэба думаць, што менавіта В. М. Тацішчаў першым увёў у навуковы ўжытак Полацкі летапіс, які пазней бясследна страціўся.

В. М. Тацішчаў з'яўляўся наватарам у методыцы збору краязнаўчых матэрыялаў. Ён карыстаўся анкетаваннем, разаслаўшы ў 1734 і 1737 гг. праграмы-анкеты для адказу на пытанні па геаграфіі, этнаграфіі і гісторыі. Апытанне датычылася і беларускіх зямель. Вучонага

займала пытанне паходжання народаў і этнічныя сувязі паміж імі, паколькі «праз так многа тысяч гадоў народы, пераходзячы, мяшаліся». Тацішчаўскі метад збору звестак надзвычай плённы і перспектыўны.

У пачатку XVIII ст. даследаваў гродзенскія старажытнасці Ігнат Кульчынскі [68]. Вынікам збору пісьмовых крыніц пра Каложскі храм з'явіўся «Інвентар Гродзенскага каложскага манастыра..., складзены ў 1738 г.» [69]. І. Кульчынскі з'ўляецца першым гісторыкам Каложы. Яго некаторыя погляды пацвердзіў сваімі даследаваннямі М. М. Варонін [70], якія шмат у чым правільныя, а сабраныя І. Кульчынскім крыніцы і на сённяшні дзень каштоўныя фактычным матэрыялам, да якога звяртаецца не адно пакаленне даследчыкаў-старажытнікаў.

Малавядомая кніга С. С. Богуша-Сестранцэвіча [71] «Аб Заходняй Расіі» (Магілёў, 1793) таксама мае адносіны да нашай тэмы, паколькі аўтара цікавіла гісторыя краю. Богуш-Сестранцэвіч дайшоў да сану мітрапаліта, быў прэзідэнтам духоўнай акадэміі, членам Расійскай Акадэміі навук, ганаровым членам некалькіх навуковых таварыстваў [72]. Акрамя таго, ён аўтар «Літоўскай граматыкі». Як мяркуе А. І. Мальдзіс, гэта была хутчэй за ўсё граматыка беларускай мовы [73].

Краязнаўцы, археолагі, гісторыкі чэрпалі звесткі з сямітомнага выдання «Гісторыя польскага народа» [74] А. С. Нарушэвіча [75], у якім знайшлі адлюстраванне шматлікія падзеі, што адбываліся на беларускай зямлі. У гэтай працы праводзіцца гуманістычная ідэя адзінства і ўзаемаабагачэння духоўных культур розных народаў. Аднак, захапіўшыся тэарэтычнымі пытаннямі адзінства, ён не бачыў розніцы паміж Беларуссю і Польшчай, лічыў беларускія землі спрадвечна польскімі. Упершыню ў польскай і беларускай гістарыяграфіі А. Нарушэвіч распрацаваў метад крытыкі пісьмовых крыніц шляхам зверкі іх з больш раннімі рукапісамі, спісамі. Ён сабраў каля 230 тамоў археаграфічных матэрыялаў. У сваёй навуковай дзейнасці А. Нарушэвіч найчасцей карыстаўся польскімі і рускімі летапісамі, перш-наперш Кіеўскім, які не адрозніваў ад «Аповесці мінулых часоў» [76]. Яго запісы мясцовых легенд, паданняў з'ўляюцца аднымі з самых ранніх. Гісторык гэты матэрыял цаніў і надаваў яму значэнне важнай крыніцы ў вывучэнні краю. У зборы пісьмовых крыніц А. Нарушэвічу дапамагаў Матэвуш Тукальскі-Нелюбовіч. Апошні запісваў беларускі фальклор [77].

На працягу 20 гадоў вывучаў старажытную гісторыю славянскіх народаў Ян Патоцкі, які шмат зрабіў у справе збору і выкарыстання летапісаў, хронік, дыярушаў. Ён практыкаваў выезд на месца для праверкі ўказаных у гістарычных крыніцах падзей і для ўстанаўлення слядоў даўняй дзейнасці чалавека. У пошуках гэтых слядоў ён шмат вандраваў ад Одры да Волгі, ад Балтыкі да Чорнага і Каспійскага мораў, у тым ліку і па Беларусі. Па выніках сваіх тэарэтычных даследаванняў і падарожжаў па славянскіх землях Я. Патоцкі апублікаваў некалькі прац, у якіх даказаў аўтахтоннасць славян [78]. Як і А. Нарушэвіч, Я. Патоцкі стаяў на паланізатарскіх пазіцыях.

* * *

Пасля далучэння Беларусі да Расіі ў канцы XVIII ст. яе тэрыторыя пачала вывучацца і прадстаўнікамі рускай навукі. Ужо ў 1773 г. у экспедыцыю адправіўся акадэмік географ І. І. Ляпёхін (1740—1802). У яго навуковым паведамленні гаворыцца пра дзвінскія камяні з надпісамі. Шмат якія назіранні І. І. Ляпёхіна маюць пазнавальную цікавасць. Яго матэрыялы былі апублікаваны ў 1935 г.

2. Зак. 784



Замак у Гродне (паводле гравюры 1568—1672 гг.)

На беларускай зямлі вывучаў мінералы акадэмік В. М. Севяргін, які адначасова знаёміўся з мясцовымі славутасцямі. Ён даставіў у Маскву з маёнтка Сямяцічы (Гродзенская губ.) музейную калекцыю, якая засталася пасля смерці яе ўладальніцы Г. Ябланоўскай. У гэтай калекцыі былі медалі, старажытныя манеты, бажкі, а таксама розныя «штучныя творы, бурштынавыя, касцяныя як цывілізаваных, так і некаторых дзікіх народаў» [79]. Убачаным беларускім гарадам акадэмік даў толькі гандлёва-эканамічную характарыстыку. В. М. Севяргін памылкова лічыў першае ўпамінанне Оршы ў 1116 г.[80], а не 1067 г., як пазней прынята гістарычнай навукай [81]. Больш таго, аўтар спасылаецца на легенды пра тое, што Орша пабудавана скіфамі. Тая ж памылка з першым упамінаннем г. Мсціслава (замест 1156 г. — 1180 г.). Сціплыя звесткі пакінуў рускі вучоны і пра Віцебск.

Вядомы паэт Г. Р. Дзяржавін, які зрабіў дзве паездкі па Беларусі на мяжы XVIII і XIX стст., настойліва раіў дзяржаўным уладам Расіі ўлічваць мясцовыя асаблівасці краю, якія склаліся на працягу стагоддзяў [82].

У XVIII ст. у Магілёве і Вільні выходзілі календары, якія таксама змяшчалі некаторую інфармацыю пра розныя гарады Беларусі.

Каштоўнымі крыніцамі для краязнаўцаў, археолагаў і гісторыкаў архітэктуры з'яўляліся і з'яўляюцца атрыбутыўныя гравюрныя карты XVI—XVIII стст., на якіх адлюстраваны схематычныя планы старажытных гарадоў, вуліц, збудаванняў пераважна абарончага і культавага прызначэння. Гравюры памагаюць даследчыкам арыентавацца ў тапаграфіі аб'ектаў вывучэння, рабіць іх удакладненні, заўважаць змены, якія адбыліся за стагоддзі.

Найбольш ранняя з графічных ілюстрацый гарадоў Беларусі — гравюра Гродна (1567 г.) Ганса Адэльгаўзера, якая была выканана з натуры. У наступным годзе М. Цюндт з Нюрнберга зрабіў копію гэтай

гравюры, дадаўшы да яе «Праўдзівае апісанне Гродна, што знаходзіцца ў Літве». Выйшла гэтае апісанне ў кёльнскім выданні Браўна [83]. На гравюры ёсць і хібы: рака цячэ ў адваротным напрамку.

Пашыраюць нашы ўяўленні пра Гродна XVI—XVIII стст. знойдзеныя ў Львове раней невядомыя планы горада [84]. Тут выяўлены «партрэт» Гродна вядомага нясвіжскага гравёра-картографа XVI—XVII стст. Т. Макоўскага. Гэтыя гравюры і аксанаметрычныя малюнкі горада даюць уяўленне аб планіроўцы вуліц, насычанасці забудовы, сувязі з рэльефам мясцовасці. Горад жа не быў горадам-крэпасцю, што пазней даказана доследамі М. М. Вароніна [85].

Выдадзеная ў Амстэрдаме (1613 г.) Т. Макоўскім [86] карта Вялікага княства Літоўскага стала крыніцай для вывучэння 312 населеных пунктаў Беларусі [87], якія абазначаны на карце рознымі ўмоўнымі значкамі ў залежнасці ад ваеннага, адміністрацыйнага і нават эканамічнага значэння ўказанага пункта [88]. Т. Макоўскім выкананы таксама планы-аксанаметрыі гарадоў Нясвіжа, Клецка, на якіх выразна відны абрысы будынкаў-дамінантаў і саміх вуліц, а таксама значных старажытных умацаванняў.

Выключную каштоўнасць мае спадчына Станіслава Пахалавіцкага [89], асабліва яго восем карт і планаў старажытных фартэцый. Картограф адлюстраваў план «Аблогі і заваявання Полацка Ст. Баторыем», а таксама планы Тураўлі, Казьяна, Лукомля, Краснага, Сушы, Астроўны, Сянна, Іказні, Пагоста, Лосвіды і інш. Асабліва каларытна аўтар карт перадаў канфігурацыі атрыбутыўных збудаванняў гарадоў Полаччыны, малюнкі якіх ён зрабіў з натуры. Многіх помнікаў ужо не існуе, а гэтая акалічнасць робіць гравюры С. Пахалавіцкага незаменнымі крыніцамі для даследчыкаў, а яго «Апісанне Полацкага княства» — неабходным дадаткам да іх.

У першай палове XIX ст. С. Пахалавіцкім зацікавіўся Я. Міткевіч, які заўважыў на яго гравюрах рэдкую для сярэдневякоўя дэталізацыю, такую неабходную для архітэктараў, археолагаў, краязнаўцаў. Так, на плане Полацка 1579 г. ён убачыў не толькі адлюстраванне дамінантных будынкаў горада, але і прасачыў перспектыву размяшчэння абарончых сцен. На тым малюнку Я. Міткевіч убачыў некалькі гарадскіх варот з магутнымі вежамі. Даследчык правільна сарыентаваўся ў кампазіцыйна-прасторавых сувязях Полацка.

Дакументам-помнікам на рубяжы XVII—XVIII стст. з'яўляецца «Чарцёж» Максіма Цызырава, які быў выкананы па загаду Пятра I у 1701 г. Стольніку М. Цызыраву прадпісвалася перайсці граніцу Рэчы Паспалітай і там «зрабіць тайным звычаем ад Віцебска ўверх да самых вярхоўяў Дзвіны ракі чарцёж з сапраўднаю мераю па маштабу», асабліва там, дзе рака перасякае «рубеж Маскоўскі» [90]. На сваю аксанаметрычную карту М. Цызыраў нанёс усе аб'екты, якія могуць цікавіць іншую краіну, перш за ўсё абарончыя ўмацаванні. Тым самым аўтар «Чарцяжа» пакінуў для гісторыі матэрыялы пра тагачасны стан помнікаў архітэктуры і археалогіі. На гравюрнай карце М. Цызырава найбольш дэталізаваны ў тапаграфічных адносінах землі беларускага Падзвіння — гарады Полацк, Віцебск, Стрэжаў, Веліж. На схемах абазначаны месцы ўваходу і выхаду з фартэцый-умацаванняў. На планах унутранай кампазіцыі гарадоў М. Цызырава адзначаны сімволікай акцэнтныя збудаванні. Асабліва падрабязна складзена схема Полацка, што і адлюстравалася ў прыкладзеным да «Чарцяжа» апісанні [91]. Нягледзячы на розніцу ў часе складання карт, план Полацка не-



План Полацка (паводле малюнка С. Пахалавіцкага 1579 г.)




Умацаванні Браслава, Ікязні, Геранон (паводле карты Т. Макоўскага, 1613 г.)

чым напамінае аналагічны — С. Пахалавіцкага. «Чарцёж» М. Цызырава захоўваўся ў архіве міністэрства замежных спраў, дзе яго і выявіў А. П. Сапуноў [92].

Паступова картаграфаваннем былі ахоплены і іншыя гарады Беларусі: Мінск (XVIII ст.), Рэчыца (XVII ст.) Ляхавічы (1669 г.), Крычаў (1778 г.), Слуцк (1780г.) і інш. Усе тыя гравюры-планы маюць значэнне пры вывучэнні старой забудовы, рэканструкцыі і рэстаўрацыі [93]. На многіх старых малюнках і гравюрах можна без цяжкасці прыкмеціць вуліцы, плошчы, крапасныя сцены, вежы, а таксама двух- і трохпавярховыя дамы і нават масты праз рэкі. Тыя малюнкі часта схематычныя, але яны істотна пашыраюць нашы ўяўленні пра домабудаўніцтва, планіроўку і ўпарадкаванне населеных пунктаў. Планы цікавяць даследчыкаў пры вывучэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця не толькі цэнтраў, але і ўскраін.

На Беларусі ў часы язычніцтва няпісаным абавязкам членаў грамадства была ахова скульптур сваіх бажкоў ад магчымых разбурэнняў. Пазней жа стала святой справай узводзіць і ахоўваць храмы для богаслужэння. Як сімвал дзяржаўнай магутнасці і незалежнасці ў Полацку ахоўваўся Сафійскі сабор, асабліва ў часы ваенных падзей. У эпічнай паэме «Дзесяцігадовая аповесць ваенных спраў святога пана Крыштафа Радзівіла» (1585 г.) А. Рымша, праслаўляючы мужнасць воінаў, быў занепакоены, што ад іх рук гінуць помнікі культуры [94]. Народ паклапаціўся і пра захаванне помнікаў вуснай творчасці, данёсшы да нашых дзён старажытныя творы невядомых аўтараў.

Свядомым калекцыяніраваннем прадметаў матэрыяльнай культуры на Беларусі яшчэ ў сярэднявеччы займаліся вядомыя феадалы Радзівілы. Пачатак паклаў Мікалай Радзівіл (1515—1565), які ў маладосці



Нясвіжскі замак у пачатку XIX ст. Акварэль І. Пешкі

пабываў у розных краінах Еўропы і сам змог назіраць, як розныя вяльможы збіралі антыкварыят, а як толькі вярнуўся ў Нясвіж, заснаваў нумізматычны кабінет, або скарбец [95]. Яго пераемнік Мікалай (Сіротка) Радзівіл (1549—1616) істотна папоўніў калекцыю, далучыўшы сюды і творы мастацтва, пісьмовыя крыніцы. Фактычна Нясвіж стаў важным дзяржаўным сховішчам дакументаў Вялікага княства Літоўскага.

Да XIX ст. доступ да гэтага «кабінета» быў надзвычай абмежаваны. Толькі пасля ўваходу Беларусі ў склад Расіі прыадчынілася таямніца нясвіжскіх рэліквій [96]. Нумізматычная і геральдычная калекцыі захоўваліся ў дзвюх вялізных шкатулках. Кожны знак з кароткай анатацыяй аб яго паходжанні меў сваю ячэйку. Агульная колькасць знакаў складала 12 952 экземпляры [97]. Большую частку унікальнай на той час калекцыі складалі манеты і медалі Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Тут былі дукаты, талеры, грэчаскія і рымскія манеты. Апісанне рабілася па іх дзяржаўнай прыналежнасці [98].

У XVII—XVIII стст. поруч з фарміраваннем нумізматычнай калекцыі ў Нясвіжы пачалі збіраць і сістэматызаваць старадаўнюю зброю і даспехі. Кожная гармата збраёўні мела сваю назву: «Хімера», «Цэрбер», «Гідра», «Папугай» і інш.[99] Ёсць звесткі і пра калекцыю археалагічную [100], відаць, выпадковых знаходак каменных прылад працы. Былі тут і прадметы прыкладнога мастацтва [101].

Амаль кожная буйная рэзідэнцыя Радзівілаў мела ўласны архіў і гістарыёграфаў. Акрамя Нясвіжа такія калекцыі, толькі меншыя, былі ў Міры, Алыцы, Клецку, Давыд-Гарадку.

Адным з радзівілаўскіх гістарыёграфаў быў у XVII—XVIII стст. Казімір Шышка, аўтар кампіляцыйнага манускрыпта «Кароткія запіскі па польскай гісторыі, якія спісаны з розных польскіх гісторыкаў уласнаручна панам Казімірам Шышкам». Перавага аддаецца Польшчы ва ўсіх ваенных падзеях, у якіх аўтар бачыць заслугі князёў, каралёў [102].

Услед за Радзівіламі і амаль адначасова з імі вялі зборы рэдкіх прадметаў музейнага значэння роды Сапегаў, Храптовічаў, Тызенгау-

заў, якія таксама стваралі свае калекцыі, найперш карцінныя галерэі.

І. М. Храптовіч, уладальнік бібліятэкі і музейных збораў, склаў статут, паводле якога кнігамі дазвалялася карыстацца як мясцовым, так і замежным вучоным [103]. У бібліятэцы захоўваліся манускрыпты, дакументы гістарычнага значэння, у прыватнасці перапіска Б. Хмяльніцкага з польскімі ўладамі, дзённік польскага пасольства ў Расію 1686 г., матэрыялы Кракаўскай і Таргавіцкай канфедэрацый, дзённік Марыны Мнішак, вялікая калекцыя геаграфічных карт, асабліва тых, якія датычыліся Літвы, Беларусі, Польшчы. Пры бібліятэцы мелася карцінная галерэя. Па ініцыятыве І. Храптовіча [104] была сабрана адна з самых першых на Беларусі археалагічных калекцый [105]. Яго бібліятэкай у Шчорсах карысталіся браты Снядэцкія, І. Лялевель, І. Даніловіч, Ян Чачот, Адам Міцкевіч і інш.

Пры Полацкай калегіі (з 1812 г. акадэмія з правам універсітэта) у 1787 г. быў пабудаваны дом пад музей. Ужо тады ініцыятары сабралі калекцыі манет, антычных экспанатаў, прадметы мясцовых старажытнасцей, а таксама карцінную галерэю [106]. Аднак дзейнасць музея атрымала сваё развіццё значна пазней.

У 1798 г. віленская газета «Kurjer Litewski» змясціла аб'яву, што «ў губернскім горадзе Мінску прадаецца кабінет мінеральных экспанатаў з паўночных і іншых краін: ён складаецца з камянёў, каштоўных металаў, акамянеласцей і з розных дарагіх выкапнёных раслін, што належаць да гэтай калекцыі, а таксама з ракавін featured рознага віду і адпаведных бурштынавых утварэнняў. Усяго гэты збор складаецца больш як з 400 прадметаў». Як мяркуюць В. П. Грыцкевіч і А. І. Мальдзіс, гэта магла быць калекцыя Гродзенскай медыцынскай акадэміі, бо ў газеце раілі звяртацца да нейкага Б. Тызенгауза (магчыма, сваяка Антонія Тызенгауза) [107].

Падарожжы і назіранні даследчыкаў у XVI—XVIII стст. давалі агульнае ўяўленне аб насельніцтве, культуры, гісторыі і прыродзе асобных рэгіёнаў Беларусі. Як справядліва заўважыў А. А. Фармозаў, археалогія ў работах XVIII ст. цесна збліжаецца з геаграфіяй [108]. Разгледжаныя намі матэрыялы толькі падмацоўваюць гэтае сцвярджэнне.

Мы не маем звестак пра археалагічныя раскопкі на Беларусі раней XVIII ст. Тады ж, зрэшты, і не існавала такога паняцця. У XVI—XVII стст. асобныя аматары вывучэння старажытнасцей рабілі толькі візуальныя назіранні і давалі ім сваё тлумачэнне.

У канцы XVIII ст. А. Тызенгауз (1733—1785) заснаваў у Гродне шэраг прафесійных школ — мастацка-тэатральную, чарчэння і малявання, медыцынскую, акушэрскую, ветэрынарную, фінансавых кантралёраў, каморнікаў і яшчэ некалькі. Ён прыклаў шмат намаганняў, каб адчыніць акадэмію прыродазнаўчых навук, запрашаў для работы ў школах добрых педагогаў. Пры А. Тызенгаузе быў закладзены ў Гродне «кабінет натуральнай гісторыі», а фактычна музей «з багатай у дзесяць тысяч экспанатаў, калекцыяй акамянеласцей і мінералаў» [109]. Яго пляменнік К. Тызенгауз у першай палове XIX ст. у Паставах заснаваў вялікі арніталагічны музей, а пазней — мастацкую галерэю, у якой акрамя твораў мясцовых аўтараў экспанаваліся палотны італьянскага, галандскага, французскага, нямецкага жывапісу.

# ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА І АРХЕАЛОГІЯ Ў ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XIX ст.

На рубяжы XVIII і XIX стст. Беларусь увайшла ў склад Расійскай імперыі, што становіча адбілася на некаторых баках эканамічнага і культурнага развіцця [1]. Беларусь уцягвалася ў гандлёва-эканамічныя сувязі. Гэта ўплывала на рост гарадоў. У палітычных адносінах яна трапіла пад кантроль паліцэйскага дэспатызму і ваеншчыны Аляксандра I і Аракчэева. Царызм пайшоў на здзелку з мясцовымі памешчыкамі, буржуазіяй і царквой, надзяліўшы іх тымі ж правамі, як і ва ўсёй Расіі, а тутэйшыя вярхі ў сваю чаргу імкнуліся дагадзіць самадзяржаўю і заручыцца падтрымкай, каб яшчэ больш эксплуатаваць сялян. Канец XVIII — першая палова XIX ст. і наступныя гады да рэформы 1861 г. з'яўляліся перыядам разлажэння і распаду феадальна-прыгонніцкіх адносін. Працэс гэты паскараўся не толькі ўзнікненнем капіталістычных адносін, але і разгортваннем барацьбы сялянства за знішчэнне паншчыны.

Пытанні ідэйнай барацьбы ў Расіі былі зразумелымі для такіх людзей на Беларусі, як Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш Зан і інш. — членаў тайнага студэнцкага таварыства філаматаў і філарэтаў. Яны выказваліся за адмену прыгоннага права, за паляпшэнне асветы і яе даступнасць для ўсіх; асуджалі феадальна-абсалютысцкія парадкі. Прагрэсіўная моладзь знаходзілася пад уплывам рамантызму, што адпавядала нарастанню барацьбы з феадалізмам, спрыяла развіццю цікавасці да грамадскіх навук, у тым ліку і да гісторыі [2].

Мясцовая інтэлігенцыя цягнулася да найбольш блізкага ёй Віленскага універсітэта. Вельмі плённыя для навукі былі гады рэктарства ў Віленскім універсітэце (1807—1815) прафесара Я. Снядэцкага (1756—1830), таленавітага педагога, астранома, матэматыка.

Сваю праграму даследаванняў славянскіх старажытнасцей язычніцкіх часоў прапанаваў гісторык і антраполаг В. Суравецкі (1769—1829) у працы «Нарыс пра спосабы даследаванняў гісторыі і пашырэння ведаў пра старажытных славян» [3]. Ён настойліва раіў усім даследчыкам не мінаць ніводнага кутка славянскай зямлі, збіраць пра іх звесткі, звяртаць увагу на «насыпаныя чалавечай рукой пагоркі, якія сустракаем у нашым краі».

Сярод польскіх даследчыкаў беларускіх старажытнасцей быў і Т. Ф. Чацкі (1765—1813), які разглядаў беларускую і ўкраінскую культуры як састаўныя часткі польскай [4]. У гэтым плане вельмі блізкім да Т. Ф. Чацкага быў Г. Бандке (1768—1835), аўтар «Гісторыі польскага народа» [5], які таксама землі Беларусі і Украіны называў польскімі.

Асноўным прадметам даследавання Ігната Загорскага (1788—1845) была нумізматыка. У яго буйной працы «Манеты даўняй Польшчы» [6] адпаведнае месца занялі грашовыя знакі, якія былі ў абарачэнні і на тэрыторыі Беларусі. Аўтар грунтаваўся на вопыце сваіх папярэднікаў

Т. Чацкага, Г. Бандке. І. Загорскі прызнаўся, што яго пабудзіў да вывучэння нумізматыкі даўні звычай калекцыяніравання манет і медалёў. Даследчык правёў вялікую работу па сістэматызацыі манет, указаў на ўсе вядомыя яму скарбы манет. Пры апісанні манет даследчык прытрымліваўся прынцыпу храналагічнай паслядоўнасці. Сваёй працай І. Загорскі зрабіў крок уперад у справе сістэматызацыі і вывучэння манет.

У 1817 г. у газеце «Dziennik Wileński» (t. IV) вучоныя Віленскага універсітэта апублікавалі інструкцыю аб зборы гістарычных звестак у розных населеных пунктах. Прапаноўвалася запісваць і «гмінныя паданні». На старонках газеты сталі з'яўляцца этнаграфічныя і фальклорныя матэрыялы. Падкрэслівалася навуковая важнасць даследавання гісторыі краю. Як водгук на гэтыя звароты з'явіліся публікацыі М. Чарноўскай [7] пра мясцовыя абрады і рэшткі язычніцтва, элементы якога захоўваліся яшчэ ў XIX ст. Яна першая звярнулася да матэрыялаў дахрысціянскай міфалогіі.

У пачатку XIX ст. краязнаўчай і археалагічнай дзейнасцю займаўся К. Халдзіеўскі, жыццё якога звязана з Полацкам, з Падзвіннем. Ён вывучаў старажытныя ўмацаванні ў Косыраве каля Дрысы, у самім Полацку. Карыстаўся пры гэтым пераважна пісьмовымі крыніцамі. Яго праца носіць апісальны характар [8].

Помнікамі старажытнасці Падзвіння цікавіўся А. А. Плятар [9]. Пра яго археалагічную дзейнасць можна меркаваць толькі па нешматлікіх публікацыях у часопісе «Рубон». У працы «Аб даўніх трунах» [10] краязнавец заўважаў, што ў доўгіх курганах сустракаецца ўрнавае і бязурнавае пахаванне і іх рэшткі знаходзяцца ў верхняй частцы насыпу. А. А. Плятар, як і яго калега па вывучэнню латгала-беларускага пагранічча М. І. Борх, круглыя курганы лічыў прыналежнасцю балцкіх плямёнаў, а доўгія — славянскіх [11]. А. А. Плятар, як і З. Я. Даленга-Хадакоўскі, лічыў, што славяне прыйшлі з Індастану праз Каўказ, не адхіляў версіі аб магчымай агрэсіі збоку готаў, якія «падштурхнулі славян» на ўсход [12]. Паводле матэрыялаў археалагічных знаходак сцвярджаў, што край знаходзіўся пад уплывам грэчаскай і рымскай цывілізацыі. Даследчык звярнуў увагу на стракатасць насельніцтва Інфлянтаў, іх звычаяў і абрадаў. Яго хвалявала пытанне граніц этнічных груп Падзвіння.

А. А. Плятар шмат падарожнічаў па Беларусі. Найбольш яго цікавіла гісторыя Полацка [13], а таксама Краславы, Дынабурга. З самага маленства ў сваім маёнтку Краславе пачаў калекцыяніраваць музейныя рэдкасці, куды ўвайшлі і прадметы археалогіі, сярод іх самыя раннія: два падобныя на абручы бронзавыя паясы, якія ў 1800 г. былі выкапаны каля маёнтка Скайста Дынабургскага павета [14]. У хатнім музеі А. А. Плятара экспанаваліся каменны малаток і ўпершыню выяўлены ва Усходняй Еўропе сашнік, якія былі знойдзены ў 1829 г. у в. Канецполе гэтага ж павета, меч з Франопаля Люцынскага павета, які выяўлены пры раскопках кургана ў 1809 г. [15] Магчыма, у калекцыі А. А. Плятара былі матэрыялы знаходак археолагаў Ф. Крузе і М. І. Борха, якія таксама вывучалі Падзвінне, бо малюнкі некаторых з іх знаходзім у працы Плятара [16]. У яго музеі было шмат гістарычных дакументаў, пераважна XVI—XVIII стст. Многае згарэла ў час пажару ў 1863 г. [17]

У вучоным свеце вяліся спрэчкі наконт ювелірнага майстэрства Лазара Богшы, які ў 1161 г. выканаў крыж Ефрасінні Полацкай для храма Праабражэння ў Полацку з надпісам: «Г[оспод]и помози рабоу своему



Магілёў у канцы XVIII ст.

Лазорю нареченомоу Богъши, съделавьшемоу кръст сии црькви святого Спаса и Офросиньи» [18]. У пачатку XIX ст. імем майстра цікавіўся З. Я. Даленга-Хадакоўскі. П. І. Кепен сцвярджаў, што Богша паходзіў са Случчыны [19]. Кепен пасля смерці Даленгі-Хадакоўскага звярнуў увагу навуковай грамадскасці на тытанічную працу археолага, апублікаваў біяграфію даследчыка [20]. У Кепена знаходзім упамінанне пра абата Бельчыцкага манастыра Шулакевіча, які яшчэ ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. вывучаў полацкія старажытнасці. На жаль, больш нідзе звестак пра Шулакевіча не сустракаем. П. І. Кепен мімаходзь упамінае і пра курс лекцый археалогіі, што чытаў прафесар Віленскага універсітэта Готфрыд Эрнест Гродэк (1762—1825) — настаўнік А. Міцкевіча і Я. Чачота.

На мяжы XVIII і XIX стст. працякала літаратурная і краязнаўчая дзейнасць Ю. Нямцэвіча [21]. Яго, як і Ф. Багамольца, а таксама А. Нарушэвіча, паляк Б. Ліманоўскі называў «ліцвінамі рускага паходжання» [22]. І гэта небеспадстаўна. Як вынікае з публіцыстычных выступленняў Ю. М. Нямцэвіча, ён сябе не называў палякам і ніколі не атаясамляў родны край з Польшчай. Ён пісаў пра сваю бацькаўшчыну з пяшчотай і гонарам [23].

Вольналюбівую паэзію Ю. Нямцэвіча, асабліва гістарычныя песні, цаніў дзекабрыст К. Ф. Рылееў. Ю. Нямцэвіч шмат зрабіў у вывучэнні і прапагандзе помнікаў мінулага. Хоць сам спецыяльна не займаўся археалагічнымі даследаваннямі, але сваімі выступленнямі на пасяджэннях Варшаўскага таварыства сяброў навук ён абуджаў іншых да гэтай дзейнасці, а таксама настойліва праводзіў ідэю аховы помнікаў старажытнасці [24].

Апісанні Брэста, Нясвіжа, Мінска, Магілёва і іншых гарадоў знаходзім у нямцэвічаўскім «Зборы гістарычных помнікаў пра даўнюю Польшчу». Пішучы пра Магілёў, Ю. Нямцэвіч паведамляе, што «горад высока ўзнесены, дзе некалі былі земляныя валы».

Энтузіястам вывучэння старажытнасцей быў і граф М. П. Румянцаў (1754—1826). Ён з'явіўся стваральнікам першай у Гомелі археалагіч-



А. Міцкевіч. Фота з медальёна 1898 г.

най калекцыі, асноўную частку якой склала нумізматыка. У яго зборах было шмат рэдкіх дакументаў, рукапісаў, кніжных фаліянтаў, манускрыптаў. Вялікую падтрымку ад М. П. Румянцава меў І. І. Грыгаровіч (1792—1852), які выдаў выключны сваім падборам матэрыялаў «Беларускі архіў» [25]. І. І. Грыгаровіч з'яўляецца і аўтарам «Словаря западнорусского языка» [26].

Апякунствам М. П. Румянцава карыстаўся гродзенскі калекцыянер археаграфічных матэрыялаў Антон Глябовіч (1801—1847), які пасля і сам стаў вывучаць наднёманскія старажытнасці. На жаль, многае з яго збораў бясследна страцілася.

Прадаўжальнікам І. І. Грыгаровіча ў выданні гістарычных крыніц быў І. М. Даніловіч [27]. І. М. Даніловіч выдаў каля 2500 дакументаў, у тым ліку Супрасльскі летапіс.

Аўтарам шматлікіх артыкулаў па гісторыі старажытнай Літвы і Беларусі з'яўляецца І. П. Барычэўскі (1810—1887). Ён шмат падарожнічаў па Беларусі. Найбольш плённа ён працаваў у дарэформенны перыяд, апублікаваў такія працы, як «Камни литовских богинь» (1839), «Повести и предания славянского племени» (СПб., 1840—1841, ч. 1—2). Аўтара найбольш захаплялі фальклор, этнаграфія, аднак жа ў яго знаходзім меркаванні наконт паходжання выяўленых на Беларусі і ў Літве боствау (бажкоў). Збіраў ён звесткі і пра помнікі археалогіі [28].

Кароткі агляд першакрыніц па гісторыі краю зрабіў Ю. Нарбут [29]. Работа кампілятыўная, якую склалі звесткі, узятыя ў Мехавіты, Длугаша, Стрыйкоўскага і іншых аўтараў [30]. Большую самастойнасць праявіў Ю. Нарбут у вывучэнні мясцовай міфалогіі, указаў на прысутнасць у ёй рудыментаў язычніцтва. Менавіта гэтая частка працы і з'яўляецца найбольш каштоўнай з пункту гледжання гістарычнага краязнаўства.

На развіццё краязнаўства Беларусі і вывучэнне мясцовых старажытнасцей уплывалі такія пісьменнікі, як Я. Чачот, А. Міцкевіч, Я. Баршчэўскі, Т. Зан, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Рыпінскі, Т. Лада-Заблоцкі і іншыя, якія і самі часта выказвалі свае меркаванні па пытаннях гісторыі, этнаграфіі, краязнаўства. Іх творчасць жывілася народнымі песнямі, легендамі, гісторыяй краю.

Віленская моладзь, асабліва члены нелегальных таварыстваў філарэтаў і філаматаў, разумела запатрабаванні народа, вывучала яго мінулае і сучаснае, быт, фальклор. Паводле ўспамінаў Т. Зана, студэнты «ахвотна карысталіся простай мовай сялян» [31]. На ўскраіне Вільні А. Міцкевіч, Я. Чачот, Т. Зан і іншыя члены падпольнага гуртка збіраліся на тайныя сходы, дзе апрача рэфератаў палітычнага характару



Навагрудак у пачатку XIX ст. Акварэль I. Пешкі

чыталі своеасаблівыя рэфераты аб мінулым Міншчыны, Віленшчыны, Гродзеншчыны, Віцебшчыны, Магілёўшчыны. Сярод такіх паведамленняў было «Апісанне Завілейскага павета», якое прачытаў у 1820 г. С. Казакевіч [32].

Пад уражаннем беларускіх паданняў і гістарычных рэалій краю развівалася і творчасць Адама Міцкевіча. Ён з маленства натхняўся патрыятычнымі легендамі пра навагрудскі замак і пра іншыя навакольныя славутасці. Сваёй творчасцю ён засведчыў глыбокія веды гісторыі і этнаграфіі Беларусі [33].

Працуючы над вялікім творам «Конрад Валенрод», А. Міцкевіч шырока карыстаўся мясцовымі гістарычнымі матэрыяламі. Тое ж можна сказаць пра «Гражыну», дзе гучаць беларускія назвы і тутэйшыя легенды [34]. Найбольш паэта ўзбагацілі матэрыялы Шчорсаўскай бібліятэкі. На мясцовай глебе нарадзілася паэма «Пан Тадэвуш». Старажытны абрад памінання продкаў выкарыстаны паэтам у драматычнай паэме «Дзяды». Паказаны «перажыткі язычніцкіх традыцый, якія змешаны з хрысціянскімі вераваннямі» [35].

Зямляк і сябар А. Міцкевіча Ян Чачот [36] сваёй увагай да гісторыі і культуры беларускага народа даваў прыклад іншым літаратарам і гісторыкам — ураджэнцам Беларусі. Вядомы паэт і фалькларыст спецыяльна вывучаў розныя крыніцы, у тым ліку і «Хроніку» М. Стрыйкоўскага, каб распрацаваць гісторыю Беларусі. Ён давёў яе да 1834 г. [37] Краязнаўчая тэматыка ўгадваецца ўжо ў саміх назвах яго твораў: «Навагрудскі замак», «Світязь-возера», «Мышанка» і інш. Іх змест толькі пацвярджае гэта. Тэма вывучэння роднага краю для Яна Чачота з'яўлялася галоўнай у яго збіральніцкай, фалькларыстычнай і літаратурнай дзейнасці. Ён выказваўся за дэмакратычныя пераўтварэнні і змены тагачаснага дзяржаўнага ладу [38] і з-за гэтага ішоў у ссылку [39].

Т. Зан [40] на беларускім гістарычным матэрыяле ствараў паэмы і

вершы. За свае дэмакратычныя перакананні адбываў ссылку на Урале, у Арэнбурзе заснаваў першы ў Расіі мінералагічны музей.

М. К. Баброўскі [41] актыўна выступаў супраць паланізацыі краю і ў сваёй навуковай дзейнасці трымаўся прагрэсіўных поглядаў. Ён вывучаў старадрукі, летапісы, склаў праграму для збору гістарычных і лінгвістычных крыніц [42].

У 1820—1830-х гадах зацікавіўся Палессем банкаўскі чыноўнік К. П. Контрым [43]. Вынікам яго падарожжа з'явілася кніга дарожных нататак, у якой знаходзім звесткі пра помнікі Брэста, Пінска, Петрыкава, Турава, Давыд-Гарадка [44]. Аўтар занатаваў мясцовыя легенды, пакінуў краязнаўчыя нататкі пра тыя мясціны, цераз якія ён праязджаў. К. П. Контрым рабіў літаграфічныя малюнкі помнікаў старажытнасці, гарадоў і мястэчак, што з'явілася дадатковым каштоўным матэрыялам.

Сярод краязнаўцаў і археолагаў першай трэці XIX ст. найбольшыя заслугі перад навукай маюць З. Даленга-Хадакоўскі і Т. Нарбут.

## З. Я. ДАЛЕНГА-ХАДАКОЎСКІ (1784—1825)

З імем Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага звязаны пачатак навуковай археалогіі ў Расіі. Ён упершыню даў правільную трактоўку помнікаў старажытнасці як гістарычнай крыніцы. Ён жа ўнёс прыкметны ўклад у развіццё фалькларыстыкі і этнаграфіі. Сваім жыццём і навуковай дзейнасцю Хадакоўскі перш за ўсё і больш за ўсё звязаны з Беларуссю. Менавіта тут пачыналася яго захапленне творамі вуснай народнай творчасці і помнікамі старажытнасці. З яго пачынаецца беларуская навуковая фалькларыстыка, археалогія і этнаграфія.

Нарадзіўся Даленга-Хадакоўскі (Адам Якаўлевіч Чарнецкі) у сям'і дробнага беларускага шляхціца і службоўца ў фальварку Падгайная [1] Мінскага ваяводства. Скончыў Слуцкае павятовае вучылішча, а потым Крамянецкі юрыдычны ліцэй, пасля чаго вярнуўся на Беларусь і заняўся прыватнай адвакатурай. Працаваў спачатку ў Мінску, а пасля ў Варончы пад Навагрудкам. У гэты час пачаў запісваць народныя песні, збіраць летапісныя звесткі і іншыя пісьмовыя крыніцы пра паселішчы і помнікі старажытнасці. За ўдзел у нейкім нелегальным гуртку яго арыштавалі ў сакавіку 1809 г. і выслалі ў Табольскую губ. Напачатку юнака затачылі ў турму, а некалькі пазней—на пажыццёвую салдацкую службу, адкуль ён уцёк у 1811 г. Удзельнічаў у вайне 1812 г. і трапіў у палон. Зноў уцёкі... Дамоў жа ён не вярнуўся. Каб скрыць сляды свайго мінулага і жыць на легальным становішчы, Адам Чарноцкі тайна перабраўся да сяброў па Крамянецкім ліцэі—у Галіцыю і там памяняў сваё прозвішча на Зарыян Даленга-Хадакоўскі, з якім і ўвайшоў у гісторыю айчыннай і зарубежнай навукі.

Ёсць звесткі, што Хадакоўскі знаходзіўся ў блізкіх адносінах з дзекабрыстамі, асабліва з Фёдарам Мікалаевічам Глінкам (1786—1880), які таксама цікавіўся археалогіяй [2].

Вучоны-самавук падтрымліваў сувязі з «Варшаўскім таварыствам сяброў навук», дасылаў туды свае нататкі па розных праблемах старажытнай гісторыі, этнаграфіі і фальклору.

З. Даленга-Хадакоўскі амаль адначасова прапанаваў свае паслугі і пецярбургскаму «Вольнаму таварыству аматараў расійскай славеснасці». У 1819 г., калі кіраўніком «Таварыства» быў Ф. М. Глінка, З. Даленга-Хадакоўскі стаў членам гэтай арганізацыі. У Пецярбурзе, акрамя Глін-

кі, ён сустракаўся з Карамзіным, Шышковым, Каразіным, Кукальнікам, Паповым, Богуш-Сестранцэвічам, паказваў ім свае матэрыялы [3].


З. Даленга-Хадакоўскі

У час падарожжаў па Беларусі, Украіне, па Паўночнай і Цэнтральнай Расіі З. Даленга-Хадакоўскі з самага пачатку адчуў цяжкасці ў зборы навуковага матэрыялу з-за адсутнасці ў яго адпаведнага дакумента, які засведчыў бы яго асобу і даваў бы права карыстацца неабходнымі архівамі і бібліятэкамі, а калі будзе патрэба, то і праводзіць археалагічныя раскопкі. З просьбай выдаць такі дакумент Хадакоўскі звярнуўся ў Віленскі універсітэт. Разам з пісьмом-просьбай ён паслаў туды сваю працу пра славянскія старажытнасці і праспект на новыя даследаванні. Неўзабаве ў лісце сваяку К. Чарноцкаму даследчык з радасцю паведамляў: «Віленскі універсітэт вымушан быў засведчыць урадава маю працу і пергаментны ліст на трох мовах з прывешанай вялікай пячаткай прыслаў мне ў Кіеў» [4]. Гэта была першая ў Расіі грамата (паводле сучаснай тэрміналогіі, адкрыты ліст) на права археалагічных раскопак і на карыстанне кнігасховішчамі і архівамі. Яна была выпісана Хадакоўскаму 14 снежня 1818 г. [5]

У эпоху феадалізму ва ўмовах прыватнай уласнасці на зямлю, а з ёю і на ўсе аб'екты, якія на ёй знаходзіліся, а таксама на права карыстання бібліятэкамі, архівамі, калекцыямі такі дакумент меў выключнае значэнне. Грамата напісана на лацінскай, польскай і рускай мовах і яе аўтэнтычнасць пацвярджалі «віслыя» пячаткі універсітэта.

У 1820—1821 гг. З. Даленга-Хадакоўскі знаходзіўся ў навуковай экспедыцыі на поўначы Расіі — у Наўгародскай, Іжорскай і Валагодскай землях. За 16 месяцаў ён праехаў і прайшоў шэсць губерняў. Асабліва старанна даследаваў Старую Ладагу. Спачатку яго археалагічныя паездкі па краіне фінансавала міністэрства асветы, але неўзабаве вучонаму давялося працягваць сваю дзейнасць на ўласныя сродкі і жыць выпадковымі заробкамі.

Не ўсё сабранае і нават распрацаванае З. Даленгам-Хадакоўскім стала набыткам навукі. Лёс рукапіснай спадчыны вучонага склаўся досыць драматычна. Пасля яго раптоўнай смерці ў 1825 г. у с. Пятроўскім каля Цвяры манускрыпты даследчыка аказаліся ў руках жонкі, з якой вёў перагаворы на прадмет куплі журналіст і гісторык М. А. Палявы, каб пасля прысвоіць напісанае З. Даленгам-Хадакоўскім. Своечасова ўмяшаўся гісторык М. П. Пагодзін, які і выратаваў ад магчымага прысваення спадчыны таленавітага вучонага-самародка. Менавіта М. П. Пагодзін пачаў вывучаць і публікаваць некаторыя працы Хадакоўскага [6].

Так пастуова навуковыя ідэі першапраходца славянскай археалогіі траплялі ў друк і заваёўвалі ўсё шырэйшае прызнанне.

У наш час шмат зрабіў для даследавання навуковай дзейнасці З. Даленгі-Хадакоўскага польскі вучоны Ю. Маслянка [7], які перавыдаў найбольш папулярную працу «Аб славянстве перад хрысціянствам» [8]. Гэту працу савецкі вучоны М. К. Азадоўскі ацаніў як з'яву выключную, што не мае аналагаў у заходнееўрапейскай навуцы XIX ст.[9] Вывучалі навуковую дзейнасць З. Даленгі-Хадакоўскага Ф. Равіта-Гаўронскі [10], Л. А. Малаш-Аксамітава [11], А. І. Дэй [12] і інш.

З навуковай спадчыны З. Даленгі-Хадакоўскага самай нявывучанай з'яўляецца тая частка, якая датычыць краязнаўства і археалогіі Беларусі. Як слушна заўважыла Л. А. Малаш-Аксамітава, З. Даленгу-Хадакоўскага «належала б назваць першым беларускім мовазнаўцам, фальклярыстам, археолагам і этнографам» [13]. Найперш вучоны звярнуў на сябе ўвагу падыходам да вырашэння праблемы паходжання славян. Для вывучэння славянскіх прастораў адных толькі пісьмовых крыніц недастаткова, а таму неабходна, як пераконваў З. Даленга-Хадакоўскі, праверыць летапісныя звесткі археалагічнымі раскопкамі. Вучоны верыў, што на многае змогуць даць адказы толькі палявыя даследаванні. Зрэшты, тады ніхто з гісторыкаў не надаваў такога значэння раскопкам. Думкі Хадакоўскага пра даследаванне старажытнасцей краю адлюстраваны ў яго «Гістарычнай сістэме» [14]. «Гістарычная сістэма» З. Даленгі-Хадакоўскага палемічная, паколькі з'яўляецца адказам на надрукаваныя К. Ф. Калайдовічам вынікі яго археалагічных пошукаў у Разанскай губ. (1822 г.) [15]. На славянскіх прасторах Хадакоўскі паўсюдна сустракаў гарадзішчы. Ён зрабіў вывад, што для «славян няма нічога такога агульнага, як гэтыя гарады і гарадзішчы» [16]. Ён ставіў пытанне: як далёка распаўсюджваюцца такія помнікі, дзе граніцы славян? І даследчык знаходзіў арыгінальнае рашэнне: раіў звярнуцца да гісторыі і геаграфічных назваў, бо толькі па гарадзішчах цяжка меркаваць пра тэрыторыю рассялення славян, тым больш што не ўсе гарадзішчы з'яўляюцца славянскімі [17].

На думку вучонага, «городища были святыми оградцами или приходскими местами, где свадьбы и другие обряды языческие свершались» [18]. А. А. Спіцын цалкам і поўнасцю падтрымліваў З. Даленгу-Хадакоўскага [19]. Аднак К. Ф. Калайдовіч разглядаў гарадзішчы як рэшткі старажытных умацаванняў. Цяпер вучоныя лічаць, што гэтыя помнікі былі перш-наперш умацаванымі паселішчамі, а потым ужо маглі быць і культавымі [20].

З. Даленга-Хадакоўскі за сваё нядоўгае жыццё паспеў сабраць звесткі больш чым аб 1 тыс. гарадзішчаў. Паводле яго разумення, гарадзішча — гэта насыпанае ўзвышэнне, якое абносілася землянымі валамі, з уваходам з усходняга боку. Даследчык адзначаў, што гарадзішчы насыпаны з чарназёму, хаця побач з імі часта знаходзіцца зямля глiністая або пясчаная [21]. Ён яшчэ не разумеў, што культурны слой не насыпаўся, а сам утвараўся. У поле зроку даследчыка траплялі назвы ўрочышчаў, якія знаходзіліся паблізу гарадзішчаў і нагадвалі «імёны славянскіх боствaў». Самі ж «гарадкі знаходзяцца па 2—3 у адной вярсце, што ў наваколлі» [22]. У З. Даленгі-Хадакоўскага былі праціўнікі яго тэорыі гарадзішчаў (К. Ф. Калайдовіч, а таксама І. М. Даніловіч, М. Грабоўскі), аднак у яго былі і прыхільнікі (М. П. Пагодзін, А. К. Кіркор, І. І. Крашэўскі, часткова І. І. Сразнеўскі). З Хадакоўскім можна спрачацца, бо не ўсе яго меркаванні пацвердзіліся пазнейшымі археалагічнымі даследаваннямі. Ён з упэўненасцю сцвярджаў, што гарадзішчы на тэрыторыі Расіі ўзніклі «ранней 989 года» [23].



Auspiciis Augustissimi et Potentissimi Imperatoris

ALEXANDRI I.

Russorum Autocratoris &c

Caesarea Universitas Litterarum Vilnensis

Lecturis S. P. D.

Грамата на права археалагічных раскопак, выдадзеная З. Даленгу-Хадакоўскаму

З. Даленга-Хадакоўскі склаў чатырохтомны «Слоўнік назваў гарадзішчаў і ўрочышчаў» — першы вопыт такога роду ва ўсходнеславянскіх археолагаў. Часткова гэты «Слоўнік» быў апублікаваны ў «Русском историческом сборнике» (т. VII, 1844), але ніколі не выдаваўся цалкам. Сам жа факт стварэння такога «Слоўніка», у якім былі лаканічныя звесткі пра помнікі старажытнасці, — з'ява новая і для таго часу унікальная. І ў гэтай справе Хадакоўскі апярэджваў амаль усіх археолагаў-сучаснікаў. Сярод некалькіх тысяч зарэгістраваных ім помнікаў каля 200 было зафіксавана на тэрыторыі Беларусі [24].

У запісках З. Даленгі-Хадакоўскага адзначана гарадзішча каля Скорава над р. Капыткай, каля Цімкавіч і Раёўкі, каля Слуцка і Горак. Даследчык занёс у свой «Слоўнік» археалагічныя помнікі з-пад Брэста, Віцебска, Полацка, Гродна і з іншых мясцін Беларусі. Пры складанні свайго «Слоўніка» вучоны часта браў пад увагу такія тапонімы, як Гарадзішча, Гарадзец, Гарадок, Навагрудак і інш.

Ён не адхіляў гіпотэз сваіх сучаснікаў В. Суравецкага і С. Маеўскага аб «калысцы славян», аб блізкасці славянскіх моў да санскрыта і аб магчымым перамяшчэнні славянскіх плямёнаў з Індыі на еўрапейскі кантынент. Дарэчы, у гэты час пачыналі захапляцца індаеўрапейскай праблемай мовазнаўцы і археолагі Заходняй Еўропы [25]. З. Даленга-Хадакоўскі згадзіўся з довадамі В. Суравецкага [26] і С. Маеўскага [27]. Ён прыняў пад увагу этымалогію назвы «славянін», а таксама выкарыстаў у якасці аргумента тапонімы з асновай слова «слава» і знайшоў 262 такія варыянты, як Слаўкі, Слаўцы, Славічын. З. Даленга-Хадакоўскі раіў звярнуць увагу на назвы некаторых птушак, звяроў і раслін. Па гэтай прыкмеце цяжка прасачыць міграцыю людзей, хоць вывучэнне аднолькавых назваў раслін і жывёл — важны навуковы аргумент у доказе этнічнай агульнасці народаў. Нам здаецца больш пераканаўчай і перспектыўнай думка Хадакоўскага ў даказванні блізкасці народаў праз вывучэнне старажытных помнікаў, абрадаў, песень і г. д. Ён раіў апісаць і ўкласці «ўсё гэта ў адну кнігу, і мы безумоўна пераканаемся аб нашым паходжанні... з Індастана» [28].

Як мы ўжо бачылі на прыкладзе з К. Ф. Калайдовічам, З. Даленга-Хадакоўскі мог навукова абгрунтавана весці палеміку па праблемах старажытнай гісторыі. Прачытаўшы працу М. М. Карамзіна «История государства Российского» (т. 1—2, 1816—1829), ён перш за ўсё знайшоў для сябе шмат павучальнага, патрэбнага для ўласнага даследавання і часта рабіў спасылкі на яго. Усё ж Хадакоўскі заўважыў шмат недакладнасцей у вызначэнні рассялення славянскіх плямёнаў і ў іншых даследчыкаў [29].

З. Даленга-Хадакоўскі зацікавіўся мясцовымі археалагічнымі помнікамі і даў ім свае тлумачэнні. Пры дарозе з Мінска на Бабруйск, пры в. Старыя Дарогі, ён заўважыў курганы і палічыў іх дрыгавіцкімі. «Можна пагадзіцца, — піша археолаг, — што тут пачатак драговічаў, ці дараговічаў» [30]. Матэрыялы даследаванняў У. В. Завітневіча [31], а цяпер В. В. Сядова пераконваюць нас у тым, што і тут З. Даленга-Хадакоўскі ў асноўным арыентаваўся правільна.

Цікавая думка Хадакоўскага аб паходжанні назвы радзімічаў. Ён лічыў, што яна пайшла ад назвы населенага пункта Радомля ў Чавускім павеце, а не ад патранамічнага Радзіма, як гэта зараз замацавалася ў навуцы.

«Варта ўвагі тое, — пісаў Хадакоўскі, — што паміж Вільняю, Гроднам і Мінскам ёсць здаўна руская (беларуская) гаворка. Літоўскія



Гарадзішча ў Тураве

князі не аспрэчвалі гэтага, бо самі ўжывалі пры двары, у дагаворах і статутах» [32]. Крэва называў Хадакоўскі «гняздом крывічоў».

Атрымаўшы ад сваіх карэспандэнтаў звесткі пра гарадзішча, якое знаходзілася паміж Любовічамі і Хільчыцамі, за тры вярсты ад Турава, З. Даленга-Хадакоўскі зрабіў яго апісанне. Такім жа метадам ён сабраў матэрыялы пра гарадзішча ў Людзяневічах над р. Пішчанік (Пішчана) і шкадаваў, «што не выявілася гарадзішча перад Туравам, якое павінна быць у адной вярсце ад яго» [33]. Прадбачанне гэтага аб'екта пазней практычна пацвердзілі А. Д. Каваленя, С. С. Шутаў, А. М. Ляўданскі, В. В. Сядоў, П. Ф. Лысенка. Апошні толькі зрабіў удакладненне ў тлумачэнні З. Даленгам-Хадакоўскім тапоніма Тураў. Хадакоўскі сабраў каля 50 тапонімаў з коранем слова «тур» і зрабіў вывад, што ўсе яны паходзяць ад жывёлы тур, бо ў песнях часта спяваецца пра «тура з пазалочанымі рагамі і турыцу, якая шукала свайго ўзятага туранятка» [34]. П. Ф. Лысенка лічыць, што «назва горада паходзіць ад прозвішча асобы, якая ўладала Туравам» [35].

Першым на Беларусі З. Даленга-Хадакоўскі ўзяўся за вывучэнне старажытных шляхоў зносін, што з'яўляецца таксама важным матэрыялам пры вывучэнні гісторыі краю. Даследчык са спасылкай на гістарычныя крыніцы прасачыў на беларускай зямлі пераваланчыя дарогі з Кіева па Дняпры, Бярэзіне, Свіслачы, Вушы, Віліі, р. Нарочы, воз. Нарач, далей праз сістэму іншых азёраў у Дзісну, а па ёй да Заходняй Дзвіны — у Полацк [36]. Другі водна-пераваланчы гандлёвы шлях, на думку З. Даленгі-Хадакоўскага, мог праходзіць з Ізяслаўя (Заслаўя) у Нёман праз Пціч і Усу і выкарыстоўваўся для гандлю з немцамі. Такую ж гіпотэзу выказаў і М. М. Карамзін [37]. Калі паверыць у яе, то ўжо надта доўгія ўчасткі шляху трэба было пераадольваць волакам. Але ж і М. М. Карамзін браў звесткі ад Нестара і Шлёцара. З. Даленга-Хадакоўскі, вывучаючы Прыпяцкі водны шлях, выказаў здагадку пра магчымыя сувязі дрыгавічоў, валынян і крывічоў. У наш час верагоднасць выкарыстання некаторых старажытных шляхоў, асабліва водных, вывучае В. А. Жучкевіч [38], хаця не аддае належнай увагі лінгвістычным аналізам тапонімаў і гідронімаў для большай дасканаласці і пераканаўчасці, а таму гэта праблемнае пытанне чакае свайго даследавання. Сам жа З. Даленга-Хадакоўскі надаваў вялікае значэнне

тапонімам тыпу Стайкі, Волакі. Так, ён звярнуў увагу на назву «Пераналачна» ў вярхоўях Друці [39]. Ён зрабіў вывад: «Сей пункт, вероятно, находился на пути сообщения между Киевом и Полоцком». І тут жа сябе папраўляе: «Хотя прямее того мы видим по Березине и Ушаче» [40]. З. Даленга-Хадакоўскі асэнсоўваў і пісьмовыя крыніцы. Вывучыўшы «Слова аб палку Ігаравым», ён выказаў думку, што р. Няміга цячэ праз Мінск [41]. Гэта гіпотэза яшчэ ў 1830—1840 гг. была пацверджана яго паслядоўнікамі.

Як бачым, у дзейнасці З. Даленгі-Хадакоўскага шмат павучальнага, аб чым пазней пісалі вучоныя Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны, а таксама Францыі, Чэхаславакіі, Швейцарыі і іншых краін. Каштоўны тут сам падыход даследчыка да праблем гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, фальклору.

Нам дакладна невядомы прыёмы раскопак Хадакоўскага. Ён, здаецца, больш групаваў матэрыялы пра археалагічныя помнікі, чым капаў. Пісьмы, якія ён адрасаваў карэспандэнтам, асвятляюць спосаб яго збораў. Яшчэ жывучы ў Галіцыі, ён зрабіў сваімі памочнікамі ў збіранні беларускіх матэрыялаў А. Анацэвіча, В. Красінскага, К. Чарноцкага, С. Шантыра, І. Храптовіча і іншых. Яны дасылалі даследчыку звесткі пра паходжанне мясцовых назваў, папаўнялі яго «Слоўнік» славянскіх урочышчаў, дапамагалі вызначыць месцазнаходжанне помнікаў старажытнасці. У пісьме да сваяка Карла Чарноцкага ў 1818 г. З. Даленга-Хадакоўскі дапытваўся пра «незвычайныя» месцы пад Клецкам. У прыватнасці, яго захапіла праблема Чорнай Русі. А для яе вывучэння археолаг цікавіўся ўсім: запісамі мясцовага фальклору, нават знахарствам, чарадзействам, прымхамі. Таго ж К. Чарноцкага настойліва прасіў пашукаць сярод сваіх знаёмых, хто мог бы ў Навагрудку «зняць план і дакладна замерыць магілу Міндоўга, якая знаходзіцца пад замкам — трэба мне яе бачыць, якая яе вышыня і акружнасць..., хаця Міндоўг і не належыць да племя славянскага, аднак жа Літва, або Ліетува, ад нас жывілася... Ці не чулі яшчэ пра магілы на Літве, што ў гонар адной асобы насыпалі, падобна егіпецкім пірамідам, — працягваў ён. — Твой старэйшы брат некалі быў набожны і насіў ахвяры па тамтэйшай дзявіцы, ці не чуў ён аб якой Лысай гары: каб так звалася» [42]. У наступным пісьме З. Даленга-Хадакоўскі дзякуе за апісанне Турава, якое вельмі грунтоўнае і можа служыць за дадатак да выпісаў другога яго памочніка — Гячэвіча. Пра Тураў даследчык атрымаў пісьмы ад К. Чарноцкага, Скачынскага і Гячэвіча. Ён прасіў сваяка, каб той падзякаваў за добрае апісанне старажытных аб'ектаў [43]. В. Красінскі паведаміў Хадакоўскаму, што для яго «граф Храптовіч падрыхтаваў шмат цікавага пра Крэва пад вуглом погляду тапаграфічнага, таксама і гістарычнага» [44]. Дапамагаў Хадакоўскаму ў зборы звестак пра помнікі старажытнасці польскі гісторык Г. Бандке [45].

З. Даленга-Хадакоўскі збіраў і шырока выкарыстоўваў у практыцы навуковага даследавання карты і планы рэгіёнаў і асобных месцаў. Так, на картах Дзісенскага, Вілейскага і Барысаўскага паветаў, якія ён атрымаў ад мінскага губернатара В. Гячэвіча, яму «адкрылася 9 населеных месц, якія называліся Гарадзішчамі і Гарадкамі» [46]. Прычым В. Гячэвіч прыслаў апісанні Мыслабожы над р. Шчарай, нават прыслаў малюнкі вёскі. Сам жа даследчык у Пецярбурзе зняў планы Магілёва і іншых гарадоў.

Ніхто з даследчыкаў гісторыі Беларусі да З. Даленгі-Хадакоўскага не выкарыстоўваў так шырока метад комплекснага вывучэння стара-

жытнасцей, падмацоўваючы звесткамі з галіны геаграфіі, лінгвістыкі, этнаграфіі, фальклору, прытым ніколі не забываючы і пра значэнне летапісных крыніц. Як адзначыў гісторык М. П. Пагодзін, З. Даленга-Хадакоўскі першым перанёс даследаванне «з пісьмовай галіны на зямлю і яе помнікі, выклікаўшы энтузіязм у многіх іншых» [47]. З. Даленга-Хадакоўскі не толькі ўпершыню сабраў звесткі аб гарадзішчах у асобны атлас, але і зрабіў замалёўкі знойдзеных пры раскопках прадметаў [48], хоць яны, як і атлас гарадзішчаў, лексікон 7 тыс. урочышчаў, замаляваныя ім планы археалагічных помнікаў, сталі здабыткам архіваў і не мелі ўплыву на наступныя пакаленні вучоных. Сама ж задума і здзяйсненне — плён яго апантанай працы па вывучэнні старажытнасцей — заслугоўваюць у гісторыі краязнаўства і археалогіі самай пільнай увагі. Часткова гэты атлас гарадзішчаў быў апублікаваны М. П. Пагодзіным [49].

З. Даленга-Хадакоўскі паказаў сябе кампетэнтным краязнаўцам пры тлумачэнні гісторыі старажытных беларускіх гарадоў, перш за ўсё Полацка і Гродна [50]. У Полацку ён указаў на гарадзішча паміж старым і новым цячэннем р. Палаты, дзе быў «выкарыстаны насыпны чарназём». Старажытны Полацк упершыню ім апісаны менавіта з пункту гледжання археолага. Хадакоўскі ў Полацку збіраў звесткі пра горад ад розных асоб, у тым ліку і царкоўнікаў, якія яму «расказвалі пра справы зусім не манастырскія» [51].

Даследчык пра гродзенскі замак пісаў, што ён «заснаваны, відавочна, на славянскім насыпным гарадку, які можна параўнаць з насыпам, што знаходзіцца пад царквой у Гарадку (Цвярскі павет), а таксама пад Каломенскім сялом на р. Маскве і многіх іншых» [52]. Правільнасць гэтай думкі пра культурны слой пад гродзенскім замкам пацвердзіў у 1930-х гадах З. Дурчэўскі [53], а ў 1949—1950 гг. — М. М. Воронін. Апошні матэрыяльную культуру старажытнага Гродна і датаваў XI—XIII стст.[54].

Звяртаючыся да старажытнай гісторыі славян, З. Даленга-Хадакоўскі бачыў іх адзінства, паколькі яны з'яўляюцца «дзецьмі маці славянскай» [55]. З. Даленга-Хадакоўскі, як і А. Міцкевіч, Я. Патоцкі, А. Рыпінскі, адзначаў спецыфіку культур славянскіх народаў, у тым ліку і беларускага, у мове, песні, побыце.

Сярод археолагаў свайго часу З. Даленга-Хадакоўскі вылучаўся мэтанакіраванасцю, смелай пастаноўкай складаных пытанняў і іх вырашэння, што стварыла яму аўтарытэт піянера не толькі беларускай, але і агульнаславянскай археалогіі. Нездарма А. А. Спіцын, пазнаёміўшыся са спадчынай вучонага, рэзюміраваў: «Гэта проста геніяльна!» [56] «Вядомым шукальнікам старажытнасцей» называў З. Даленгу-Хадакоўскага А. С. Пушкін, з якім, на думку А. А. Фармозава, у вучонага маглі быць асабістыя сустрэчы [57]. Прызнаннем заслуг З. Даленгі-Хадакоўскага з'явілася выбранне яго членам-карэспандэнтам «Вольнага таварыства аматараў расійскай славеснасці», членам-карэспандэнтам варшаўскага «Таварыства сяброў навук» (1819), а годам пазней — маскоўскага «Таварыства гісторыі старажытнасцей расійскіх». Ён змог часткова выканаць задуманае, разумеючы, што «першаму ісці непракладзеным шляхам вельмі цяжка» [58]. Ранняя нечаканая смерць застала Хадакоўскага, што называецца, у разгар яго самай плённай навуковай дзейнасці, калі многае ім было вывучана і творча засвоена, калі многія вучоныя чакалі ад гэтага самародка завяршэння работы над сапраўды стройнай навуковай гістарычнай сістэмай. Фактар незавершанасці яго

самай галоўнай працы трэба ўлічваць, але і тое, што ён зрабіў, надзейна ўвайшло ў метрыку археалагічнай навукі не толькі Беларусі, але і суседніх народаў.

### Т. Я. НАРБУТ (1784—1864)

Сучаснікам З. Даленгі-Хадакоўскага быў Тэадор-Матэвуш Яўхімавіч Нарбут, які зрабіў значны ўклад у гістарычную навуку перш за ўсё працай «Старажытная гісторыя літоўскага народа» [1].

Нарадзіўся Т. Я. Нарбут у маёнтку Шаўры Лідскага павета Гродзенскай губ. (зараз Воранаўскі раён Гродзенскай вобл.). Скончыў у 1803 г. матэматычна-інжынерны факультэт Віленскага універсітэта. Вучыўся ў вядомых архітэктараў А. Гуцэвіча, Д. Шульца. У 1803 г. быў прыняты ў пецярбургскі корпус кадэтаў, а ў 1804 г. удзельнічаў у рабоце камісіі па праекту рэгуляцыі Нёмана. Ёсць меркаванні, што ён удзельнічаў таксама і ў праектаванні Бабруйскай крэпасці. У час ваенных падзей 1806—1807, 1808—1809 гг. са Швецыяй, а таксама з Францыяй быў кантужаны, страціў слых і быў вымушаны пайсці ў адстаўку. Заняўся навуковай працай у галіне гісторыі, археаграфіі, крыніцазнаўства, археалогіі, этнаграфіі і краязнаўства. Усё жыццё Т. Я. Нарбут правёў у сваім маёнтку Шаўры, аднак ён знаходзіўся ў пастаянных сувязях з творчай інтэлігенцыяй, аб чым сведчыць багатая эпісталярная спадчына вучонага.

У час паўстання 1830—1831 гг. у Варнянах наладзіў адліўку гармат. А за актыўны ўдзел у паўстанні 1863—1864 гг. яго сына Людвіга Чарбута (1832—1863) і за спачуванне паўстанню вучоны ў 1863 г. быў сасланы ў Вільню, дзе і памёр [2].

Яшчэ перад вайной 1812 г. Т. Я. Нарбут па абавязку ваеннага інжынера вёў на беразе Дняпра сапёрныя работы і выпадкова натрапіў на невядомыя яму дагэтуль прадметы старажытных часоў. Гэта не проста зацікавіла маладога афіцэра, але і вызначала далейшы лёс будучага даследчыка старажытнай гісторыі. «У 1810 г., — пісаў Нарбут, — аб'язджаючы гэтыя мясціны (паміж рэкамі Друць і Бярэзіна, на левым беразе Дняпра ад Магілёва да ракі Сож і да Рагачова. — *Г. К.)...*, я звярнуў увагу на курганы» [3]. Ён першым на Беларусі даў сваё вызначэнне курганам, хоць і няпоўнае, сутнасць жа іх разумеў: «Курганы — гэта насыпы зямлі, якія зроблены чалавечай рукой і якія маюць такую назву на Беларусі» [4]. Даследчык зазначыў, што вышыня іх бывае розная і што могуць быць адзінкавыя і групавыя. Два курганы Т. Я. Нарбут замерыў пад Старым Быхавам, на правым беразе Дняпра. Яму ўдалося знайсці яшчэ некалькі розных па велічыні курганоў. Яны трапляліся даследчыку на палях і лугавінах. Дапамагаў Т. Я. Нарбуту ў выяўленні новых археалагічных аб'ектаў павятовы лекар П. Генерт са Старога Быхава, які добра ведаў мясцовасць. Ён расказаў легенды пра курганы і паказаў нейкую хроніку XIV ст., у якой было таксама ўпамінанне пра іх. Т. Я. Нарбут зрабіў выпісы з той хронікі. Асабліва запамятаўся яму хаўтурны абрад, паводле якога памерлых ніколі не закопвалі ў зямлю, а выносілі на месца пахавання, там палілі цела, а ішных клалі так, ставячы ежу і пітво. Збіраўся народ і насыпалі земляны курган. Багацейшым і больш знатным — вышэйшыя курганы, а скупым, злым — малыя. Самымі скупымі і ганарыстымі былі паляўнічыя.

Т. Я. Нарбут звярнуў увагу, што, па-першае, зямля на курганах чарназёмная, насыпная, накапана з верхняга слоя. Па-другое, ён выявіў, што ямаў для памерлых не капалі, а клалі нябожчыкаў на паверхні зямлі і засыпалі. Даследчык памылкова лічыў, што старажытныя людзі пры пахаванні ў курган не выкарыстоўвалі дрэва і метал. Вельмі спрошчана разумеліся Т. Я. Нарбутам час з'яўлення курганоў і іх прыналежнасць нейкаму старажытнаму роду, што «жыў да русінаў і вёў з імі войны» [5].



Т. Я. Нарбут

У 1820 г. Т. Я. Нарбутам было адкрыта ямнае пахаванне недалёка ад Шаўроў Лідскага павета Гродзенскай губ. Побач з касцямі даследчыку трапляліся «сасуды адмысловай формы», тлумачэнне якім ён не дае. У манаграфіі «Старажытная гісторыя літоўскага народа» для большай перакананасці ён змясціў табліцу сваіх знаходак [6], што было новым у методыцы, якая толькі зараджалася разам з археалогіяй. Пра іншыя раскопкі вучонага, асабліва ў Лідскім павеце і пад Навагрудкам, маюцца толькі лаканічныя ўпамінанні [7].

Т. Я. Нарбут упершыню апісаў руіны крэпасці на Нёмане каля в. Лыскава Гродзенскага павета. Да сярэдзіны XIX ст. там яшчэ існавалі рэшткі сцен, угадваўся план пабудоў і сляды невядомага горада. Зробленыя вучоным запісы легенд ад старажылаў сведчаць, што раней руіны сцен узвышаліся на некалькі сажаняў [8].

Геральдыку на Беларусі Т. Нарбут не лічыў старажытнай, бо нават у сярэднія вякі, калі ў Еўропе ўжо былі гербы, тут іх яшчэ не было. Мясцовыя феадалы замест подпісаў ставілі на дакументах адбіткі сваіх геральдычных адлюстраванняў, якія мелі на пярсцёнках. Нарбут праілюстраваў сваю працу табліцай і графічным малюнкам пячатак 1541, 1513, 1608 і іншых гадоў.

Пра дрыгавічоў Т. Я. Нарбут гаварыў, што яны невядомага паходжання і жылі толькі каля Кіева [9], адвольна тлумачыў паходжанне драўлян, выводзячы іх назву са слова «древность», памылкова залічаў яцвягаў да скіфскіх, а не да балцкіх плямёнаў, як гэта пазней было прынята навукай [10].

Як краязнавец Т. Я. Нарбут надрукаваў шэраг артыкулаў (пераважна ў «Гродненских губернских ведомостях»). Сярод яго краязнаўчых работ найбольш каштоўнай з'яўляецца гісторыя старажытнай Ліды. Аўтар меў у руках мноства матэрыялаў, першы напісаў нарыс пра гэты горад. Заснаванне Ліды ён адносіў да 1180 г.[11] Такую дату

паўтаралі пасля ўсе польскія энцыклапедыі, аднак у апошні час яна бярэцца пад сумненне. Даследчыкі гэтага горада паводле археалагічных матэрыялаў паказваюць, што Ліда ўзнікла пазней, і дакладная дacіроўка застаецца адкрытай [12]. Гісторыя горада, паводле Т. Я. Нарбута, уяўляецца як гісторыя замка, княжацкіх родаў, касцёлаў і г. д. Гэта характэрна не толькі для Нарбута, але і для іншых гісторыкаў той пары. Нямала месца ў краязнаўчым нарысе пра Ліду даследчык заняў сваёй радаслоўнай [13].

Даследуючы Лідскі замак, Т. Я. Нарбут зрабіў вывад аб знаходжанні ў замкавай вежы на верхніх паверхах княжацкай залы і пакояў, а на ніжніх, на яго думку, маглі быць суд, архіў, турма [14]. Ён выказаў меркаванне аб размяшчэнні ў адной з вежаў царквы, якая ў 1583 г. была вынесена ў горад [15]. Гэтыя меркаванні ў асноўным пацвердзіліся апошнімі археалагічнымі даследаваннямі Лідскага замка [16].

У 1846 г. Нарбут выпусціў невялікую працу «Помнікі да гісторыі Літвы (з некаторымі поглядамі на гісторыю, дыпламатыю, геаграфію, статыстыку, этнаграфію, археаграфію і г. д.)»[17]. Сабраны тут гістарычныя крыніцы, дакументы, у якіх упамінаюцца розныя мясціны Беларусі і Літвы. Найбольшае месца заняла «Хроніка Быхаўца».

Акрамя гісторыі Ліды, Вільні, Крэва і Навагрудка, Гродна Т. Я. Нарбутам напісаны гісторыі мястэчак Ротніца і Керымушы Гродзенскай губ., а таксама старажытных гарадоў Шандуры і Райграда і іншых населеных пунктаў.

Галоўным для вучонага быў не сам збор крыніц. Акрамя археалогіі і гістарычнага краязнаўства ён займаўся пытаннямі этнаграфіі, гістарыяграфіі і фалькларыстыкі. Навуковая спадчына Т. Я. Нарбута багатая крыніцазнаўчым матэрыялам.

# СТАНАЎЛЕННЕ АРХЕАЛОГІІ І ГІСТАРЫЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА Ў ДАРЭФОРМЕННЫ ПЕРЫЯД

Першая трэць XIX ст. закончылася паўстаннем 1830—1831 гг., якое насіла абмежаваны палітычны характар. Пасля яго разгрому былі закрыты або рэарганізаваны некаторыя навучальныя ўстановы. Віленскі універсітэт быў пераведзены ў Кіеў.

У эканамічным жыцці ішло паступовае фарміраванне капіталістычных адносін, назіраўся рост гарадоў, якія станавіліся гандлёва-эканамічнымі цэнтрамі. Крызіс феадальных адносін быў відавочны. Гэта вымушала чынш замяніць паншчынай.

У 1840—1850 гг. пачынаецца ўздым антыфеадальнай барацьбы: «Калі на працягу першай трэці XIX ст. засведчана 46 найбольш буйных выступленняў сялян, то ў другой трэці 91 выступленне адбылося ў 190 паселішчах. Пры падаўленні большасці з іх была прыменена ваенная сіла» [1].

Вялікі ўплыў на выступленні сялян Беларусі аказала паўстанне іх класавых пабрацімаў у Галіцыі ў 1846 г. Адпаведнае значэнне мела і рэвалюцыя 1848 г. у краінах Заходняй Еўропы. У самой жа Беларусі дзейнічалі розныя рэвалюцыйна-дэмакратычныя арганізацыі. Так, па ініцыятыве беларускага паэта Ф. Савіча было створана нелегальнае «Дэмакратычнае таварыства», якое выхоўвала патрыятычныя пачуцці ў мясцовай моладзі. Рэвалюцыйным дэмакратызмам адзначана дзейнасць бясстрашнага сялянскага важака і публіцыста Ю. Бакшанскага, які адкрыта заяўляў: «Магутнасць нацыі складае клас людзей, імя якім мужыкі» [2]. Вялікі ўплыў на перадавую беларускую інтэлігенцыю аказвалі ідэі А. І. Герцэна, М. П. Агарова, В. Г. Бялінскага, М. Г. Чарнышэўскага, М. А. Дабралюбава і інш.

Прыгонніцтва аджывала. Яно не магло забяспечыць нармальнае развіццё грамадства, і гэта адчувалася ва ўсіх сферах жыцця. Сяляне часта галадалі. Петрашэвец, рэвалюцыйны дэмакрат М. А. Мамбелі (1832—1891), які пабываў на Віцебшчыне, пісаў: «І зараз яшчэ прабягаюць халодныя дрыжыкі па жылах, калі ўспамінаю пра ўбачаны мною кавалак хлеба, якім харчуюцца сяляне Віцебскай губерні: мукі ў ім зусім няма, ён складаецца з мякіны, саломы і яшчэ нейкай травы... Хоць я і праціўнік усякага фізічнага пакарання, але хацеў бы дзіцялюбівага імператара на некалькі дзён пасадзіць на харчы віцебскага селяніна» [3]. Пра гэтае безвыходнае становішча паведамляў міністру ўнутраных спраў генерал-губернатар віцебскі, магілёўскі і смаленскі: «Бесперастанку атрымліваю я данясенні земскіх паліцэйскіх, што сяляне многіх даручаных мне губерняў прычыняюць сабе гвалтоўную смерць» [4]. Такое сацыяльна-эканамічнае становішча не спрыяла развіццю беларускай навукі.

18 чэрвеня 1840 г. указам Мікалая І забаранялася ўжываць тэрмін «Беларусь». Адсутнічалі нацыянальныя школы, газеты, часопісы, што вельмі абмяжоўвала развіццё культуры. Узмацненне цэнзурнага рэжы-

му, выхалашчванне зместу перыядычных выданняў стваралі неспрыяльны клімат для навуковай думкі. Дзякуючы намаганням мясцовай інтэлігенцыі з 1835 па 1861 г. на беларускай мове выйшла ўсяго 17 кніг [5]. Многія творы хадзілі ў народзе ананімна, як гэта было з вядомымі паэмамі «Тарас на Парнасе» і «Энеіда навыварат».

Хоць рэвалюцыйна-дэмакратычныя сілы цярпелі ад рэпрэсій, працэс навуковых даследаванняў не перапыняўся. У цяжкіх умовах ішло станаўленне гуманітарных навук. Навуковая думка на Беларусі знаходзілася не толькі пад дабратворным уплывам вучоных Расіі, Заходняй Еўропы, але і самі мясцовыя вучоныя ўплывалі на ход некаторых даследаванняў, браліся за вырашэнне праблем, якія цікавілі зарубежную навуковую грамадскасць. Яскравым прыкладам таму можа служыць дзейнасць З. Даленгі-Хадакоўскага, аўтарытэт якога ў археалогі набываў агульнаеўрапейскую значнасць. З рускіх вучоных тады найбольш вядомымі былі на Беларусі П. С. Савельеў, І. Я. Забелін, Б. В. Кёнэ, А. Ф. Бычкоў, І. І. Талстой, А. С. Увараў і інш. Створанае па ініцыятыве Б. В. Кёне і А. С. Уварава «Рускае археалагічнае таварыства» распаўсюджвала сваю дзейнасць і на Беларусь.

Плённы ўплыў на развіццё археалогіі і ўвогуле гістарычнай навукі на Беларусі зрабіў прафесар Віленскага універсітэта І. Лялевель (1786—1861), чалавек прагрэсіўных перакананняў, які добра ведаў гісторыю краю. У блізкіх адносінах ён быў з З. Даленгам-Хадакоўскім, Т. Нарбутам, А. Кіркорам, братамі Я. і К. Тышкевічамі, У. Сыракомлем. Хоць І. Лялевель мала праводзіў археалагічных раскопак, аднак ён звяртаў увагу гісторыкаў на неабходнасць выкарыстання іх практычных вынікаў у сваіх даследаваннях [6].

Агульнаеўрапейскае значэнне набыло адкрыццё дацкім вучоным К. Ю. Томсенам (1788—1865) «тэорыі трох эпох» — пра падзел гісторыі ў дапісьмовы перыяд на тры археалагічныя эпохі: каменя, бронзы і жалеза [7]. Ён абгрунтаваў сваю тэорыю метадам параўнальнага аналізу эмпірычных матэрыялаў. Паглыбіў і развіў гэтую тэорыю другі дацкі вучоны праф. І.-Я. Ворса (1821—1885). Для яго археалагічная знаходка стала гістарычнай крыніцай, з дапамогай якой ён мог гаварыць пра эпохі каменя, бронзы ці жалеза. Справу дацкіх даследчыкаў працягваў французскі археолаг Г. дэ Мартыльє (1821—1898), які ўпершыню падраздзяліў эпоху каменя на некалькі перыядаў. Дзейнасць гэтых археолагаў набыла сусветнае значэнне. З іх працамі былі знаёмы і даследчыкі беларускіх старажытнасцей Я. Тышкевіч, К. Тышкевіч, І. Крашэўскі.

У 1834 г. наглядчык гродзенскіх павятовых вучылішчаў І. Р. Кулакоўскі накіраваў пісьмо міністру асветы Расіі, у якім сцвярджаў, што Беларусь, нягледзячы на нездавальняючыя ўмовы, захавала сваю «простанародную» мову, сваё нацыянальнае аблічча. Педагог спецыяльна прывёў звесткі з гісторыі беларускага народа, расказаў пра сляды старажытных звычаяў, абрадаў. Разуменне ім «гісторыі як гісторыі народных мас было смелым крокам, знамянальнай з'явай у гісторыі грамадскай думкі Беларусі» [8]. І. Р. Кулакоўскі прасіў у міністра дазволу на стварэнне школьнага падручніка, у якім бы давалася «выразнае і сістэматычнае выкладанне гісторыі заходніх губерняў пад выключнай назвай «Гісторыя краю» [9]. Настаўнік хацеў прымусіць грамадства задумацца над лёсам беларускага народа. Ён вывучаў старажытныя помнікі Гродна. На аснове матэрыялаў І. Кулакоўскага, які дасканала ведаў гісторыю роднага краю, у тым ліку і Гродна, з'явіліся ананімныя

артыкулы ў «Виленском вестнике» (1864, № 17—19) і «Древностях» (МАО. М., 1865, т. 1, с. 38). Яго абралі ганаровым членам навуковага таварыства ў Даніі [10].

На беларускія землі распаўсюджвала свой уплыў Рускае геаграфічнае таварыства (РГТ). Яно пасылала розным установам свае апытальнікі. Пра замчышча ў Маладзечне і пра іншыя помнікі археалогіі паведамляў губернскаму начальству ў Мінск наглядчык Маладзечанскага павятовага вучылішча Вікенцій Ігнатовіч. Ён ставіў перад сабой задачу высветліць, «хто будаваў, у які час і супраць якіх ворагаў» раскіданыя па ўсім Вілейскім павеце «земляныя акопы?» [11] А для паспяховага правядзення доследаў даўніх помнікаў ён прасіў у губернскага начальства «адкрытае прадпісанне».

У другой трэці XIX ст. даследаваннямі помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры займаліся беларускія пісьменнікі і фалькларысты А. Рыпінскі, Я. Баршчэўскі, І. Храпавіцкі і інш. Кнігу «Беларусь» [12] Аляксандр Рыпінскі (1811 — каля 1900) прысвяціў гісторыі, этнаграфіі, фалькларыстыцы краю, пераважна Віцебшчыны, высока цаніў дзейнасць З. Даленгі-Хадакоўскага.

Услед за З. Даленгам-Хадакоўскім А. Рыпінскі спрабаваў вызначыць этнічную мяжу аседласці беларусаў. Паўднёвую граніцу ён праводзіў па Прыпяці, а паўночную давёў аж да Апочкі і Вялікіх Лук [13]. Ён ганарыўся продкамі, якія «ўзвялі магутныя муры, аб якія разбілася не адно полчышча ворагаў» [14].

Шмат гадоў вывучаў Віцебшчыну зямляк А. Рыпінскага Ян Баршчэўскі (1794 (1790)—1851). Ён з глыбокай сімпатыяй адносіўся да мінулага Беларусі і не ўтойваў свайго незадавальнення тагачасным яе становішчам. Свае ўражанні аб паездках па Віцебшчыне ён выклаў у працы «Шляхціц Завальня» [15]. Падарожнічаючы па краі, Я. Баршчэўскі звярнуў увагу на помнікі старасвеччыны. Недалёка ад Невеля, у ваколіцах Рыбшчызны, ён бачыў «насыпныя горы» [16]. Такія «горы» ён мог бачыць і ў ваколіцах бацькавага фальварка Мурагі каля воз. Нешчарда. Увага да помнікаў старажытнасці і, у прыватнасці, да помнікаў археалогіі ўзнікла ў Я. Баршчэўскага дзякуючы асабістаму знаёмству з археолагам А. Плятарам і з яго багатымі калекцыямі.

Дастаткова рана зарэкамендаваў сябе як краязнавец Рамуальд Андрэевіч Друцкі-Падбярэзскі (1813 (1814)—1856). Ён меў універсітэцкую адукацыю; кіраваў у Пецярбурзе гуртком беларускай моладзі, выдаваў у Вільні «Rocznik literacki» (выйшла ў 1843—1849 гг. чатыры тамы), а таксама выпускаў «Pamiętnik naukowo-literacki», у якіх друкавалася шмат матэрыялаў аб Беларусі. У 36 гадоў навуковая і выдавецкая дзейнасць Р. А. Друцкага-Падбярэзскага спынілася. За выпуск у Вільні «предосудительного сочинения» 31 мая 1851 г. яго адправілі ў Архангельск пад бестэрміновы нагляд паліцыі, а яго аднадумца і памочніка Э. Жалігоўскага саслалі ў Петразаводск [17], а пасля ў Арэнбург [18], затым Уфу [19]. Праз некаторы час Р. Друцкага-Падбярэзскага пераслалі ў Шэнкурск на р. Вага, пазбавіўшы права займацца літаратурнай працай, а толькі «чорнай надзённай работай», пасля адправілі ў Пінегу той жа Архангельскай губ., дзе ён і памёр 10 кастрычніка 1856 г.

Сваю цікавасць да мінулага беларускага народа Р. А. Друцкі-Падбярэзскі выказаў у прадмове да кнігі Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня». У публікацыі «Горад Барысаў» [20] ён выступіў як краязнавец, этнограф і археолаг. Ён пісаў, што горад тут развіўся і стаў адміністрацыйным цэнтрам дзякуючы спрыяльнаму геаграфічнаму становішчу.

У нарысе знаходзім апісанне старажытных збудаванняў, якія пазней зніклі. Заснаванне Барысава Р. А. Друцкі-Падбярэзскі, спасылаючыся на працы В. М. Тацішчава, аднёс да 1102 г.[21]. Ён адным з першых указаў, што Барысаў быў закладзены ў 5—6 вярстах на поўнач ад сучаснага горада[22]. Нядаўна Г. В. Штыхаў сваімі раскопкамі пацвердзіў гэта прадбачанне Друцкага-Падбярэзскага, сапраўды знайшоўшы рэшткі старажытнага паселішча[23]. Р. А. Друцкі-Падбярэзскі цікавіўся легендамі краю, мікратапанімікай, геральдыкай. Ён шукаў камяні з надпісамі. Адзін з іх з літарамі «R. S. B.»[24] краязнавец знайшоў у басейне р. Поня каля ўрочышча Стань-Кароль. Паўночную граніцу Беларусі ён праводзіў па лініі Асвея — Невель — Себеж, а г. Барысаў лічыў літоўскім горадам, разумеючы Літву як паняцце гістарычнае.

Р. А. Друцкі-Падбярэзскі быў яшчэ аўтарам некалькіх канфіскаваных цэнзурай артыкулаў, у якіх выявіў сябе не толькі як фалькларыст, этнограф і краязнавец, але і як мысліцель, для якога аўтарытэт А. Р. Бялінскага, бадай, быў адзіным аўтарытэтам у галіне крытыкі[25].

Краязнаўчую працу М. І. Борха[26] «Два словы пра Дзвіну»[27] раскрытыкаваў Т. Нарбут за няўменне вытлумачыць помнікі мінулых часоў і неразуменне аўтарам гандлёва-эканамічных асаблівасцей краю[28]. Спрэчка ўсчалася за бурштын, які з'явіўся прадметам гандлю. М. І. Борх лічыў, што на Падзвінні ў старажытнасці бурштыну не было[29]. Аднак археалагічныя даследаванні пацвярджаюць, што падзвінскія насельнікі ўсё ж бурштын мелі, хоць і імпартны[30]. М. І. Борх стварыў хатнюю музейную калекцыю, экспанаты яму дасталіся па спадчыне, многае дасабраў і сам[31].

Жыццё беларусаў Бельскага павета Гродзенскай губ.[32] даследаваў І. Б. Ярашэвіч[33]. Найгрунтоўнейшая праца І. Б. Ярашэвіча — «Вобраз Літвы з пункту погляду цывілізацыі ад найдаўнейшых часоў да канца XVIII стагоддзя[34]. Спасылаючыся на М. Стрыйкоўскага, А. Нарушэвіча, Т. Нарбута, ён прывёў розныя версіі аб паходжанні плямёнаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, а беларусаў лічыў нашчадкамі крывічоў, а нашчадкаў жыхароў так званай Чорнай Русі атаясамліваў з дрыгавічамі. Апошняе сцвярджэнне І. Б. Ярашэвіча выклікае сумненне і не адпавядае сучасным даследаванням археолагаў. Як і ў папярэдняй працы, ён на аснове лінгвістычных супастаўленняў вызначаў моўную беларуска-літоўскую мяжу і як гэтае суседства ўплывала на распаўсюджанне на беларускіх землях літоўскай міфалогіі.

Горадам старажытнарускай культуры называў І. Б. Ярашэвіч Драгічын. Пры напісанні краязнаўчага даследавання ён шырока выкарыстоўваў летапісы, хронікі, працы Карамзіна, Нарушэвіча, Бялінскага. Адносіў Драгічын да значных сярэдневяковых гарадоў Беларусі, дзе да 1657 г. узвышаўся замак[35]. Вывучаў ён і шэраг іншых гарадоў краю. І. Б. Ярашэвіч пакінуў значны след у гістарыяграфіі Вялікага княства Літоўскага, асаблівую ўвагу ён аддаваў пытанням гісторыі дзяржавы і права.

Сярод краязнаўцаў XIX ст. прыкметнай постаццю быў Міхал Іванавіч Балінскі (1794—1863), ураджэнец маёнтка Цярэспаль Полацкага павета[36]. Ён скончыў фізіка-матэматычны факультэт Віленскага універсітэта, быў рэдактарам «Віленскага штотыднёвіка» і «Вулканічных паведамленняў», у маладосці належаў да таварыства шубраўцаў, некаторы час выконваў абавязкі віцэ-прэзідэнта Віленскай археалагічнай камісіі, з'яўляўся членам Рускага геаграфічнага таварыства.

Першай буйной гісторыка-краязнаўчай працай М. Балінскага з'яві-

лася «Гісторыя горада Вільні» [37], у якой шмат фактаў з гісторыі Беларусі.

Манаграфія «Старажытная Польшча» [38] напісана М. Балінскім разам з Т. Ліпінскім. Аўтарам жа раздзелаў пра Беларусь з'яўляецца М. Балінскі, які глядзеў на гэту зямлю як на адвечна польскую. Часам з'яўлення славян на тэрыторыі Беларусі М. Балінскі лічыў V ст. н. э., мяркуючы, што паходзяць яны ад каўказскага племя [39]. Не адмаўляў аўтар ролі скандынаваў у развіцці старажытнарускай дзяржаўнасці.

З помнікаў мінулага найбольш цікавілі М. Балінскага абарончыя збудаванні, асабліва фартэцыі, пра якія ён сабраў шмат матэрыялу. Так, у М. Стрыйкоўскага ім запазычаны звесткі пра Гальшанскі замак [40]. Часта даследчык выкарыстоўваў вядомыя матэрыялы пра Лідскі замак з працы Т. Нарбута [41]. Для вывучэння помнікаў Смаргоні, Лоска, Крэва і некаторых іншых прыкметных у гістарычных адносінах мясцін М. Балінскі сам выязджаў на месца. Некаторыя ж краязнаўцы спецыяльна рыхтавалі матэрыялы для кнігі М. Балінскага. Так, над нарысам пра Нясвіж для «Старажытнай Польшчы» працаваў У. Сыракомля [42]. М. Балінскі адным з першых выявіў рэшткі тоўстых сцен феадальнага замка на востраве воз. Мястра, што поруч з Мядзелам [43].

М. І. Балінскаму належыць прыярытэт у адкрыцці некалькіх цікавых помнікаў. Так, едучы з Крэва ў Смаргонь, ён заўважыў за дзве вярсты ад Крэва гарадзішча, якое ўзвышалася над зямлёй. У вярсце ад гэтага гарадзішча М. І. Балінскі выявіў групу курганоў [44], хоць іх, як і гарадзішча, не раскопваў, а таму нічога канкрэтнага не мог сказаць. Ён напісаў падрабязную гістарычна-краязнаўчую даведку пра мяст. Лебедзева Вілейскага павета, аднак ні словам не абмовіўся аб мясцовых курганах, якія паўстагоддзем пазней прыкмеціў Ф. В. Пакроўскі [45].

Больш як праз 40 гадоў выйшла другое, папраўленае і дапоўненае выданне гэтай працы [46], у якім знаходзім паўнейшыя звесткі пра населеныя пункты і помнікі краю. Тут сустракаем новыя матэрыялы пра старажытныя збудаванні ў Ляхавічах, Слуцку, Быхаве, Пінску і іншых гарадах. М. І. Балінскі першым указаў на абарончае значэнне Жаберскага замка і паказаў яго непрыступнасць у час асады шведскімі войскамі Карла XII [47]. Даследчыкам правільна датавана закладка Ніжняга замка ў Полацку (пачатак XII ст.) [48]. У працы знаходзім гістарычныя даведкі пра Мінск, Брэст, Іўе, Відзы, Мядзел, Пружаны, Лоск, Валожын і іншыя гарады Беларусі. Ёсць і спрэчнае. Напрыклад, у адрозненне ад М. М. Карамзіна, Т. Я. Нарбута, А. К. Кіркора, К. П. Тышкевіча, якія лічылі, што Заслаўе закладзена князем Уладзімірам Святаславічам, М. І. Балінскі мяркуе, што пабудавана яно сынам Уладзіміра Ізяславам, хаця пазнейшыя гісторыкі схільны лічыць заснавальніцай Заслаўя князёўну Рагнеду Рагвалодаўну.

М. І. Балінскі напісаў таксама працу пра Крэва [49]. Аўтар падрабязна апісаў будову замка, прывёў запісы легенд, спыняўся на вузлавых момантах гісторыі Вялікага княства Літоўскага, а на яе фоне паказаў і мясцовыя падзеі. У прыватнасці, расказаў пра забойства Кейстута [50], пра унію і іншыя факты з мінулага гэтага горада-помніка.

У. Сыракомля цаніў М. І. Балінскага, бо той апублікаваў літаратурны помнік XVII ст. «Ліст да Абуховіча» [51], напісаны на «пінскім дыялекце» навагрудскім шляхціцам Цыпрыянам Камунякам [52].

Рамуальд Сымонавіч Зянькевіч (1811—1868), працуючы педагогам на Палессі, займаўся вывучэннем мясцовага фальклору і этнаграфіі. У «Атэнеуме» ён змясціў 219 беларускіх песень. Іх О. Кольберг уключыў



Р. С. Зянькевіч

у свой 52-гі том «Беларусь—Палессе»[53]. Поруч з беларускім арыгіналам Р. С. Зянькевіч даваў пераклад на польскую мову, што значна павышала навуковую вартасць гэтай працы. Асабліва вылучаў Р. С. Зянькевіч песні вясенняга цыкла, у прыватнасці фальклорна-этнаграфічнае свята «куста», якое бытуе з язычніцкіх часоў і захавалася да нашага часу толькі на Палессі.

У працы «Пра ўрочышчы і звычаі пінскага люду...» Р. С. Зянькевіч не абышоў увагай і помнікі археалогіі. Ён зафіксаваў над Ясельдай ля Сташанаў месца даўняга пабоішча, месцазнаходжанне гарадзішча і вал каля Турава, а ў навакольных лясах мноства курганоў і ўсе гэтыя аб'екты звязваў, паводле народных паданняў, з паходамі крыжаносцаў, асабліва так званую Авідыушаву Гару каля Кажан-Гарадка[54]. З гэтай колькасці выяўленых ім слядоў старажытнасці аўтар ніякіх навуковых вывадаў не зрабіў, апрача канстатацыі таго, што Палессе ў далёкія часы не абміналі гістарычныя падзеі. Для яго асноўным матэрыялам даследавання заставаўся фальклор. Асобныя раздзелы гэтай працы прысвечаны апісанню купалля, дажынак, вясельным абрадам, варажбе і інш. Р. С. Зянькевіч хоць сам быў родам са Свянцянскага павета Віленскай губ., аднак добра ведаў і гэты край, што адчувалася ў яго каментарыях.

У тлумачэнні да песні «Ой, у Слуцку на рыначку» Р. С. Зянькевіч піша, што «Слуцк — павятовы горад Мінскай губерні, вядомы ўсім фабрыкай залаталітых паясоў, за якія плацілі па некалькі сотняў рублёў...» Аўтар тут дае краязнаўчую даведку аб славутасці горада, якую запісаў ад непасрэдных стваральнікаў слуцкіх паясоў[55].

Забытай аказалася публікацыя Р. С. Зянькевіча «Аб курганах і гарадзішчах Ашмянскага павета»[56]. Будучы на Ашмяншчыне ў 1843 г., даследчык зацікавіўся мясцовымі археалагічнымі помнікамі. Ён карыстаўся звесткамі аратых, якія знаходзілі старажытныя рэчы. Не маючы магчымасці самому весці раскопкі з-за слабога зроку, Р. С. Зянькевіч зрабіў абмеры курганоў, гарадзішчаў, апісаў іх знешні выгляд, даў іх мясцовыя назвы і народныя легенды пра іх. Звесткі маюць прыблізны характар.

Р. С. Зянькевіч вывучаў Крэўскі замак, яго легенды пра так званыя «падземныя хады». Часткова матэрыялы Р. С. Зянькевіча пра Крэва выкарыстаў М. І. Балінскі ў сваёй працы «Старажытная Польшча».

Не ўсё напісанае Р. С. Зянькевічам дайшло да нас, некаторыя працы так і засталіся ў рукапісах»[57]. Навуковая дзейнасць даследчыка вялікага навуковага рэзанансу не мела, хаця на яго не раз спасылаліся вы-

чоныя, асабліва пры вывучэнні матэрыяльнай і духоўнай культуры Палесся.

У гісторыі беларускай археалогіі і антрапалогіі асобнае месца займае С. С. Куторга [58], які часта разам са сваім братам-гісторыкам М. С. Куторгам прыязджаў на Магілёўшчыну і вёў культурна-асветніцкую работу, вывучаў край. С. С. Куторга ў 1842 г. выявіў два чалавечыя чарапы і даследаваў іх. Так з'явілася першая ў Расіі публікацыя пра выкапнёвых людзей каменнага веку [59]. Такіх навуковых прац царква і цэнзура не прапускалі. С. С. Куторга змясціў свой артыкул у нямецкім часопісе [60].

Старажытныя помнікі паўночнай Беларусі вывучаў К. А. Гаворскі (1821—1871). Нарадзіўся ён у Кіеве ў сям'і свяшчэнніка-уніята, скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію, працаваў у Полацкай духоўнай семінарыі, выдаваў «Вестник Западной России», рэдагаваў неафіцыйную частку «Витебских губернских ведомостей». Апублікаваў шмат дакументаў, арыгіналы якіх пазней загінулі і якія маюць важнае значэнне для вывучэння мінулага Беларусі. У пачатку 1850-х гадоў пачаў раскопкі кurганоў каля Полацка і апісаў іх структуру. Аб даследаваннях К. Гаворскага ў Лепельскім павеце станоўча адгукнуўся А. М. Семянтоўскі [61].

У найбольш ранняй публікацыі К. Гаворскі апісаў старажытную, так званую Альгердаву дарогу з Вільні на Полацк [62], а таксама помнікі, якія траплялiся паабапал гэтай дарогі. Раскопваючы курганы, археалаг заўважыў незвычайную форму асобных гаршкоў, якія адрозніваліся ад тых, што былі знойдзены ля Полацка.

Адно з гарадзішчаў уздоўж Альгердавай дарогі археалаг выявіў у Начы-Шпакоўшчыне, на беразе Начы. З дапамогай мясцовага аматара старажытнасцей Алоіза Абрампальскага ён раскапаў некалькі кругападобных курганоў. У адным быў знойдзены шкілет чалавека і прасліца («кружочак»). Падыход К. Гаворскага да вывучэння курганных пахаванняў у Полацкай зямлі ацэнены Л. В. Аляксеевым [63]. Для спалення трупаў, меркаваў К. А. Гаворскі, спярша рабілі больш ці менш высокі земляны плоскі насып, на якім спальвалі нябожчыка, а спаленае потым засыпалі зямлёю.

Выявіўшы на былым гарадзішчы могільнік, К. Гаворскі зрабіў вывад, што ў часы хрысціянства тут ставілі цэрквы або рабілі могільнікі [64]. Сапраўды, хоць і не заўсёды, але такое здаралася, і даследчык тут меў рацыю.

Заслугоўваюць увагі яго паведамленні пра выяўленыя руіны замка [65] каля Дзісенскай дарогі, які быў абведзены земляным валам няправільнай формы, расцягнутым на вялікую адлегласць, пры гэтым было выкарыстана прыроднае ўзвышша, якое прымыкае да Рудзенскай гары. К. Гаворскі паведаміў таксама і пра развалiны каля Бельчыцкага манастыра, які меў у старажытнасці ўмацаванні [66]. У савецкі час гэтую думку пацвердзіў гісторык архітэктуры М. М. Воронін, які назваў будову «прыгараднай умацаванай княжацкай рэзідэнцыяй» [67].

К. Гаворскі імкнуўся ахапіць даследаваннямі ўсю тэрыторыю Полацкай зямлі. Ён шмат зрабіў, але, як адзначыў Л. В. Аляксееў, толькі частка яго спадчыны стала здабыткам навукі [68].

Прыватныя калекцыі таксама прыцягвалі ўвагу К. А. Гаворскага, і ён не ўпускаў любой магчымасці пазнаёміцца з імі. У маёнтку Антовіль Лепельскага павета ў Людвіка Корсака ён вывучаў матэрыялы былога Полацкага ваяводства [69].



Магілёўскія ўмацаванні. Акварэль І. Пешкі

Пра В. В. Турчыновіча захавалася мала звестак. Архіўныя пошукі нічога істотнага не далі. Вядома толькі, што аўтар першай гісторыі Беларусі[70] быў тытулярным саветнікам і, як ён сам пісаў, «уваходзіў у склад Магілёўскага шляхецкага таварыства. Дэпутат»[71].

Выдадзеная В. В. Турчыновічам кніга не вызначалася навізной зместу. Па карэнных пытаннях гістарычнага працэсу на Беларусі ён заставаўся ў палоне думак-гіпотэз вядомага Т. Я. Нарбута, на якога зрабіў каля 70—80% спасылак. Своеасаблівае ў яго было разуменне і тэрыторыі Беларусі: Дуброўну, Оршу, Друцк, Барысаў называў літоўскімі гарадамі. Гэта не адзіны выпадак яго блытаніны.

На мяжы Літвы, Латвіі і Беларусі вёў археалагічныя раскопкі сельскі ўрач І. Брандт (1812—1856). У публікацыі пра старажытныя могільнікі Віцебскай і Пскоўскай губерняў[72] ім апісаны два тыпы пахаванняў. І. Брандт зрабіў вывад аб прыналежнасці тутэйшых магіл двум племянным групам — літоўска-латышскай і славянскай. Вывады даследчыка аб узаемаўплывах старажытных культур не беспадстаўныя. Гэты парубежны раён і зараз захоўвае сваю стракатасць абрадаў[73]. Тут адбіліся гістарычна даўнія сувязі паміж Латвіяй, Латгаліяй і Беларуссю, аб чым сведчаць археагеалагічныя матэрыялы[74].

Беларускаму краязнаўству, а таксама гісторыі архітэктуры, зрабілі паслугу мясцовыя мастакі. Міхал Кулеша (1800—1863)[75], напрыклад, са сваіх падарожжаў прывозіў малюнкі архітэктурных і археалагічных помнікаў у Лідзе, Навагрудку, Пінску, з ваколіц Лунінца і іншых мясцін. Ён быў шчырым прыхільнікам аховы і вывучэння даўніны. Прагрэсіўныя погляды прывялі яго ў таварыства філарэтаў і філаматаў. У 1843—1853 гг. М. Кулеша здружыўся з І. Крашэўскім і пад яго ўплывам глыбей зацікавіўся помнікамі даўняй гісторыі. Выконваючы графічныя работы для Пецярбургскага археалагічнага таварыства, ён збіраў матэрыялы краязнаўчага характару.

Такім жа назіральным і дакладным у перадачы на мастацкіх палотнах помнікаў мінулых вякоў быў Іосіф Пешка (1767—1831) — прадстаўнік акадэмічнага класіцызму. Ён паходзіў з Кракава, але жыў у Вільні, Мінску, Віцебску і іншых беларускіх гарадах, і гэта паўплывала на яго творчае захапленне. У акварэлях І. Пешкі знайшлі адлюстраванне віды Віцебска (12 работ), Магілёва (3), Гродна (2), Мінска, Няс-

віжа, Ліды, Навагрудка, Смалян, Лошыцы (пад Мінскам), Любчы (па 1). Гэта толькі тыя акварэлі, якія захаваліся ў Львове[76].

Аўтарам шматлікіх малюнкаў Мінска, Свіслачы, Гродна, Асвеі, Крэва, Навагрудка, Магілёва, Гомеля, Белай вежы ў Камянцы, Міра, Нясвіжа, Ліды і іншых памятных мясцін з'яўляецца Напалеон Орда[77]. Яго малюнкі рэалістычныя.

Найбольшы ўплыў на станаўленне і развіццё беларускага гістарычнага краязнаўства і археалогіі ў другой трэці XIX ст. зрабілі Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы, Адам Кіркор, Уладзіслаў Сыракомля, Міхаіл Шпілеўскі і інш.

### Я. П. ТЫШКЕВІЧ (1814—1873)

Археолаг, фалькларыст і краязнавец Я. П. Тышкевіч нарадзіўся ў Лагойску ў памешчыцкай сям'і. Яго бацька Пій Феліцыянавіч цікавіўся археалогіяй і краязнаўствам. Яўстафій скончыў Мінскую гімназію, пасля чаго выехаў у Пецярбург і служыў там у ордэнскім капітуле пры сенаце. Служба ў сталіцы дала яму магчымасць шырока карыстацца публічнай бібліятэкай, у якой ён выявіў шмат каштоўных матэрыялаў па гісторыі Беларусі. З Пецярбурга Я. П. Тышкевіч перавёўся ў Вільню, у апарат губернскага праўлення. У такім жа ведамстве ён працаваў у Харкаве і Мінску, пакуль у 1842 г. не пайшоў у адстаўку. У 1848—1854 гг. Я. П. Тышкевіч быў куратарам Мінскай гімназіі. Тады ж увялі яго ў склад камісіі па збору і публікацыі даўніх актаў і прывілеяў, што захоўваліся ў архівах і манастырах Мінскай губ. Вынікам дзейнасці гэтай камісіі стаў археалагічны зборнік дакументаў[1]. І як зазначае М. М. Улашчык, пры ажыццяўленні гэтага выдання адной з найбольш кампетэнтных асоб быў Я. П. Тышкевіч[2]. Кожны год яго жыцця быў насычаны навукова-даследчыцкай дзейнасцю, на патрэбы навукі, збор экспанатаў, арганізацыю і правядзенне экспедыцый ён выдаткаваў усё багацце, на старасці гадоў застаўся без сродкаў на існаванне.

Рана пачаў ён займацца археалагічнымі раскопкамі. Аб усім Я. Тышкевіч пісаў нават і тады, калі яшчэ не ўмеў рабіць ні абагульненняў, ні вывадаў, як, напрыклад, у публікацыі «Позірк на крыніцы мясцовай археалогіі...»[3] Гэта работа эскізная, паколькі «дасканалае выкананне,— прызнаваўся аўтар,— патрабуе шмат часу, клопатаў і велізарнай працы».

Больш вартаснай з пункту гледжання археалагічнай навукі з'явілася новая работа «Аб старажытных магілах у Мінскай губерні і Літве»[4]. Я. Тышкевіч, жадаючы грунтоўней вывучыць археалагічныя аб'екты, ішоў на пераадоленне забабонаў сялян. Для іх курганы з'яўляліся амаль святыняй і лічыліся недатыкальнымі. Ні адзін курган, нават выпадкова, не быў імі раскапаны ці наўмысна пашкоджаны. Вядома, і гэтыя акалічнасці трэба было ўлічваць археолагам XIX ст. «Я павінен быў шчодра сыпаць грошы сялянам і разам з імі працаваць,— прызнаваўся Я. Тышкевіч,— каб толькі ўзяць на сябе грэх. Нарэшце... адзін з вялікіх курганоў быў мною раскапаны»[5]. Былі выяўлены жаночыя ўпрыгожанні. Археолаг тлумачыў, што яны трапілі на Міншчыну шляхам гандлёвых абменаў.

Ён прасачыў абрад пахавання, пры якім целы нябожчыкаў спальвалі, а попел разам са слязніцамі закопвалі. Як вызначыў Я. Тышкевіч, «на шыі было сем буйных пацерак, з якіх дзве каралавыя, гранёныя, іншыя шкляныя; каля правага пляча вялікае кальцо з вітага срэб-



Я. П. Тышкевіч

ра далікатнай работы для падтрымання драпіроўкі сукенкі» [6]. У адным з курганоў археолаг заўважыў, што «на макаўцы галавы, дзе́ заплятаецца каса, меўся срэбраны абадок, які быў звіты ў некалькі кружкоў, і побач ляжалі рассыпаныя 131 пацерка, але невядома, ці яны з шыі, ці імі была расшыта сукенка». Я. Тышкевіч робіць вывад аб багацці мясцовых курганных пахаванняў, аб высокім мастацтве вырабу ўпрыгожанняў. Далей аўтар публікацыі адзначыў, што не ўсюды звычай пахавання быў аднолькавы, бо знаходзіў і няспаленыя астанкі. Ён думаў, што «магілы (курганы.— *Г. К.*) гэтыя насыпаны тады, калі ўжо спыніўся абрад спальвання целаў, г. зн. у пачатку ўвядзення хрысціянства» [7]. Развіваючы гэтую думку, Я. Тышкевіч піша, што сасуды ў галовах былі ў якасці «слязніц», а «вуголле клалі пад цела толькі для захавання іх» [8]. Думка археолага пра час спынення пахавання курганным спосабам, якую ён выказаў яшчэ ў першай палове XIX ст., заслугоўвала ўвагі як новая, больш пэўная.

Пазней, зрабіўшы паездку з навуковымі мэтамі па краінах Еўропы, Я. Тышкевіч у адрозненне ад З. Даленгі-Хадакоўскага зазначыў, што курганы ёсць усюды, толькі яны маюць розныя назвы. Я. Тышкевіч прыкмеціў, што курганы, напрыклад у Ірландыі, выконваюць яшчэ ролю месца ахвярапрынашэння, чаго ён не мог сказаць аб мясцовых помніках гэтага роду, якія «на Русі Літоўскай называюцца валатоўкамі» [9].

Вывучыўшы вялікую колькасць курганоў на Беларусі, вучоны звярнуў увагу на вырабы з металу. Праводзячы класіфікацыю металічных рэчаў, Я. Тышкевіч зрабіў правільны вывад, што сплаў бронзы быў вядомы старажытным жыхарам Беларусі раней, чым жалеза [10].

Вывучаючы пахавальны інвентар крывіцкіх курганоў, Я. Тышкевіч першы ўказаў на іх асаблівасць — скроневыя кольцы ў жанчын. Спосаб вызначэння па форме скроневага кальца тэрыторыі засялення крывіцкіх плямёнаў унікальны для свайго часу. Гэта адкрыццё беларускаму вучонаму ўдалося зрабіць дзякуючы параўнальна-тыпалагічнаму метаду. Гіпотэза даследчыка ў далейшым распрацоўвалася і ўзбагачалася новымі данымі ў працах А. А. Спіцына [11], а яшчэ пазней А. У. Арцыхоўскага [12], В. П. Левашовай [13].

Больш багатыя, чым пад Мінскам, знаходкі ў курганах ля Заходняй Дзвіны далі Я. Тышкевічу падставу сцвярджаць, што жыхароў Падзвіння звязваў гандаль з аддаленымі землямі [14], дзе рамяство стаяла на больш высокім узроўні. Яшчэ да ўтварэння Вялікага княства Літоўскага насельніцтва Беларусі, як падкрэсліваў археолаг, не толькі забяспечыла сябе жалезам сваёй вытворчасці, але і вывозіла яго [15]. Ён вёў раскопкі і ў іншых раёнах Беларусі. У курганах пад Слуцкам ён выявіў

жаночыя ўпрыгожанні. На жаль, слаба ім апісаны інвентар 30 курганоў на р. Гайна. Я. Тышкевіч на матэрыялах сваіх жа раскопак даказаў, што ў старажытных жыхароў краю, а таксама Літвы, Жмудзі і Інфлянтаў, не было адсталасці ў вырабе бытавых прадметаў і прылад працы, а значыць, і не было варварства. Як доказ ён прыводзіў мноства знаходак з металаў [16]. Гэты тэзіс і на сённяшні дзень да канца не высветлены і ставіцца некаторымі даследчыкамі пад сумненне. А. Р. Мітрафанаў не лічыць «варварства славян» такім ужо страшным злом у эпоху ваеннай дэмакратыі.

Я. Тышкевіч стаяў ля вытокаў статыстычнага метаду параўнання, які аказаўся для яго паспяховым і які даў магчымасць падлічыць багатыя і бедныя курганныя пахаванні [17]. Ён зрабіў вывад аб сацыяльнай няроўнасці ў старажытным грамадстве. Багатыя курганы належалі «славутаму роду, бо знойдзеныя намі ўпрыгожанні ў старажытныя часы вельмі дорага каштавалі, асабліва пацеркі...» [18]

Вывучаючы пахавальны і іншыя абрады славян і іх суседзяў — літоўцаў, латышоў, Я. Тышкевіч прыйшоў да вываду пра іх блізкасць. Яны, напрыклад, пакланяліся аднаму богу Перуну, вужакам, магутным старым дрэвам. У тых і другіх пры пахаванні ставілі нябожчыку посуд і клалі прылады працы. Доўга захоўваўся язычніцкі абрад трупаспалення. Вучоны лічыў, што па лагойскіх курганах славян можна прасачыць падабенства з балцкімі насельнікамі, а паколькі яны тэрытарыяльна знаходзіліся непадалёк адны ад другіх, то і мелі сувязі, хаця гэтыя плямёны былі рознага паходжання [19]. Гэта думка Я. Тышкевіча была новай для яго часу, пазнейшыя археалагічныя раскопкі падмацавалі яе, сёння яе прытрымліваецца нямала вучоных. Так, А. Р. Мітрафанаў лічыць, што ў сярэдняй Беларусі была распаўсюджана балцкая культура, але яна знаходзілася пад вялікім уплывам славян [20].

Я. Тышкевіча цікавілі таксама і гарадзішчы. Саму назву археалагічнага помніка ён лічыў славянскай, бо на Жмудзі такіх назваў не сустракаў. Там ёсць слова pilcalnis, якое абазначае «насыпаная гара». Аднак, як адзначае даследчык, на тэрыторыі «губерняў Беларусі» [21], Мінскай, часткі Гродзенскай, Віленскай іх было мноства..., а назвы вёсак і ўрочышч пачынаюцца словамі Гарадок, Гарадзішча, Гарадзец, Гародна і г. д.» [22]. Я. Тышкевіч, як З. Даленга-Хадакоўскі, лічыў, што гарадзішчы не з'яўляюцца абарончымі ўмацаваннямі, а толькі абрадавымі.

Я. Тышкевіч, як і Р. Друцкі-Падбярэзскі, звярнуў увагу на замкі як на ўмацаваныя аб'екты, абведзеныя каналамі і валамі. Ён назваў старажытныя замкі ў Мінску, Слуцку, Друцку, Заслаўі, Лагойску і іншых месцах, коратка расказаў пра іх. Тлумачыў паходжанне тэрміна «замак» ад «замыкаць». Да больш позніх адносіў замкі ў Лідзе, Крэве, Гальшанах, Міры, якія па сваёй будове блізкія да замкаў Заходняй Еўропы. Вучоны меркаваў, што іх маглі будаваць рамеснікі з Германіі або з суседняй Польшчы, але мясцовыя ўмельцы і самі маглі асвоіць еўрапейскае замкавае дойлідства.

Археолаг упершыню даў дэталёвае апісанне каменных сякер, молатаў, булаў, кліноў і г. д. У дадатку да кнігі змешчаны малюнкі знаходак. Археалогію ён дзяліў на чатыры часткі: уласна археалогія, нумізматыка, гліптыка, палеаграфія. Цяжка сёння згадзіцца з такім падзелам, бо ў прадмет археалогіі як навукі ён уключыў, напрыклад, вывучэнне летапісцаў. Хаця агульнавядома, што археолагі ў сваёй практычнай дзейнасці не раз бяруць у рукі летапісныя крыніцы. У цэлым жа гэта сфера археаграфіі. Такі падзел Я. Тышкевічам археалогіі ў наву-



Археалагічныя знаходкі Я. П. Тышкевіча

ковай сістэме польскі археолаг А. Абрамовіч лічыць банальным і канвенцыяльным [23]. Я. Тышкевіч бачыў у пашырэнні археалагічных даследаванняў перспектыву адкрыццяў, вялікую будучыню навукі, хоць пакуль што яна не мае такіх довадаў, як іншыя дысцыпліны, паколькі многае тут будуецца на здагадках і гіпотэзах. У археалогіі гэта першыя крокі [24].

У сваёй навуковай дзейнасці Я. Тышкевіч трымаў у полі зроку даследаванні археолагаў і краязнаўцаў суседніх народаў. Ён адзіны з беларускіх археолагаў першай паловы XIX ст., хто адправіўся за мяжу да сваіх калег па вопыт, пабываў у музеях розных краін. Асаблівую цікавасць у яго выклікалі матэрыялы Капенгагенскага музея старажытнасці, у якім у кожнай з трох залаў падкрэслена бачыўся адпаведны падзел па трох эпохах: каменя, бронзы, жалеза. У гэтым была заслуга вядомага археолага К. Томсена. Сам метад экспанавання ў музеі археалагічных матэрыялаў настолькі аказаўся арыгінальным і прыцягальным, што Я. Тышкевіч перанёс яго і ў свой лагойскі музей, а пазней — і ў Віленскі музей старажытнасцей [25].

Вывучаючы скандынаўскую археалогію, Я. Тышкевіч знайшоў у ёй шмат падабенства са славянскай. Так, у прыладах працы паўночных плямён ён беспамылкова заўважыў, што спачатку выкарыстоўвалася бронза, а пазней жалеза [26]— як і ў славян. Захапіўшыся разглядам падабенства прадметаў, Я. Тышкевіч вельмі мала сказаў пра іх адрозненне.

Я. Тышкевіч не раз звяртаўся і да збору беларускіх помнікаў пісьмен-

ства. Акрамя збору і выдання старадаўніх грамат і актаў [27] Я. Тышкевіч выдаваў знойдзеныя ім мемуары [28]. Даследчык выдаў гадавік для археолагаў, нумізматаў і бібліёграфаў [29].

Я. Тышкевіч быў захоплены вывучэннем краю, асабліва знаёмага з дзяцінства Барысаўскага павета [30]. З дапамогай краязнаўцаў-актывістаў К. Адамовіча, П. Чачота, М. Чарноцкага, Ф. Чаховіча, В. Твардоўскага, Я. Ваньковіча, Ю. Тышкевіча, К. Тышынскага, В. Гарноўскага і іншых даследчыкаў стварыў грунтоўнае для таго часу комплекснае апісанне Барысава і Барысаўскага павета [31]. Метад збору звестак для гэтай кнігі не быў новым, але была новай сама форма падачы матэрыялаў. Мусіць, таму з поля зроку даследчыка не выпалі этнаграфічныя і лінгвістычныя матэрыялы, помнікі старажытнасці краю. Ён апісаў хроніку гістарычных падзей Барысава, Лагойска і іншых найбольш значных населеных пунктаў павета. Прывёў погляды Т. Нарбута і І. Данілевіча на першую дату ўпамінання Барысава ў пісьмовых крыніцах, але сам назваў 1199 г., пагадзіўшыся з Т. Нарбутам, хоць у сваёй працы Я. Тышкевіч прыводзіць і іншыя даты — 1102, 1127 (1128). Менавіта на дату 1127 (1128), якая ўзята з вядомай працы В. М. Тацішчава, і належала б звярнуць больш пільную ўвагу. Яна пасля доўгіх дыскусій прынята сёння гістарычнай навукай [32]. Спаслаўшыся на працу А. Нарушэвіча [33], Я. Тышкевіч апісаў Барысаўскі замак. Драўляны замак дастаяў да сярэдзіны XIX ст.[34]

Як і Р. Друцкі-Падбярэзскі, ён правільна арыентаваўся ў вызначэнні месцазнаходжання старажытнага горада, указаўшы, што ранні Стара-Барысаў быў аддалены ад сучаснага горада Барысава на чатыры вярсты [35]. Думку Я. Тышкевіча пацвердзіў сваімі раскопкамі археолаг Г. В. Штыхаў, які даказаў, што Барысаў зараджаўся там, дзе зараз сядзіба саўгаса «Стара-Барысаў» [36]. І. Я. Тышкевіч і пазнейшыя даследчыкі гісторыі гэтага горада лічаць паходжанне назвы па імені князя Барыса, хаця М. А. Ткачоў прапанаваў слушную гіпотэзу, што назва горада пайшла ад назвы р. Барысы, якая існавала ў раннім сярэднявеччы і пазней знікла, застаўшыся толькі на ранейшых аксанаметрычных картах. Я. Тышкевіч падрабязна расказаў пра мясцовыя княжацкія дынастыі, якія ўладалі Барысавам, апісаў некаторыя гістарычныя падзеі, што адбыліся ў межах Лагойскага графства.

Сляды жыцця славянскіх плямёнаў Я. Тышкевіч бачыў усюды: у тапаніміцы, у помніках археалогіі, фальклоры, этнаграфіі. У гэтай рабоце ён задумваўся над загадкамі «валатовак» — старадаўніх магіл ці курганоў, якія так называліся не толькі ў Барысаўскім павеце, але і на Віцебшчыне і на поўначы Магілёўшчыны. Першымі такімі назвамі, што бытуюць каля Полацка, зацікавіўся З. Даленга-Хадакоўскі. Я. Тышкевіч жа звязвае з імі паходжанне тапонімаў Вяляцічы, Вяляты, Волатава Магіла, Валатоўская Слабада і г. д. Нават у песні, што бытавала ў Вяляціцкім старостве Барысаўскага павета, ёсць выраз «Цераз валатоўкі».

У кнізе пра Барысаўскі павет знаходзім звесткі пра лагойскі музей, матэрыяламі якога карысталіся не толькі Тышкевічы, іншыя вучоныя і пісьменнікі. Так, І. Крашэўскі працаваў тут над манаграфіяй, прысвечанай старажытнаму мастацтву. Акрамя выпадковых рэчаў былі ў Лагойску і сістэматызаваныя калекцыі, было шмат матэрыялаў археалагічных раскопак. Абодва Тышкевічы імкнуліся даваць кожнай знаходцы навуковае тлумачэнне. Але не ўсё ў навуковых характарыстыках прадметаў было бездакорным.

У гэтай жа кнізе Я. П. Тышкевічам дадзены гістарычныя звесткі пра Смалявічы, Зембін, Плешчаніцы і інш.[37]. Нарыс пра Лагойск, як і пра Барысаў, займае ў кнізе адметнае месца, аўтарства належыць не Я. Тышкевічу, а яго брату Канстанціну Тышкевічу [38].

Праца Я. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета» па заслугах ацэнена Я. Ф. Карскім [39], А. М. Пыпіным [40] і інш. Н. С. Гілевіч этнаграфічную частку работы назваў адным з лепшых дасягненняў у даследаванні быту і творчасці беларускага сялянства [41].

Выказаныя Я. Тышкевічам арыгінальныя навуковыя думкі па пытаннях даследавання курганоў, гарадзішчаў, некаторых старажытнабеларускіх гарадоў, а таксама закранутыя ім упершыню праблемы вывучэння помнікаў каменнага веку варты таго, каб яго імя заняло пачэснае месца ў гісторыі айчыннай археалогіі.

Я. Тышкевіч быў прызнаным вучоным свайго часу. Сучаснікі яго абралі членам-карэспандэнтам Пецярбургскага археалагічна-нумізматычнага таварыства, ганаровым членам Пецярбургскай і Стакгольмскай акадэмій навук, Лонданскага археалагічнага інстытута. Ён быў заснавальнікам і старшынёй Віленскай археалагічнай камісіі, а таксама Віленскага музея старажытнасцей.

## К. П. ТЫШКЕВІЧ (1806—1863)

Археолаг, гісторык, этнограф, краязнавец, стваральнік музеяў у Лагойску і Вільні Канстанцін Піевіч Тышкевіч нарадзіўся таксама ў Лагойску ў той жа сям'і этнографа і археолага Пія Тышкевіча. Выпускнік Віленскага універсітэта К. Тышкевіч на працягу васьмі гадоў (1828—1836) працаваў фінансавым чыноўнікам у Варшаве, а пасля вярнуўся ў Лагойск і прысвяціў сябе вывучэнню краю. Пры падтрымцы бацькі і малодшага брата Яўстафія ён стаў стваральнікам тут музея, пры якім знаходзіліся архіў старажытных рукапісаў, бібліятэка з вялікай колькасцю рэдкіх кніг. Даследаваў курганы, гарадзішчы, замчышчы Мінскай губ.

Першую публікацыю [1] К. Тышкевіч прысвяціў характарыстыцы стану агульнаеўрапейскай археалогіі, у тым ліку ў Расіі, на Украіне, у Польшчы, і паказаў на гэтым фоне дасягненні мясцовых аматараў вывучэння старажытнай матэрыяльнай культуры.

У гэтай жа працы К. Тышкевіч са спасылкай на А. Нарушэвіча, М. Карамзіна, У. Сыракомлю, на хронікі М. Стрыйкоўскага і М. Бельскага падае гісторыю Лагойска, яго старажытнага замка [2]. Археалагічным аб'ектам ён лічыў і Паненскую Гару ў Лагойску, на якой у дахрысціянскія часы адбываліся язычніцкія абрады.

Важнейшай жа работай К. Тышкевіча з'яўляецца яго манаграфія «Пра курганы ў Літве і Заходняй Русі» [3]. Праца першапачаткова друкавалася ў «Виленском вестнике» ў 1864 г., але яе працяг быў спынены па загаду «зверху», паколькі яна прайшла міма канцылярыі Мураўёва. К. Тышкевіч рабіў захады, каб сваю працу выпусціць поўнасцю. Пераканаўшыся, што гэта яму не ўдасца, аўтар у снежні 1865 г. надрукаваў для сябе 200 экземпляраў.

Даследчык разгледзеў шматлікія віды археалагічных аб'ектаў, якія яму траплялі на тэрыторыі Беларусі і якія ў яго публікацыях праходзілі пад рознымі тэрмінамі: умацаваныя замкі, ахвяравальныя гарадзішчы, акопныя судзілішчы, межавыя замкі і курганы (тумулюсы), і засяродзіў увагу на вывучэнні апошніх.



К. П. Тышкевіч

Манаграфія «Пра курганы ў Літве і Заходняй Русі» пераклікаецца з работамі Я. Тышкевіча. Як адзін, так і другі археолагі думалі пра загадкавы абрад трупаспалення ў старажытнасці, прызначэнне каменных сякераў. К. Тышкевіч сваімі раскопкамі пацвердзіў, што ў эпоху каменя каменныя сякеры выкарыстоўваліся перш за ўсё як прылады працы, а ў пазнейшы час як рытуальны прадмет пры пахаванні. Як і брат Яўстафій, К. Тышкевіч поўнасцю падзяляў тэорыю датчаніна К. Томсена аб трох археалагічных эпохах. Аднак К. Тышкевіч у сваіх археалагічных гіпотэзах пайшоў далей і заняўся разгадкай спосабу насадкі і ўжывання каменных прылад працы. Археолаг зацікавіўся больш падрабязней інвентаром курганоў, ён з упэўненасцю гаварыў пра магчымасць узаемаўплываў рымскай і славянскай цывілізацыі» [4].

К. Тышкевіч паклаў пачатак вывучэнню старажытных гарадоў Лагойска, Заслаўя [5], іх старадаўняга будаўніцтва.

Упершыню ў археалагічную практыку на Беларусі К. Тышкевіч увёў складанне тапаграфічных планаў замкаў і гарадзішчаў. Так, ім былі зроблены планы замкаў у Заслаўі, Чашніках, Уле, Біржах, Лагойску, Рудніку, Свідне, Дабрынёве, Баравым Млынку, Сукромне (акрамя першых чатырох, астатнія знаходзяцца ў межах былых уладанняў Тышкевічаў.— *Г. К.*) [6]. Навуковая каштоўнасць такіх картаграфічных планаў відавочная, паколькі фіксуецца стан помнікаў да раскопак і пасля, як гэта бачым на прыкладзе Лагойска і Заслаўя [7]. Аўтар падмацоўвае свае назіранні малюнкамі аб'ектаў. Гэты метад К. Тышкевіча быў падхоплены іншымі археолагамі, у прыватнасці, гэта рабілі А. Кіркор, У. Сыракомля. Пазней здымкі планаў сталі проста неабходнымі пры раскопках. Такія спробы фіксацыі помнікаў першым на Беларусі рабіў і З. Даленга-Хадакоўскі, але яго здымкі-планы больш чым на стагоддзе былі пахаваны ў архіве. З метадычных навінак братоў Я. і К. Тышкевічаў адзначым вядзенне імі дзённікавых запісаў, якія пасля выкарыстоўваліся, як аснова для напісання навуковых работ.

Калі курганы археолаг упэўнена называў старадаўнімі пахаваннямі, то пра гарадзішчы ён такой яснасці не меў, хоць называў іх месцамі абарончымі і месцамі, дзе выконваліся розныя абрады [8].

Як археолаг-практык К. Тышкевіч прытрымліваўся сваёй методыкі раскопак: здымаў зверху «пласт за пластом, пачынаючы з аднаго боку» [9]. Пазней ён зразумеў, што ў гэтым спосабе ёсць шмат нязручнасцей, і прыняў метад А. Кіркора — весці раскопкі кургана траншэйным спосабам «ад верху да нізу ў форме крыжа» [10].

У пахавальным інвентары курганоў К. Тышкевіч заўважыў розніцу

ва ўборах дзяўчат і замужніх жанчын [11]. Раскопваючы і вывучаючы мужчынскія пахаванні на Вілейшчыне і на Жмудзі, ён зрабіў вывад, што апошнія багацейшыя, аднак як у адных, так і ў другіх «золата і дарагіх рэчаў мала» [12]. Гэта назіранне К. Тышкевіча вельмі цікавае і не страціла сваёй важнасці і на сённяшні дзень.

Археолаг вёў раскопкі не толькі курганоў. Ім было даследавана селішча Чырвоны Бор пад Лагойскам, дзе ён знайшоў дарагія прадметы з розных металаў і асабліва каштоўныя ўпрыгожанні з эмалі. Гэтыя матэрыялы выявіў Л. Д. ПОбаль у Польшчы [13]. К. Тышкевіч не проста апісаў свае знаходкі, а прадставіў у выглядзе табліц [14], якія і зараз даюць магчымасць лягчэй уявіць разнастайнасць і каштоўнасць упрыгожанняў з бронзы, эмалі, срэбра.

Упершыню матэрыялы археалагічных раскопак у выглядзе спецыяльна прыгатаванага ілюстраванага для гэтай мэты альбома знаходак прадстаўлены К. Тышкевічам на выстаўцы ў Маскве [15]. Сюды ўключаны матэрыялы не толькі К. Тышкевіча, але і іншых яго сучаснікаў. Аўтар альбома як удзельнік выстаўкі быў выбраны ганаровым членам Маскоўскага археалагічнага таварыства. Ёсць некаторыя звесткі пра «Атлас старажытных гарадзішчаў, замкавых гораў і скопішчаў на Літве і Літоўскай Русі», які быў прадстаўлены ў Археалагічнае таварыства ў 1859 г. Ён таксама складзены К. Тышкевічам [16]. Выпадковая знаходка свінцовых клеймаў у р. Заходні Буг жыхаром Драгічына М. Амбражэўскім стала для археолага прадметам даследавання [17]. На думку К. Тышкевіча, недалёка ад Драгічына да пачатку XII ст. праходзіла яцвяжская граніца. Гісторык І. Лялевель адмаўляў гэта, бо да зараджэння Польшчы яцвягі займалі меншую тэрыторыю. На жаль, і сённяшнія вучоныя яшчэ не прыйшлі да адзінай думкі аб арэале яцвяжскіх плямёнаў, спрэчным застаецца рассяленне іх у наваколлі Драгічына [18]. К. Тышкевіч спасылаўся на публікацыю А. Нарушэвіча [19], сцвярджаў, што невядомыя клеймы маглі належаць яцвягам і што гэтыя плямёны жылі ў басейне Заходняга Буга. Чэшскі археолаг К. Зап бачыў у знойдзеных свінцовых клеймах тамгі, або таможныя клеймы. Англійскі вучоны Скурс выказаў здагадку, што драгічынскія знаходкі з'яўляюцца брытанскімі або рымскімі клеймамі да таварных цюкоў. К. Тышкевіч не падзяляў такіх думак і сцвярджаў, што ў той час таможаннага парадку не існавала. Ён лічыў іх знакамі, якія адлюстроўвалі міфічныя павер'і, пры гэтым звяртаў увагу на іх форму — круг, які сімвалізуе вечнасць, а круг у спалучэнні з крыжам быў падобны на міфічны ключ. Свае здагадкі вучоны будаваў на падабенстве з блізкімі па форме адлюстраваннямі па ахвярных гаршчочках, якія яму траплялiся пры раскопках курганоў. Гэтыя схематычныя малюнкі археолаг лічыў толькі сімваламі. Спрэчкі аб прызначэнні свінцовых адбіткаў не скончыліся і працягваюцца да сённяшняга дня [20].

Як краязнавец К. П. Тышкевіч збіраў звесткі па гісторыі Лагойска, Астрашыцкага Гарадка і іншых населеных пунктаў, але найважнейшай працай у гэтым плане з'яўляецца «Вілія і яе берагі» [21], якую ён завяршыў у 1858 г. (выйшла ў свет у 1871 г.). Кніга аздоблена графічнымі малюнкамі Артура Бартэльса [22], якія ён выканаў з натуры ў час сумеснага падарожжа па Віліі, што робіць гэту манаграфію яшчэ больш каштоўнай. Ва ўступе, напісаным І. Крашэўскім, даецца характарыстыка навуковай дзейнасці К. П. Тышкевіча. «Быў, ён не якім-небудзь дылетантам, які забаўляўся старымі цацкамі, а даследчыкам, які дбайна шукаў на месцы сляды гісторыі, раскопваючы курганы, гарадзішчы...» [23]

Ён быў звязаны з навуковымі таварыствамі ў Празе, Парыжы, Маскве, Кракаве, Вільні. І. Крашэўскі пісаў, што К. Тышкевіч памёр у самым разгары навуковай дзейнасці, збіраючы матэрыялы для новых прац, «смерць яго застала на загоне, за плугам». Лагойскія скарбы знаходак і архіў вучонага дасталіся яго сыну Аскару Тышкевічу.

Пры рабоце над манаграфіяй «Вілія і яе берагі» К. Тышкевіч выкарыстаў вопыт апісання Дуная, Рэйна, Тэмзы, а таксама вопыт мясцовых краязнаўцаў М. Борха [24], І. Ходзькі [25], С. Мураўскага [26]. Была яму знаёма і неапублікаваная праца па гідраграфіі рэк Беларусі і Літвы Дамініка Ходзькі [27], рукапіс якой знаходзіўся ў Віленскай археалагічнай камісіі [28]. Перад тым як адправіцца ў падарожжа па Віліі, даследчык прасіў сваіх знаёмых прысылаць звесткі па гісторыі мястэчак, пра помнікі даўніны [29].



Камень на беразе Віліі. Малюнак К. П. Тышкевіча

У час падарожжа ад вытокаў Віліі да ўпадзення яе ў Нёман К. Тышкевіч пабываў у 295 вёсках і мястэчках [30]. Аўтар апісаў найбольш цікавыя прыбярэжныя мясціны, скарыстаўшы звесткі з археалогіі, этнаграфіі, фальклору, тапанімікі і г. д.

Недалёка ад Смаргоні, у Вуглянах, К. Тышкевічу трапіліся некаторыя археалагічныя знаходкі з курганоў — жаночыя ўпрыгожанні. Даследчык зрабіў малюнкі гэтых знаходак [31]. Ён падрабязна апісаў старадаўняе гарадзішча каля р. Быстрыцы, ля хутара Лінаморгі, якое мясцовыя людзі называюць «Замкаўшчына».

Даследчык асабліва значэнне надаваў фальклору ў жыцці і гісторыі кожнага народа. Ён красамоўна засведчыў значнасць фальклору для краязнаўства: «Песня народная была літаратурай народа, як паданні і легенды былі першай яго гісторыяй» [32]. У доказ багацця і разнастайнасці беларускага фальклору ў надвіленскім краі К. Тышкевіч даў шмат узораў песень, якія могуць стаць прадметам даследавання не толькі фалькларыстаў, але і археолагаў.

Шмат месца занялі ў манаграфіі К. Тышкевіча помнікі старажытнай архітэктуры: замкі, цэрквы, касцёлы і іншыя збудаванні. Некаторыя з гэтых архітэктурных помнікаў замаляваў мастак А. Бартэльс. Шмат матэрыялаў знаходзім па этнаграфіі краю, што робіць кнігу яшчэ больш каштоўнай, сапраўды краязнаўчай. Нават заняткі па рыбалоўству на р. Віліі К. Тышкевіч спрабаваў разгледзець у гістарычным аспекце [33].

Антыкварныя зборы К. Тышкевіча, як і амаль усіх астатніх беларускіх археолагаў XIX ст., расплыліся за межы сучаснай Беларусі і аселі

ў іншых музеях і нават трапілі ў прыватныя калекцыі аматараў старажытнасці. Так, напрыклад, частка вядомага чырвонаборскага скарбу, які К. Тышкевічам выяўлены ў 1865 г. на зарубінецкім селішчы пад Лагойскам, знаходзіцца зараз у Вільнюскім гісторыка-этнаграфічным музеі АН Літоўскай ССР, другая частка — у Варшаўскім музеі археалогіі, а частка — у Палангскім музеі бурштыну, якім у канцы XIX ст. уладаў Фелікс Тышкевіч. Калекцыя пацерак, як і іншыя прадметы з курганоў ля в. Відагошча Мінскага павета, выяўленыя К. Тышкевічам у 1862 годзе, трапілі ў Маскоўскі гістарычны музей [34]. Тое ж можна сказаць і пра лёс некаторых лагойскіх знаходак [35].

К. Тышкевіч клапаціўся і аб прапагандзе сабраных ім матэрыялаў беларускіх старажытнасцей, звяртаўся ў Маскву з просьбай адкрыць там этнаграфічную выстаўку [36].

Сваёй працай у галіне археалогіі і краязнаўства К. Тышкевіч заслужыў шырокую вядомасць і быў абраны членам розных навуковых таварыстваў.

## А. К. КІРКОР (1818—1886)

У складаных умовах палітычнай барацьбы працякала дзейнасць краязнаўца, археолага, этнографа, літаратара, публіцыста, мастацтвазнаўца і выдаўца Адама-Ганоры Карлавіча Кіркора. Пасля паўстання 1863—1864 гг. на запытанне Трэцяга аддзялення адносна А. Кіркора жандар Лосеў адказаў: «На свабодзе выдае афіцыйную газету і знеслаўляе тых, хто яго не паслаў на катаржныя работы» [1]. Выразнай думкі адносна ацэнкі грамадска-палітычнай дзейнасці А. Кіркора доўгі час не было. Аднак даследаванні С. Х. Александровіча, Л. В. Аляксеева, Г. В. Кісялёва, С. У. Кліменскага, А. І. Мальдзіса, У. І. Мархеля, К. А. Цвіркі, М. Штольцман і іншых дазволілі правільна ацаніць творчую спадчыну А. Кіркора [2]. Дзейнасць А. Кіркора вывучалі М. Янчук, Р. Зямкевіч, А. Антаневіч, М. Брэнштэйн [3] і бачылі ў ім чалавека, які паспеў зрабіць вельмі шмат для развіцця культуры і навукі Беларусі, перш за ўсё ў галіне этнаграфіі, археалогіі, літаратуры.

Адам-Ганоры Карлавіч Кіркор нарадзіўся ў студзені 1818 г.[4] у двары Слівін каля Мсціслава Магілёўскай губ. у сям'і збяднелага шляхціца-аднадворца [5], татарына па паходжанню. Ён вучыўся ў Магілёўскай і Віленскай гімназіях, у Віленскім шляхецкім інстытуце, пасля працаваў у Віленскай казённай палаце. Аднак А. Кіркора менш за ўсё цікавіла служба, а больш выдавецкая і даследчыцкая дзейнасць. Ён выхоўваўся пад уплывам прафесара Міхала Гамаліцкага (1791—1861), ураджэнца мястэчка Бялавічы Слонімскага павета, які вельмі рана стаў доктарам медыцыны, але ў 36 гадоў пакінуў кафедру і заняўся археалогіяй і археаграфіяй. А. Кіркор меў ад М. Гамаліцкага не толькі маральную падтрымку, але і кансультацыі па пытаннях старажытнай гісторыі Беларусі. Ён карыстаўся прафесарскай бібліятэкай, павышаючы свой навуковы ўзровень.

Станоўчую ролю ў прапагандзе гістарычна-краязнаўчых, археалагічных, этнаграфічных ведаў пра Беларусь адыгралі кіркораўскія зборнікі, часопісы, газеты. Так, у «Памятнай кніжцы Віленскай губерні» (1850—1854) быў уведзены неафіцыйны аддзел, дзе змяшчаліся працы даследчыкаў краю. Апошні нумар гэтай кніжкі на 1854 г. трапіў у канцылярыю генерал-губернатара. У артыкуле па гісторыі Вялікага княства Літоўскага чыноўнікі знайшлі «шкодныя тэндэнцыі». Гадавік забаранілі.

А. Кіркор актыўна ўзяўся за рэдагаванне часопіса «Teka Wileńska». Аднак і гэтае выданне было спынена цэнзурай.

У 1859 г. А. Кіркор купіў друкарню ў Т. Глюксберга і стаў у ёй выпускаць на польскай і рускай мовах «Kurjer Wileński» («Виленский вестник»). Вакол А. Кіркора зноў пачалі групавацца мясцовыя карэспандэнты, у тым ліку В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, А. Вярыга-Дарэўскі, В. Каратынскі, І. Кулакоўскі, Р. Зянькевіч, М. Дзмітрыеў і іншыя, якія прыкоўвалі ўвагу чытачоў сваімі папулярызатарскімі матэрыяламі аб краі [6]. Гэты фактар нельга не ўлічваць пры вывучэнні станаўлення гістарычнага краязнаўства Беларусі. Друк быў важным сродкам прапаганды ведаў аб родным краі.

Сваімі памяркоўнымі адносінамі да мясцовай інтэлігенцыі А. Кіркор не дагадзіў і не мог дагадзіць афіцыйным уладам. І пры першай жа магчымасці губернскае начальства пастаралася пазбавіцца ад такога рэдактара [7].

А. Кіркор быў вымушаны пакінуць Вільню і пераехаць у Пецярбург, дзе наладзіў выпуск газеты «Новое время». Газета адгукалася на рэвалюцыйныя падзеі 1871 г. у Францыі. Заводзіцца новая справа на рэдактара і на выдаўца М. Юматава [8]. А тым часам «Новое время» змясціла матэрыял пра Парыжскую камуну [9]. Газету «Новое время» К. Маркс назваў «сацыялістычнай» [10]. К гэтаму часу А. Кіркора ўжо не было ў Пецярбурзе. Ён быў вымушаны пакінуць Расію і шукаць сховішча ў Галіцыі. Ды і там не было спакою: царскія ўлады прасілі Аўстрыю яго выдаць [11].

Поруч з выдавецкай справай А. Кіркор шмат займаўся навуковай і літаратурнай працай. Яго першыя публікацыі «Аб паганскіх абрадах на Беларусі» з'явіліся, калі аўтару споўнілася 20 гадоў. У «Нарысах гарадоў Віленскай губерні» [12] аўтар змясціў гістарычныя даведкі пра Ліду, Ашмяны, Дзісну, Вілейку і іншыя гарады. Гэта работа папулярызатарская.

У такой жа апісальнай форме напісаны А. Кіркорам работы па гісторыі і статыстыцы Віленшчыны [13], дзе знаходзім звесткі пра некаторыя памятныя мясціны краю і яго насельніцтва, што мела пэўнае значэнне для краязнаўцаў.

А. Кіркор першым у гісторыі беларускага краязнаўства ўзяўся за распрацоўку і выданне спецыяльных краёвых даведнікаў. Такой была яго работа «Экскурсіі па Вільні і яе ваколіцах» [14].

Краязнаўчыя нарысы пра населеныя пункты А. Кіркор канструяваў паводле храналагічнага прынцыпу. Часта ён спыняў увагу на асобных гістарычных этапах, найбольш важных і яскравых для пэўнага горада ці мястэчка. Асноўная перавага такога метаду ў тым, што ён пазбаўляе ад паўтораў. Часта А. Кіркор указваў на месцазнаходжанне таго ці іншага археалагічнага помніка і апісваў пры гэтым знойдзены там пад'ёмны матэрыял.

Асобным выданнем выходзіла праца А. Кіркора «Гісторыка-статыстычны нарыс г. Вільні» [15].

А. Кіркор з'яўляецца найбольш яскравым прадстаўніком беларускай навукі XIX ст., ён засведчыў цікавасць да краязнаўства, археалогіі і этнаграфіі. Прыкладам таму можа служыць «Археалагічная экскурсія па Віленскай губерні», у якой найбольш удала прадстаўлены матэрыялы, якія характарызуюць мінулае гэтага краю.

Больш за 100 курганоў выявіў А. К. Кіркор у Вілейскім павеце, за 10 км ад Галянова, каля Рудні, па р. Вузла, цераз якую нават і «мост



А. К. Кіркор

называлі Вітаўтавым», як зазначыў археолаг. У выніку раскопак ім выяўлены «чалавечыя косткі, жалезныя фібулы, алебарды даўжынёй 7, а шырынёй — 5 вяршкоў» [16].

А. Кіркор зрабіў абмеры гарадзішча «Замкавая гара» каля Галянова, а таксама 83 курганоў ля в. Губы у Губскай пушчы. Гэты рэгіён аказаўся з вельмі пашкоджанымі помнікамі і ў наш час тут засталіся толькі іх фрагменты [17].

А. Кіркор спецыяльна шукаў земляныя насыпы з назвамі «Лысая Гара», «Чорная Гара», «Гарадок», «Гарадзец» і т. п. Ён зарэгістраваў так званыя «акопы» каля Малышак [18] (у наш час іх даследаваў А. Р. Мітрафанаў.— *Г. К.*).

Акрамя Вілейскага А. Кіркор вывучаў Ашмянскі, Свянцянскі, Віленскі, Трокскі і іншыя паветы Віленскай губ. Найбольш цікавымі, на яго думку, з'яўляліся помнікі ля мястэчка Гальшаны Ашмянскага павета, каля вёсак Юзэфава і Радуні Лідскага павета, а таксама каля Берштаў Гродзенскага павета. А. Кіркорам таксама абследаваны старадаўні шлях з Вільні на Заслаўе цераз Крэва і Капачы, які ён лічыў такім жа важным археалагічным аб'ектам, як гарадзішчы і курганы. У сваёй рабоце ён спасылаецца на артыкул А. Ходзькі аб курганах пад Капачамі [19]. На думку аўтара, гэтыя курганы — вынік нязгоды паміж суродзічамі дома Ягайлаў, іх бітваў. Адна з іх адбылася ў 1433 г. паміж Зыгмунтам Кейстутавічам і Свідрыгайлам. Поле, гаворыцца ў прыведзенай даследчыкам легендзе, называецца «Чырвонай валокай», дзе даўней было стойбішча Свідрыгайлы [20]. Гэта легенда запазычана ў Т. Нарбута [21]. Дарэчы, А. Кіркор вельмі часта аздабляе сваю кнігу легендамі пра помнікі гісторыі, што дае кірунак для роздуму даследчыкам. У «Археалагічным падарожжы па Віленскай губерні...» у плане дарожнага знаёмства аўтар даў уяўленне пра Міхалішкі, Свір, Дабраўляны, Мядзел і іншыя мясціны [22]. На востраве воз. Мястра А. Кіркор знайшоў падмурак незразумелага для яго збудавання. Даследаванні М. А. Ткачова засведчылі, што «ў другой палове XVI — пачатку XVII ст. на востраве возера Мястра быў пабудаваны каралеўскі мураваны замак, які злучаўся з горадам драўляным мастом... Характэрнай асаблівасцю мядзельскага замка з'яўляецца тое, што яго ўмацаванні спалучаюць як элемент заходнееўрапейскай фартыфікацыі, так і мясцовыя абарончыя элементы... Мураваныя сцены, вежы і бастэі ў спалучэнні з ніжнім поясам абароны — земляным валам з бастыёнамі, вадзяным ровам і, нарэшце, водамі возера Мястра доўгі час былі месцам надзейнага сховішча мясцовых жыхароў» [23]. Сенсацыяй 1981 г. стала адкрыццё тут М. А. Ткачовым

магутнай мураванай вежы, якая сваімі памерамі і масіўнасцю значна перавышае вядомую Белую вежу ў Камянцы. А. Кіркор тады мог бачыць рэшткі скляпенняў замка. Ён зафіксаваў таксама месцазнаходжанне курганоў паміж Аўгустовам і Кабыльнікам [24]. Гэта экскурсія дала археолагу не проста інфармацыю аб помніках, а і магчымасць сабраць музейную калекцыю, якая пазней паступіла ў Віленскі музей старажытнасцей.

Вялікае значэнне для навуковай дзейнасці мелі яго асабістыя знаёмствы з аматарамі-краязнаўцамі Э. Ратынскім, А. Тышынскім, Г. Пузынай, І. Ходзькам і інш. Магчыма, менавіта ў час падарожжаў у А. Кіркора і стварыўся альбом археалагічных знаходак, які намі выяўлены ў архіве [25]. Хутчэй за ўсё даследчык складаў для сябе універсальны даведнік, які мог служыць адпраўным пунктам у складанні археалагічнай карты, а таксама для навуковай працы ці музеязнаўчай работы. Запісы матэрыялаў у ім рабіліся на працягу некалькіх гадоў. Пра кожны занесены ў альбом прадмет сказана, калі ён знойдзены, пералічаны характэрныя рысы.

Сярод зарэгістраваных матэрыялаў у альбоме ёсць кафля з адбіткам гербаў Хадкевічаў, Герта і інш. Тут жа апісаны камень з выбітай «нагой Пятра», які быў знойдзены яшчэ ў 1801 г. на Траецкай гары ў Мінску, але доўгі час знаходзіўся ў даследчыкаў старажытнасцей П. Кепена, І. Юхневіча, пасля перайшоў да Я. Тышкевіча, апошні ў 1853 г. перадаў А. Кіркору [26]. Сярод 174 зарэгістраваных у альбоме прадметаў больш за ўсё было з Вілейскага павета.

А. Кіркор лічыў для сябе найвялікшым шчасцем адкрываць невядомыя помнікі гісторыі, вывучаць прыватныя калекцыі. «Штогод,— пісаў ён,— некаторы час прысвячаю для археалагічных пошукаў у розных мясцінах старажытнай Літвы... Выкарыстоўваючы даручэнні Археалагічнай камісіі, я наведаў Мінскі, Барысаўскі і Навагрудскі паветы Мінскай губерні і даследаваў розныя мясціны ў Віленскім, Трокскім, Ашмянскім і Вілейскім паветах Віленскай губерні». Тлумачачы задачу вывучэння гарадзішчаў, замкавых гор, курганоў, ён пісаў, што меў на ўвазе «не мноства прадметаў, якія знаходзіў у адной якой-небудзь мясцовасці, а хутчэй за ўсё гушчыню саміх месцазнаходжанняў археалагічных помнікаў у розных месцах вывучаемага краю, бо толькі гэтым спосабам можна выявіць мінулае краіны і жывымі данымі ўказаць гісторыку нітку для вытлумачэння загадкавых апавяданняў летапісцаў» [27]. Гэтага прынцыпу А. Кіркор прытрымліваўся ўсё жыццё.

Пры аглядзе Замкавай гары ў Рэчках Вілейскага павета, рэдкага помніка-ўмацавання, А. Кіркор меркаваў, што яго вывучэнне можа даць уяўленне аб прыёмах будаўніцтва. Адну з калонаў гэтага помніка археолаг перавёз у Віленскі музей старажытнасцей. Летам 1857 г. адбылася экспедыцыя А. Кіркора ў Гарадзілава Ашмянскага павета, дзе яму ўдалося выявіць некалькі курганоў. Садзейнічала правядзенню гэтых даследаванняў мясцовая пісьменніца Габрыэля Пузына (1815—1869).

На полі Г. Пузыны былі раскапаны чатыры курганы. У адным з іх А. Кіркор знайшоў урну з рэшткамі недаспаленых костак, а поруч — сагнуты меч, два кап'і, вуздэчку і некалькі іншых прадметаў. На думку даследчыка, яны былі сагнуты і зламаны над астанкамі нябожчыка і кінуты ў вогнішча і такім чынам зліліся ў адну масу. Поруч з чалавечымі знаходзіліся два шкілеты коней, якіх, на думку археолага, падвялі да магілы і жывымі засыпалі [28]. У жаночым кургане ён знайшоў ажурнай работы бронзавую фібулу [29]. Пазней пра гэтыя ж раскопкі археалагіч-

ных помнікаў пісалі К. Тышкевіч, Ф. Пакроўскі, якія ў сваёй аснове паўтарылі гіпотэзы А. Кіркора. Недахопам даследаванняў А. Кіркора з'яўляецца прыблізнае датаванне выяўленчых матэрыялаў.

Працу «Этнографический взгляд на Виленскую губернию» А. Кіркор выконваў у адпаведнасці з праграмай Рускага геаграфічнага таварыства. Ён выклаў свае думкі пра быт насельніцтва, даўнія традыцыі, абрады, асобныя з якіх, напрыклад купалле, ідуць з паганскіх часоў [32].

У падраздзел «Курганы» аўтар аднёс самыя розныя археалагічныя помнікі, большасць з якіх ужо была апісана ў папярэдніх работах. Маючы ў сваім распараджэнні матэрыялы бедных і багатых пахаванняў, А. Кіркор не рабіў вывадаў пра маёмасную дыферэнцыяцыю ў старажытным грамадстве.

Археолаг адным з першых апісаў абрад пахавання незамужняй жанчыны ў «Русі Літоўскай» [33]. Вельмі цікавае назіранне А. Кіркора над прызначэннем прыладаў працы, напрыклад каменных сякераў, якія былі выяўлены ў інвентары курганоў. Ён слушна залічаў іх да абрадавых [34].

А. Кіркор першы выказаў арыгінальную здагадку пра разнапляменны склад летапіснай Літвы. «Літву нашу,— пісаў ён,— насялялі літоўцы, крывічы, палачане, чарнарусы, яцвягі, дулебы, дрыгавічы»[35]. Правёўшы раскопкі ля Навагрудка, ён зрабіў вывад, што няма чыста балцкіх або чыста славянскіх кургаоў. Няма ніводнага кургана, дзе б не перамешваліся элементы культур гэтых плямёнаў. Гэтае назіранне даследчыка і на сённяшні дзень з'яўляецца вельмі каштоўным і актуальным.

Пэўнае значэнне для гістарычнай навукі мае праца А. Кіркора «Манетная справа ў Літве». Ён піша, што прадметамі гандлю ў старажытнай Літве былі футра, пянька, бурштын, воск, рыба. На тэрыторыі краю мелі хаджэнне арабскія, рымскія, грэчаскія манеты. Аўтар сцвярджаў, што манеты чаканіліся ў Вялікім княстве Літоўскім з XIV да сярэдзіны XVII ст.[36] А. Кіркор палемізаваў з Т. Нарбутам, які датаваў пачатак чаканкі тут манет XII ст. Ён правёў апісанне манет і ўказаў на месцы іх знаходак.

Удзел у складанні археалагічнага слоўніка, матэрыялы якога друкаваліся ў маскоўскім зборніку «Древности» — яшчэ адна сфера дзейнасці А. Кіркора. Змест гэтага выдання — кароткія артыкулы пра помнікі археалогіі. А. Кіркор дасылаў звесткі толькі пра тыя аб'екты старажытнасці, якія ім былі асабіста абследаваны. Некаторыя з гэтых артыкулаў і зараз чытаюцца з цікавасцю, хоць яны не заўсёды бясспрэчныя. Так, пра Пяркунаса [37] ўжо ёсць новыя тлумачэнні. Як лічыць В. П. Даркевіч [38], статуя, прынятая за ідал Пяркунаса, з'яўляецца дэкаратыўнай статуэткай, завезенай літоўцамі, якая апынулася на язычніцкім капішчы ў Кернове.

У Кракаве А. Кіркор працягваў даследаванні археалагічных помнікаў, праводзіў паралелі з вывучанымі беларускімі матэрыяламі [39]. Так, супаставіўшы матэрыялы раскопак жаночых курганоў, ён прыйшоў да вываду, што жанчына на Русі Літоўскай была больш заняволена, чым у Польшчы. А грунтам для такога вываду паслужыла знаходка К. Тышкевічам трупа жанчыны з адсечанай галавой. Сам жа К. Тышкевіч у гэтым бачыў толькі трагічны выпадак, які не можа быць адпраўным для вывадаў [40].

У апошнія гады жыцця А. Кіркор зацікавіўся археалогіяй Украіны[41]. На яе заходняй тэрыторыі ў 1876—1878 гг. былі даследаваны могільнікі тыпу трыпальскай культуры ў Васількаўцах Ксяцкага павета [42] і ў іншых месцах.

Падагульненнем навуковай дзейнасці А. Кіркора з'явілася даследаванне, якое ўвайшло ў вядомую працу «Живописная Россия» пад рэдакцыяй П. П. Сямёнава [43]. Восем нарысаў пра Беларусь напісаны А. Кіркорам. Аўтар спыніўся на вузлавых пытаннях старажытнай гісторыі Беларусі, хоць яму і не выпадала падрабязна спыняцца на мясцовай археалогіі, пра якую ён больш дэталёва пісаў у папярэдніх выданнях. У «Живописной России» ён даваў чытачам «досыць шырокае і ўсебаковае ўяўленне аб Беларусі і яе народзе» [44].

Заслугі А. Кіркора ў даследаванні гісторыі Беларусі выключныя. Ён ажыццявіў дзесяткі цікавых публікацый, выданні зборнікаў, краязнаўчых даведнікаў, часопісаў, газет, працаваў як музейшчык. Ён шмат прыклаў намаганняў дзеля выхавання маладога пакалення даследчыкаў гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, літаратуры, фальклору Беларусі. Некалькі дзесяцігоддзяў аддаў ён вывучэнню Беларусі. А. Кіркор распрацаваў і напісаў гісторыю беларускай археалогіі, у методыцы раскопак засвоіў дасягнутае папярэднікамі і пайшоў далей, даўшы прыклад раскопак курганоў «накрыж», а таксама вядзенне палявых дзённікаў, альбомаў, справаздач. Пры вывучэнні міграцыі насельніцтва А. Кіркор асаблівае значэнне надаваў тапаніміцы.

Прызнаннем навуковых заслуг А. Кіркора стала выбранне яго членам-карэспандэнтам Археалагічнага таварыства (1856 г.), членам Рускага геаграфічнага таварыства (1857 г.) і Кракаўскай Акадэміі навук (1873 г.).

## І. І. КРАШЭЎСКІ (1812—1889)

Іосіф-Ігнат Іванавіч Крашэўскі нарадзіўся ў Варшаве ў 1812 г., паходзіў з шляхецкага роду, з в. Доўгае ля Пружан, дзе правёў сваё дзяцінства. Атрымаўшы ў Свіслачы першапачатковую адукацыю, вучыўся ў Віленскім універсітэце. Гэты край быў яму родным, і ён лічыў сваім абавязкам пісаць пра яго, захапіўся гісторыяй, мастацтвам, а пазней этнаграфіяй і археалогіяй [1]. Шмат падарожнічаў па беларускай і суседніх землях, што дазволіла яму не толькі весці назіранні, але і збіраць краязнаўчы матэрыял. І. Крашэўскі выступаў супраць самадзяржаўя, дэспатызму і грамадскага застою, за што не раз прыцягваўся да адказнасці.

Ён быў рэдактарам часопіса «Атэнэум», дзе друкавалася шмат мясцовай інтэлігенцыі, у тым ліку У. Сыракомля, Р. Зянькевіч, Я. Тышкевіч, К. Тышкевіч і інш., змяшчаліся звесткі, напрыклад, пра помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, пра творы Я. Дамеля, Ф. Смуглевіча, невядомыя матэрыялы пра З. Даленгу-Хадакоўскага і інш.

Як «небяспечнага для публічнага парадку» І. Крашэўскага царскія ўлады ў 1863 г. пазбавілі права жыць у краі, і ён перасяліўся ў Дрэздэн, дзе працягваў літаратурную, навуковую і выдавецкую справу. 600 тамоў магла б скласці яго спадчына.

«Пінск і яго ваколіцы» [2] — найбольш ранні літаратурна-краязнаўчы нарыс Крашэўскага, які быў напісаны пад уражаннем «Старажытнай Польшчы» М. Балінскага. У папулярнай форме на канкрэтным гісторыка-краязнаўчым матэрыяле аўтар расказаў пра горад, спасылаючыся на «Повесть временных лет», прывёў дату яго першага ўпамінання — 1097 год. І. Крашэўскі ў адрозненне ад Т. Нарбута не ішоў слепа за храналогіяй уладарання мясцовых князёў, а асвятляў важныя падзеі, абмалёўваў сацыяльны партрэт Пінска першай паловы XIX ст., калі сам мог назіраць малюнкі быту пінчукоў, гандлю, эканамічнага стану.

Аўтар краязнаўчага нарыса цікавіўся і мясцовай тапанімікай, гідронімамі. У даўніну — расказвалі яму мясцовыя людзі — р. Прыпяць мела назву «Трыпяць», бо ўбірала ў сябе 15 рэчак. Як зварот да краязнаўцаў чытаецца пажаданне пісьменніка пісаць дакументаваныя гістарычныя нарысы «ў крайнім выпадку нашых губернскіх і павятовых гарадоў з апісаннем у іх вартых увагі выдатнасцей і падзей у розныя часы і ў сённяшнім іх стане» [3].

Амаль у такой жа манеры напісана і яго кніга падарожжаў «Успаміны Палесся, Валыні і Літвы»[4], куды ўключаны і нарыс «Пінск і яго ваколіцы».

Наступнай працай з'яўлялася гісторыя Вільні. Аўтар пісаў не толькі пра горад, але і пра падзеі, якія звязвалі яго з наваколлем, са старажытналітоўскай дзяржавай. Тут сустракаем і апісанні камянёў у Заходняй Дзвіне, якія даследчык няправільна звязваў з імем мінскага князя Барыса Усеваладавіча, што княжыў у канцы XI ст. [5] Археолаг Г. В. Штыхаў лічыць, што гэтыя камяні напачатку былі паганскімі бажкамі, а пасля па загаду полацкага князя Барыса Усяславіча, памерлага ў 1102 г., для барацьбы з паганствам быў высечаны крыж і надпіс «Господи помози рабю своему Борису» [6].

Адначасова з Я. Тышкевічам і Р. Друцкім-Падбярэзскім працаваў І. Крашэўскі над «Апісаннем Барысаўскага павета» [7]. Яно таксама краязнаўча-этнаграфічнае. У параўнанні з папярэднікамі аўтар паўшоў далей: яго нарыс вылучаецца вострай публіцыстычнасцю, выкрывае тых, хто вінаваты ў цяжкім становішчы людзей.

І. Крашэўскі пакінуў невялікую гісторыка-краязнаўчую нататку і пра Брэст [8]. Ён не толькі выкарыстоўваў, але і аналізаваў гістарычныя крыніцы. Так, ім былі заўважаны недакладнасці ў «Хроніцы» М. Стрыйкоўскага, паколькі, як выказаўся І. Крашэўскі, многае там узята ад анекдотаў і легенд [9].

Пра І. Крашэўскага як пра археолага мала пішуць у гістарычнай літаратуры. Тым не менш цікава разгледзець яго навуковыя канцэпцыі, яго ацэнку зробленага ў вывучэнні старажытнасцей. Работа «Мастацтва ў славян» [10] найбольш паказальная ў гэтых адносінах, бо аўтар шмат месца адвёў старажытнасцям Беларусі. І гэта зразумела, калі ўспомніць, што І. Крашэўскі працаваў у бібліятэцы і музеі братоў Тышкевічаў у Лагойску. Даследчык цікавіўся раскопкамі А. Кіркора, К. Гаворскага, К. Тышкевіча, Я. Тышкевіча, Т. Нарбута, У. Сыракомлі і інш. Упершыню на беларускіх археалагічных матэрыялах вывучалася старажытнае мастацтва. А перад гэтым даследчык зрабіў падарожжа па краінах Еўропы, пабываў у музеях Рыма і Неапаля.

Некаторыя археолагі, як Т. Валынскі, скептычна ставіліся да навуковых публікацый І. Крашэўскага, паколькі аўтар нібыта адвольна абыходзіўся з фактамі [11]. На самой жа справе І. Крашэўскі першым здолеў улавіць гармонію паміж рознымі звесткамі і фактамі, якія яму трапляліся ў розных крыніцах. Зацікаўленасць археалогіяй да І. Крашэўскага прыйшла яшчэ ў 1840 г., з гадамі стала яго захапленнем. Як калекцыянеру, яму дарылі свае знаходкі А. Кіркор, А. Плятар і іншыя археолагі, аб чым успамінаў А. Плуг, які бачыў у Крашэўскага на сценах, паліцах і стэлажах старажытныя прадметы, а таксама старадаўнюю зброю і вайсковы рыштунак [12].

Як і большасць археолагаў, І. Крашэўскага цікавіла праблема паходжання славян, якія, на яго думку, пад уздзеяннем кельтаў і пад іх націскам прыйшлі з захаду [13]. Аб «заходнім» паходжанні славян і зараз

пішуць у навуковай літаратуры [14]. Адносна паўночна-ўсходніх славян ён прытрымліваўся нарманскай тэорыі.

Вывучыўшы вялікую колькасць прадметаў археалагічных раскопак, даследчык размеркаваў іх паводле матэрыялу, з якога яны зроблены, як гэта рабіў раней дацкі археолаг К. Томсен. І. Крашэўскі ўпершыню выказаў меркаванне, што паміж гэтымі трыма галоўнымі эпохамі няма выразных граніц, а захоўваюцца нейкі час пераходныя стадыі ад адной культуры да другой [15]. Кіруючыся прынцыпамі дацкага археолага, выкарыстоўваючы матэрыялы знаходак мясцовых і замежных даследчыкаў, І. Крашэўскі фактычна пацвердзіў томсенаўскую «тэорыю трох эпох».



І. І. Крашэўскі. Фота з медальёна 1879 г.

Падганяючы пад схему трох эпох падзел абрадаў пахавання, І. Крашэўскі спрабаваў знайсці ў іх адрозненні ў блізкіх па часу магілах. Да першай эпохі (камення) адносіў пахаванні ў каменных трунах, якія папярэднічалі абраду спалення цела. Для прыкладу браў скіфскія пахаванні. Важнейшай асаблівасцю гэтай культуры, на думку даследчыка, былі каменныя бабы, якія ўзвышаліся на кургане. На Беларусі такімі каменнымі трунамі ён лічыў раскапаную К. Гаворскім над р. Начай «групу круглых курганоў, абкладзеных каменнем, якія расцягнуліся на дзвесці квадратных сажняў» [16].

І. Крашэўскі меў рацыю, калі глядзеў на каменныя сякеры як на прылады працы каменнага веку [17], а не як на фетышы.

Эпоху бронзы на Беларусі, Літве і Польшчы даследчык вызначаў па старажытных прыладах працы з медзі і ўпрыгожаннях з бронзы, а сярод абрадаў асноўным лічыў «абрад неспалення цела». Плямёны эпохі бронзы, на думку Крашэўскага, прыбылі з усходу. Да эпохі жалеза ён адносіў курганныя пахаванні, калі труны рабіліся ў форме «хатак», што адрознівала іх ад папярэдніх эпох, датаваў курганы Беларусі, Літвы і Польшчы VII ст. да н. э. Гэта даціроўка недакладная, але для нас важныя зараз выяўленыя ім матэрыялы.

І. Крашэўскі марыў стварыць карту славянскіх старажытнасцей [18], а таксама планаваў падрыхтоўку археалагічнага слоўніка. Хаця ён не быў археолагам-практыкам, аднак увесь час сачыў за даследаваннямі і публікацыямі А. Кіркора, Я. Тышкевіча, К. Тышкевіча, К. Гаворскага, А. Плятара, Р. Зянькевіча. Многім з іх даваў магчымасць выступіць у

часопісе «Атэнэум», які сам выдаваў. Вакол І. Крашэўскага групаваліся не толькі пісьменнікі, але і вучоныя краю. У 1874 г. ён удзельнічаў у міжнародным з'ездзе археолагаў у Стакгольме, а трыма гадамі раней — у археалагічным кангрэсе ў Балоніі. І. Крашэўскі з'яўляўся ганаровым членам Адэскага таварыства гісторыі і старажытнасцей. У сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння І. Крашэўскаму было нададзена ганаровае званне доктара навук. Да яго навуковай спадчыны яшчэ будуць звяртацца спецыялісты розных галін ведаў.

## У. СЫРАКОМЛЯ (КАНДРАТОВІЧ) (1823—1862)

У. Сыракомля (Людвік-Францішак-Уладзіслаў Аляксандравіч Кандратовіч), выкарыстоўваючы беларускую тэматыку, пісаў па-польску і па-беларуску. За параўнальна кароткае жыццё паспеў зрабіць шмат і як паэт, гісторык, публіцыст, краязнавец, этнограф, фалькларыст, літаратуразнавец. У. Сыракомлю яшчэ захаплялі археалогія, лінгвістыка, музеязнаўства і калекцыянерства.

Нарадзіўся Уладзіслаў Сыракомля ў Смольгаве Бабруйскага павета Мінскай губ.[1] у сям'і беззямельнага беларускага шляхціца. Пасля заканчэння даміканскіх школ у Нясвіжы і Навагрудку пайшоў працаваць у нясвіжскую канцылярыю Радзівілаў. Тут ён змог пазнаёміцца з багатым архівам і не менш цікавай музейнай калекцыяй. Гэта не магло не абудзіць у юнага У. Сыракомлі дапытлівасці да гісторыі, бо поруч з ім тут працаваў вопытны архіварыус А. Дабравольскі — знаўца архіваў, прыхільнік вывучэння гісторыі краю. Юнаку тут была магчымасць глыбей зразумець кантрастнасць жыцця ўладароў і змізарнелай беларускай вёскі, поўнай гора і нястачы.

Пазней У. Сыракомля арандаваў фальваркі. Апошнім яго прыстанішчам стала Барэйкаўшчына [2] каля Вільні. Там ён і памёр у 39-гадовым узросце, пакінуўшы вялікую літаратурную і навуковую спадчыну.

У сярэдзіне XIX ст. імя У. Сыракомлі як паэта не сыходзіла са старонак прагрэсіўнай перыёдыкі. Яму блізкай заставалася і гісторыя краю. У 1861 г. за ўдзел у антыўрадавай маніфестацыі «вясковы лірнік» трапіў у турму. Толькі цяжкая хвароба, а затым смерць «вызвалілі» яго.

Праца ў нясвіжскім архіве дала магчымасць У. Сыракомлю па першакрыніцах напісаць нарыс «Нясвіж» (1844) для «Старажытнай Польшчы» М. Балінскага [3]. Ужо ў першай публікацыі аўтар змог узвысіцца над стракатасцю фактаў і даць іх у храналагічнай паслядоўнасці. Абмаляваўшы найбольш важныя ваенныя бataліі, ён раскрыў некаторыя бакі жыцця тагачаснага Нясвіжа, высока ацаніў гарадскія мастацка-архітэктурныя славутасці, перш за ўсё замак з яго багатымі радзівілаўскімі калекцыямі. Усе даследчыкі гісторыі Нясвіжа не могуць абысціся без гэтай найбольш поўнай гісторыі горада, абгрунтаванай рэдкімі архіўнымі матэрыяламі.

У пісьме Адаму Плугу У. Сыракомля прызнаваўся, што любіць запісваць легенды, успаміны, песні і што ў яго «ёсць цэлая кніжачка такіх замалёвак» [4]. Сярод шматлікіх краязнаўчых публікацый У. Сыракомлі найбольш каштоўнай з'яўляецца «Падарожжа па маіх былых ваколіцах». З першых старонак чытач адчувае сыракомлеўскі стыль, грамадзянскую пазіцыю палкага публіцыста.

Віленскі цэнзар заўважыў антыпрыгонніцкі характар кнігі, у карэктуры выкрасліў шмат «шкодных» месц. У раздзеле «Вёска і народ» аўтар з гонарам пісаў пра «мужыцкае племя»: «Наш селянін не піша і не

чытае гісторыі, але, верачы ў якое-небудзь сваё мясцовае паданне, з пагардай паглядае на шляхецкую расу, інстынктыўна адчуваючы, што яны прыбыльцы адкульсьці, а ён — тутэйшы жыхар і гаспадар тутэйшай зямлі» [5].

Выключна насычаны фактамі ў «Падарожжах...» раздзел, які прысвечаны Нясвіжу і яго ваколіцам. Метрыку горада аўтар пачаў з 1224 г. і давёў гісторыю горада да канца XVIII ст.

Краязнавец расказаў і пра іншыя найбольш цікавыя ў гістарычных і этнаграфічных адносінах населеныя пункты (Любча, Мір). Ён правільна меркаваў, што Мірскі замак маладзейшы за Навагрудскі, Лідскі, Крэўскі [6]. Параўноўваючы цагляную муроўку Крэўскага і Меднікаўскага замкаў, прыйшоў да вываду, што яны адносяцца да аднаго часу [7].



У. А. Сыракомля

Падобна І. Крашэўскаму, У. Сыракомля разглядаў гісторыю краю без адрыву ад падзей агульнадзяржаўных, агульнаеўрапейскіх. Яго «Падарожжы...» напісаны таленавіта, узнёсла, гістарычна і этнаграфічна дакладна. У беларускім краязнаўстве XIX ст. гэта лепшы ўзор апісання краю.

Кожнай новай працы У. Сыракомлі папярэднічала вялікая работа па збору і даследаванню разнастайных матэрыялаў (хронікі, самі гістарычныя даследаванні, знаёмствы на месцах з помнікамі краю). Напрыклад, перш чым узяцца за напісанне манаграфіі пра Мінск, аўтар вывучаў шырокае кола крыніц, у тым ліку і лацінскія хронікі, аб чым ён пісаў А. Марціноўскаму [8]. Усё ж апублікаваны матэрыял з'яўляецца толькі часткай працы, якую жонка У. Сыракомлі — П. Кандратовіч назвала «Апісаннем Мінска» [9]. Тут У. Сыракомля разгледзеў важнейшыя этапы гісторыі горада. Архітэктура Мінска, на думку аўтара, дастаткова запамінальная: цэрквы, касцёлы, тэатр і іншыя пабудовы. Ён выказаў здагадку, што горад у даўнія часы пачаў забудоўвацца з заходняга боку, а затым яго засяленне прасоўвалася на ўсход. Увесь факталагічны матэрыял аўтар абгрунтоўваў рознымі крыніцамі. Асобны раздзел ён прысвяціў развагам пра мараль мінчукоў, асвету, ахову здароўя [10].

Працягам краязнаўчага даследавання «Мінск» з'явілася «Хроніка горада Мінска» [11], дзе аўтар не толькі зрабіў гістарычны экскурс, але і правёў параўнанне з іншымі гарадамі Беларусі, асабліва з тымі, якія ў сваім развіцці бліжэй да Мінска, як, напрыклад, Заслаўе. У. Сыракомля верыў у аўтэнтычнасць помніка «Слова аб палку Ігаравым» і выказаў думку, што «Вешчы Баян» паходзіў з Мінска, сам жа літаратурны твор адносіў да беларускай спадчыны. Асобны раздзел прысвяціў мяс-

цовым міфам, звычаям, абрадам, вераванням, прымхам. Першы перыяд гісторыі Мінска аўтар пачаў даследаваць з яго першапачатковага летапіснага ўпамінання.

Другі перыяд гісторыі Мінска У. Сыракомля адлічваў з таго моманту, калі горад стаў цэнтрам намесніцтва (1499 г.), наступны — калі стаў цэнтрам ваяводства (1566 г.). Апошнім, чацвёртым перыядам гісторыі ён лічыў час, які папярэднічаў падзелу Польшчы і ўваходжанню Мінска ў склад Расіі. Найбольш поўна краязнавец апісаў стан Мінска сярэдзіны XIX ст. у эканамічных і гандлёвых адносінах. Гэта, бадай, першае найбольш грунтоўнае даследаванне пра беларускую сталіцу, якое выкарыстоўвалася і выкарыстоўваецца пазнейшымі гісторыкамі Мінска.

У двухтомнай працы «Экскурсія па Літве ў радыусе ад Вільні» [12] У. Сыракомля, як і А. Кіркор, вывучаючы прыкметныя мясціны, рабіў экскурсы ў гісторыю. Ён самастойна вёў назіранні над мовай гэтай тэрыторыі, стараўся вызначыць ступень міграцыі жыхароў краю. Літоўскай мовы У. Сыракомля не ведаў і таму ў краязнаўчым даследаванні глыбей і ўсебакова апісаны землі з беларускім насельніцтвам як з боку гісторыі, так і з боку этнаграфіі і фальклору. Зрэшты, разуменне У. Сыракомлем гістарычнай і этнаграфічнай Літвы пераканаўча паказалі ў сваіх манаграфіях даследчыкі яго жыцця і творчасці К. А. Цвірка [13] і У. І. Мархель [14].

Вялікай краязнаўчай работай з'яўляецца кніга У. Сыракомлі «Нёман ад вытокаў да вусця», куды ўвайшлі «Манаграфія ракі Нёман ад вытокаў да Коўна» і «Дзённік падарожжа марака літоўскай віціны ад Коўна да Крулеўца» [15]. Гэта работа пісалася пад уражаннем манаграфіі «Вілія і яе берагі» К. Тышкевіча, якую У. Сыракомля прачытаў яшчэ ў рукапісе [16]. К. Цвірка лічыць, што новая работа У. Сыракомлі атрымалася «сухаватай». Магчыма, стылістычна яна ўступае лепшым творам вядомага паэта. Аднак жа як падарожная кніга яна мае сваю адметнасць. Сярод манаграфічных апісанняў беларускіх рэк яна была першай. У нейкай меры яна прапаноўвала методыку для наступных краязнаўчых кніг пра рэкі. Аўтар пакінуў апісанні падарожжа па Нёмане, прывёўшы нямала гістарычна цікавых звестак пра многія прыбярэжныя вёскі і гарады: Пясочнае, Магільна, Мікалаеўшчына, Свержань, Стоўбцы, Залучча, Ярэмічы, Шчорсы, Любча, Масты, Гродна. У кнізе не раз падкрэсліваецца сацыяльны стан краю, таму яна значылася ў спісах забароненай літаратуры.

Знойдзеныя рукапісы У. Сыракомлі сведчаць пра вывучэнне ім гісторыі і такіх мястэчак, як Ашмяны, Жупраны, Смаргонь, Дзевятня, Камены Лог і інш. Захаваліся ўрыўкавыя звесткі пра смаргонскія курганы, але гэта работа засталася незавершанай. Гэта дзённік падарожжа паэта ў 1856 г.

У перыядычным друку У. Сыракомля змясціў шэраг краязнаўчых нарысаў. Гэта замалёўкі Валожына [17], Пружан [18], Слоніма [19]. Нарыс жа пра Маладзечна так і застаўся ў рукапісе [20]. У. Сыракомля выступаў у абарону помнікаў гісторыі і культуры. У артыкулах «Акты вандалізму» ён гнеўна пісаў аб разбурэннях помніка замкавага дойлідства ў Міры, пратэставаў з выпадку сапсаванага ў стаўбцоўскім касцёле старажытнага абраза нейкім «рэстаўратарам». «Я думаю,— звяртаўся ён да рэдактара «Кур'ера Віленьскага»,— што неабходна было б завесці ў тваёй газеце асобную рубрыку для запісаў актаў вандалізму, якія чыняцца на Літве, усіх, пра якія толькі можна даведацца» [21].

У. Сыракомля марыў аб выданні спецыяльнага краязнаўчага часопі-

са, у якім адлюстроўвалася б выключна жыццё яго роднага краю [22], а ўвесь прыбытак пайшоў бы на рэстаўрацыю помніка архітэктуры ў Міры [23]. На жаль, задума ва ўмовах прыгонніцкай Расіі не магла быць ажыццёўлена.

Трэба згадзіцца са справядлівай заўвагай даследчыка творчасці У. Сыракомлі У. Мархеля, які схільны лічыць навуковую спадчыну паэта перш за ўсё гісторыка-краязнаўчай [24].

Калі аб яго краязнаўчай дзейнасці хоць і мала, але ўжо пісалі даследчыкі, то пра яго археалагічныя захапленні можна толькі здагадвацца, паколькі ён сам пра іх рэдка ўпамінаў. Відавочна, што ён ніколі не лічыў сябе даследчыкам помнікаў старажытнасці. Уважлівае ж вывучэнне архіўных матэрыялаў пераконвае нас у тым, што і ў гэтай галіне ён не быў толькі назіральнікам. Па-першае, ён сам вёў археалагічныя раскопкі, па-другое, знаходзіўся ў блізкіх адносінах з беларускімі археолагамі, па-трэцяе, прымаў актыўны ўдзел у стварэнні Віленскага музея старажытнасцей, быў яго сталым супрацоўнікам, а таксама членам Віленскай археалагічнай камісіі, атрымаўшы дыплом члена Таварыства вучоных, удзельнічаў ва ўсіх навуковых пасяджэннях, абмяркоўваў даклады па старажытнай гісторыі Беларусі. Вось чаму для археалагічнай навукі імя Уладзіслава Сыракомлі цікавае і з гэтага пункту гледжання.

Актыўнасць беларускіх археолагаў сярэдзіны XIX ст. захапіла паэта навуковымі ідэямі. Ён удзельнічаў у раскопках курганоў. 28 ліпеня 1856 г. У. Сыракомля рабіў справаздачу перад Археалагічнай камісіяй пра свае раскопкі каля Табарышкаў Віленскага павета, над р. Мерач. У выяўленай у архіве аўтарскай справаздачы прыведзена гістарычная даведка аб той мясціне, дзе ён вёў раскопкі, тлумачачы тапонім «Табарышкі» як тэрмін цюркскага паходжання. Прыступіў да работы 23 ліпеня, а 28 ліпеня яна ўжо была гатова. За кароткі час ён паспеў раскапаць два курганы, якія мясцовыя жыхары называюць «шведскімі». У адным знайшоў бярдыш і «рэшткі нейкай тканіны», а «ў другім выкапалі рэшткі гаршка, попел, недаспаленыя чалавечыя косткі, а таксама нешта накшталт зброі...» [25] Да справаздачы ў Археалагічную камісію ён прыклаў пералік усіх выяўленых знаходак, а таксама іх малюнкі, выкананыя ў колеры. Усяго зроблена 16 малюнкаў [26].

Апублікаваць свае работы па археалогіі Беларусі У. Сыракомля проста не паспеў. Зноў жа трэба ўлічыць тую акалічнасць, што пражыў ён усяго 39 гадоў, пры тым толькі ў 33 гады пачаў весці археалагічныя раскопкі. Ёсць звесткі, што У. Сыракомля збіраўся выдаць гісторыю археалогіі, але яна засталася незавершанай, як сцвярджае даследчык сыракомлеўскай спадчыны І. Трыпуцька [27].

Як сведчыць К. Тышкевіч, У. Сыракомля выязджаў на археалагічныя раскопкі пад Навагрудак і ў Ковенскі павет, а таксама ў Чабішкі Віленскага павета, у Кернова — сталіцу летапіснай Літвы [28]. Аднак больш падрабязных звестак пра гэтыя раскопкі мы не маем. Аб практыцы археалагічных захапленняў паэта гаворыцца ў запісках Л. Уземблы [29], а таксама ва ўспамінах В. Каратынскага, змешчаных у прадмове да 10-томнага збору твораў «вясковага лірніка» [30]. Адна з самых апошніх археалагічных экспедыцый, якую арганізаваў У. Сыракомля летам 1860 г., выязджала ў раён мястэчка Бірштаны [31]. Аднак заўчасная смерць не дазволіла даследчыку зрабіць грунтоўную археалагічную публікацыю. Ёсць звесткі, што Сыракомля рыхтаваў альбом пра край [32].

Тое, што да краязнаўства і археалогіі Беларусі прычыніўся такі ўп-

лывовы паэт-дэмакрат, бясспрэчна, павышала да іх цікавасць і аўтарытэт. У маладым пакаленні У. Сыракомля выхоўваў пачуццё павагі да кожнага помніка гісторыі і культуры. Ужо А. Кіркор ацаніў, што Уладзіслаў Сыракомля «не толькі ведаў беларускую мову, але ведаў народ, любіў яго, разумеў яго патрэбы, пранікаў ва ўсю глыбіню яго пачуццяў, ведаў яго паданні, прымаўкі» [33]. Як у мастацкай літаратуры, так і ў краязнаўстве У. Сыракомля заставаўся перакананым дэмакратам, што аказала бясспрэчны прагрэсіўны ўплыў на далейшае развіццё ўсёй гістарычнай навукі Беларусі.

## П. М. ШПІЛЕЎСКІ (1823—1861)

Павел Міхайлавіч Шпілеўскі з'яўляўся прадстаўніком ліберальнай плыні ў літаратуры і культуры дарэформеннай пары. Нарадзіўся ён у в. Шыпілавічы Бабруйскагаа павета Мінскай губ. Атрымаўшы духоўную адукацыю, настаўнічаў у Варшаве, Пецярбурзе. Жыццё ў сталіцы Расіі зблізіла яго з перадавой рускай інтэлігенцыяй, у прыватнасці з М. А. Дабралюбавым [1]. Ён цікавіўся літаратурай, краязнаўствам, этнаграфіяй, лінгвістыкай, фальклорам, тэатрам, археалогіяй.

У краязнаўчай кнізе «Падарожжа па Палессю і Беларускім краі» П. Шпілеўскі апісаў не толькі свае дарожныя ўражанні, але і прывёў гістарычныя звесткі пра ўбачаныя ім населеныя пункты. Недахоп архіўных звестак ён часта кампенсаваў запісамі легенд, паданняў, таму кніга робіць уражанне завершанай, цэласнай. Так, у нарысе пра Брэст П. Шпілеўскі расказаў пра яго старажытную гісторыю, давёўшы яе да сярэдзіны XIX ст., а таксама падаў легенду аб паходжанні назвы горада над Бугам. Шлях падарожжа пралягаў праз Кобрын, Сіняўку, а далей на Клецк, які «некалі быў горадам, меў сваю крэпасць і замак, сляды каменнага падмурка якога, як і валы, ...захаваліся да нашага часу з нясвіжскага ўезду» [2].

П. Шпілеўскі пісаў нарысы пра гарады і мястэчкі на дакументальнай аснове, для доказу іх старажытнасці часта даваў апісанні ці проста ўпамінанні пра мясцовыя замчышчы, валы, сляды далёкай гісторыі. Так ён зрабіў пры апісанні Мінска. Ад мясцовых жыхароў ён пачуў легенду пра Замчышча, бо на гэтым месцы «стаяў замак, які быў умацаваны шанцамі, валамі і абведзены каналам, які злучаў некалі Свіслач з Нямігаю, што зараз ужо не існуе» [3].

У такім плане напісаны расказы пра Койданава, Стоўбцы, Шчорсы, Заслаўе, Смалявічы, Халопенічы, Ігумен, Лукомль. П. Шпілеўскі ў распрацоўцы краязнаўчых нарысаў часта звяртаўся да прац сваіх папярэднікаў. Ад Т. Нарбута ён запазычыў легенду пра паход хана Кайдана на беларускія землі [4], хоць гэта легенда не падмацоўваецца пісьмовымі крыніцамі. Шмат ён рабіў спасылак на Я. Тышкевіча, Р. Друцкага-Падбярэзскага і інш. У зборы звестак пра пэўную мясцовасць П. Шпілеўскі выкарыстоўваў паслугі і аматараў вывучэння краю. Так, пра Халопенічы ён пісаў па матэрыялах тутэйшага краязнаўца Ф. І. Шымкевіча, які даў магчымасць пакарыстацца граматамі XVII ст. і іншымі матэрыяламі з дваровай халопеніцкай бібліятэкі.

Адзначаючы станоўчыя бакі кнігі «Падарожжа» П. Шпілеўскага, па якой можна вывучыць беларускі край, М. Г. Чарнышэўскі заўважыў, што ў ёй шмат гістарызмаў, асабліва ў чацвёртай частцы [5].

Як бы працягам «Падарожжа» з'явілася работа «Мазыршчына» [6]. «...Увесь абшар Мазырскай акругі,— пісаў П. Шпілеўскі,— усеяны шмат-

лікімі курганамі, магільнымі насыпамі — помнікамі старажытнага жыцця ў гэтым краі, сведкамі розных палітычных сутычак і ваенных пабоішчаў... Кожны з гэтых кургаяоў мае сваю легенду, свой летапіс, аповесць, што захаваліся ў вуснах народа» [7]. Аўтар прывёў звесткі з гісторыі Мазыра аб разрабаванні горада татарамі [8]. З помнікаў старажытнасці П. Шпілеўскі ўпамінаў пра малавядомы Тураўскі замак.

У публікацыі «Археалагічная знаходка» [9] П. Шпілеўскі апісаў вельмі рэдкі экспанат Віленскага музея старажытнасцей — кальчугу са старажытнаславянскімі надпісамі, якую знайшлі ў Оршы ў 1856 г. пры будаўнічых работах [10]. З развіццём гістарычнай навукі, сцвярджаў аўтар, такія знаходкі будуць мець выключнае значэнне.

П. Шпілеўскі вывучаў беларускую мову, абрады, фальклор — усё, на чым ляжала пячатка старажытнай гісторыі народа. У прадмове да «Даследавання пра ваўкалакаў» ён пісаў са шкадаваннем, што мала хто з вучоных займаецца пазнаннем мінулага роднага краю. «На старонках нашых часопісаў пастаянна з'яўляюцца розныя даследаванні пра старажытнасці Афін і Рыма... А старажытнасці Заходняй Русі, асабліва ж Беларусі, як быццам лічацца занадта малазначнымі для таго, каб надрукаваць пра іх у якім-небудзь перыядычным выданні. Не ведаю, чым вытлумачыць такую абыякавасць нашых вучоных да Беларусі. Ці не тым, што пра рымскія і грэчаскія старажытнасці лягчэй пісаць у кабінеце па замежных крыніцах, а каб пісаць пра Беларусь, для гэтага неабходна ведаць яе? А Беларусь жа вартая таго» [11].

Некаторую цікавасць для краязнаўцаў, этнографаў мае публікацыя П. Шпілеўскага «Беларусь у характарыстычных апісаннях...» [12] У адрозненне ад У. Сыракомлі, які беларусаў лічыў толькі нашчадкамі крывічоў, П. Шпілеўскі заўважыў, што «паміж Дняпром і Заходняй Дзвіной ... жывуць там людзі беларускія, нашчадкі старажытных крывічоў і дрыгавічоў...»

Спадчына П. Шпілеўскага раскідана па розных выданнях.

Вялікі спіс прац П. Шпілеўскага, пераважна этнаграфічных і фальклорных, прыводзіць Г. К. Кісялёў у сваім нарысе «...Я жыў з імі, я рос сярод іх...» [13] «Такім чынам і мне прыходзілася рабіць, і толькі такім спосабам я мог паспець сабраць песні і прымаўкі беларусаў. Пры гэтым няшкода заўважыць, што для наведвання ігрышчаў неабходна ведаць беларускую мову» [14]. У галіне археалогіі П. Шпілеўскі зрабіў няшмат, ён больш вядомы як этнограф, лінгвіст, краязнавец [15].

## М. І. БЕЗ-КАРНІЛОВІЧ (1796—1862)

Па абавязку ваеннага тапографа генерал-маёр Генеральнага штаба М. Без-Карніловіч вывучаў беларускія землі Падняпроўя і Падзвіння. Ён напісаў ваенна-статыстычны агляд Віцебскай губ.[1], у якім даў ацэнку правіянтных і дарожна-транспартных магчымасцей краю. Пры вядзенні геадэзічных работ на Віцебшчыне М. Без-Карніловіч зацікавіўся аб'ектамі старажытнай гісторыі: курганамі, гарадзішчамі, замчышчамі, земляныміваламі, фартэцыямі і іншымі помнікамі даўніны. Усё гэта вырашыў даследаваць і ў папулярнай форме выкласці ў асобнай кнізе «Гістарычныя звесткі пра славутыя мясціны на Беларусі...» [2], спадзеючыся, што гэты матэрыял паслужыць адпраўным момантам для тых, «хто прыме на сябе клопат скласці... падрабязнае апісанне».

М. Без-Карніловіч — гісторык, этнограф і краязнавец. Паводле ар-

хіўных звестак, паходзіў са шляхты Магілёўскай губ.[3], паводле іншых— нарадзіўся на Украіне, брат вядомага дзекабрыста А. В. Карніловіча. Меў ваенную адукацыю, у 1831—1847 гг. кіраваў тапаграфічнымі здымкамі ў Мінскай, Наўгародскай, Віцебскай, Валынскай губернях і Беластоцкай акрузе. У студзені 1852 г. М. І. Без-Карніловіч «звольнены з ваеннай службы па сямейных абставінах».

Ён вывучыў шмат беларускіх, рускіх, польскіх археалагічных крыніц, з ваенна-пратакольнай пунктуальнасцю апісаў усе больш-менш значныя населеныя пункты Беларусі, пад якой разумеў толькі Віцебскую, Магілёўскую і заходнія паветы Смаленскай губ.

Продкамі беларусаў М. Без-Карніловіч лічыў не толькі крывічоў, але і радзімічаў. Тут даследчык памыляўся як у поглядзе на этнагенез беларусаў, так і на тэрыторыю іх рассялення. Гэту памылку адзначыў А. М. Пыпін [4]. Даследчык пісаў пра Полацк як цэнтр крывічоў, які стаў пазней стольным горадам цэлай дынастыі мясцовых князёў [5]. Думка даследчыка пра тое, што Полацкае княства ў час нямецкай экспансіі на ўсход у 30—40-х гадах XIII ст. было яшчэ дастаткова моцна арганізаванай дзяржавай, якая перагарадзіла шлях варожым сілам, вельмі блізкая да той, якая існуе ў сучаснай гістарычнай навуцы [6].

Істотным метадалагічным прынцыпам з'явілася імкненне М. Без-Карніловіча паказаць гісторыю асобных гарадоў або мясцовасцей у непарыўнай сувязі з гісторыяй агульнадзяржаўнай, агульнаеўрапейскай. Станоўчым было імкненне аўтара браць для свайго даследавання толькі дакументаваныя, падмацаваныя пісьмовымі крыніцамі матэрыялы. Так, разглядаючы гісторыю Віцебска [7], М. Без-Карніловіч не назваў даты заснавання горада ці першага яго ўпамінання, не будучы перакананым у яе дакладнасці. Сучаснікі ж краязнаўца ўжо тады часта пісалі пра Віцебск, называючы розныя даты. М. Без-Карніловіч акрамя гістарычнага экскурса ў мінулае Віцебска адным з першых сярод краязнаўцаў расказаў аб яго эканоміцы, мясцовых промыслах. Гаворачы пра помнікі горада, ён апісаў іх стан у сярэдзіне XIX ст.

Сярод гарадоў і старажытных умацаваных месц латвійска-беларускага пагранічча М. Без-Карніловіч вывучаў Дынабург, Краславу, Дзісну, Барысаглебск з замкам, люцынскі замак (1285) і інш. Да гісторыі ж Полацка М. Без-Карніловіч быў асабліва ўважлівым [8]. Ён апісаў мясцовыя помнікі археалогіі, а таксама помнікі старажытнага дойлідства, спыніўся на эканамічным стане Полацка, з іншых гарадоў паўночнай Беларусі вылучаў Лепель [9]. Датай яго заснавання лічыў 1439 г. Ён упершыню разгледзеў гісторыю старажытнага Лукомля — сталіцы аднайменнага ўдзельнага княства [10], прывёў з «Павучання» Уладзіміра Манамаха першае ўпамінанне аб горадзе (1078) [11], знішчаным у гэты год кіеўскім князем, апісаў мінулае Талачына, Чарэі, Краснаполля, Рагачова, Чэрыкава і іншых гарадоў.

Няма звестак, што М. І. Без-Карніловіч вёў археалагічныя раскопкі. Аднак вопыт і назіральнасць давалі яму магчымасць амаль беспамылкова ацэньваць важнасць помніка. Так, ён першым вызначыў месцазнаходжанне старажытнага Друцка (Дручаска) і расказаў аб яго гісторыі. Археалагічнымі даследаваннямі важнасць друцкага гарадзішча даказаў Л. В. Аляксееў [12], які фактычна і пацвердзіў думку ранейшага даследчыка. Спасылаючыся на работу С. Богуш-Сестранцэвіча «Аб Заходняй Русі», М. Без-Карнілавіч узяў у яго факт аб уладанні ў 1116 г. Друцкам князем Яраполкам Уладзіміравічам [13].

Гісторыка-краязнаўчыя агляды М. Без-Карніловіча пра Магілёў,

Мсціслаў, Оршу, Смаляны, Чарэю, Бялынічы, Стары Быхаў, Талачын, Лукомль, Копысь, Баркулабава, Крычаў і іншыя мясціны Падняпроўя не стэрэатыпныя, як у большасці даследчыкаў таго часу, у яго менш апісальніцтва, а больш крытычнага падыходу да самix крыніц, якія леглі ў аснову яго даведак аб розных населеных пунктах краю.

Узнёсла краязнаўцам абмаляваны горад над кручамі Дняпра — Магілёў, назва якога, лічыць аўтар, пайшла ад вёскі Магілы [14]. І ён знаходзіў тут старажытныя магілы. Шмат шкоды нанесена Магілёву ў час войнаў і ваенных канфліктаў у 1661, 1708, 1812 гг. У Гомелі ён бачыў земляное ўмацаванне насупраць млына, за рэчкаю, якое абведзена ровам. Відаць, былі сляды вала і рова. Умацаванне зроблена па загаду караля Зыгмунта Аўгуста [15].

Прыкметы ўмацаванага месца Без-Карніловіч сустракаў у Сакалішчы Полацкага павета. За 48 вёрст ад Полацка трапіліся яму рэшткі замка (1566 г.). Як заключае даследчык, дрысенскі ўмацаваны замак спачатку быў спалены ў 1386 г. князем Андрэем Альгердавічам, а пазней па загаду караля Зыгмунта Аўгуста быў адноўлены і ў 1565 г. «забяспечаны снарадамі і гарматамі. Кім ён пазней знішчаны, невядома. Слядоў няма. Вал раскапаны, а роў засыпаны» [16].

Чачэрск у XII ст. уваходзіў у склад Чарнігаўскага княства. Даследчык бачыў у гэтым горадзе драўляны палац, у якім спынялася Кацярына II [17], а таксама выявіў мноства курганоў, якія ён памылкова адносіў да шведскіх. Падрабязна абмаляваў аўтар гісторыю Крычава, узнікненне якога адносіць да XIV ст. Тут у 1410 г. пасля бітвы з крыжакамі пабываў Ягайла. Палілі горад як маскоўскія, так і літоўскія войскі.[18] Мястэчка Чарэя, паводле М. Без-Карніловіча, у XV ст. належала князям Пяструцкім. Па шлюбу княжны Марыі Пяструцкай Чарэя дасталася Багдану Сымонавічу Сапегу, які заснаваў тут праваслаўны храм, што, паводле запісанага аўтарам падання, быў разрабаваны французамі ў 1812 г. На востраве Чарэйскага возера знаходзіўся даўні базіліянскі манастыр [19]. У мястэчку Маляцічы Чэрыкаўскага павета даследчыку нічога прыкметнага не кінулася ў вочы, акрамя цудоўнага касцёла, які, на яго думку, з'яўляўся копіяй рымскага храма св. Пятра. Належаў гэты помнік мураванага дойлідства С. І. Богушу-Сестранцэвічу [20].

З глыбокай пашанай, сардэчнай цеплынёй ставіўся М. Без-Карніловіч да беларусаў і характарызаваў іх як «працавітых, вясёлых, адкрытых душой, шчырых, гутарлівых» [21].

Даследчык прыслухоўваўся да легенд, паданняў, якія былі блізкія да рэальных з'яў жыцця, асабліва калі гэта адносілася да вытлумачэння абрадаў, вераванняў старажытнага чалавека. Ён запісаў каля Полацка са слоў старажылаў, што поруч з колішнім возерам Валоўе, якое знаходзілася на левым беразе Палаты, амаль насупраць Багародзіцкага манастыра, было капішча Перуна [22].

Назіраючы за той двaістай роляй, якую выконвала карчма ў беларусаў, ён падкрэсліў, што гэта месца, дзе не толькі адпачывалі пасля работы, але і вырашалі спрэчкі, заключалі ўмовы. М. Без-Карніловіч лічыць, што такая рада бярэ пачатак не ў XIX ст., а мае даўнюю традыцыю. Так і ў крывічоў у старажытнасці ўсё вырашалася на вечы [23].

Дзейнасць М. Без-Карніловіча вылучалася некаторай навізною пастаноўкі пытанняў аб паходжанні беларусаў, методыкай апісання гарадоў, імкненнем выкарыстаць пэўныя, правераныя матэрыялы і прадставіць іх на фоне агульнадзяржаўнай, агульнанароднай гісторыі. Шматлікія звесткі М. Без-Карніловіча па гісторыі Беларусі шырока

выкарыстоўваліся і выкарыстоўваюцца рознымі вучонымі і краязнаўцамі як адпраўныя.

М. Без-Карніловіч — адзін з нешматлікіх даследчыкаў старажытнай гісторыі Беларусі, які ішоў сваім шляхам, ён амаль не наследаваў ранейшых вучоных, на многія пытанні гісторыі меў свае погляды, чым і цікавы ў гістарыяграфіі, археалогіі і краязнаўстве. Без прац М. Без-Карніловіча, як і вышэйразгледжаных даследчыкаў, нельга ўявіць станаўленне беларускага гістарычнага краязнаўства і археалогіі Беларусі ў эпоху феадалізму.

* * *

Апошняя трэць перадрэформеннага перыяду XIX ст., нягледзячы на цяжкасці эканамічнага і палітычнага характару, з'явілася істотным звяном у гісторыі вывучэння археалагічных помнікаў і развіцці краязнаўства Беларусі. Дзякуючы навуковым і папулярызатарскім працам Яўстафія і Канстанціна Тышкевічаў, Адама Кіркора, Іосіфа Крашэўскага, Ксенафонта Гаворскага, Уладзіслава Сыракомлі, Паўла Шпілеўскага, Ігната Кулакоўскага, Іосіфа Ярашэвіча, Іосіфа Турчыновіча і іншых даследчыкаў, а таксама дзякуючы іх грамадскай дзейнасці археалогія зрабіла прыкметны крок да вылучэння з гістарычнай навукі ў самастойную галіну ведаў, хаця і ўключала многія дысцыпліны (а не толькі матэрыялы раскопак). Набывала археалогія некаторую стройнасць у методыцы даследаванняў. Вынікі ж абагульнення яшчэ рэдка з'яўляліся здабыткам гістарычнай навукі, хаця матэрыялы раскопак усё часцей траплялі ў экспазіцыі тагачасных музеяў і тым самым станавіліся рэкламай і стымулам да новых пошукаў, да навуковых даследаванняў помнікаў мінулага. Мясцовымі археолагамі і краязнаўцамі было шмат зроблена па вывучэнні гарадзішчаў, замчышчаў, курганоў, умацаванняў, у меншай меры старажытных гарадоў. Тэорыі і праблемы многіх з'яў, якімі захапляліся беларускія археолагі ў сярэдзіне XIX ст., і сёння не да канца вывучаны і адназначна ацэнены. Усё ж практычныя і тэарэтычныя даследаванні былі, бадай, ці не самым іх вялікім дасягненнем. Імёны вучоных Беларусі станавіліся ўсё больш вядомымі далёка за межамі роднага краю.

## АРХЕАЛОГІЯ І КРАЯЗНАЎСТВА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

Рэакцыя рабіла свой уплыў на развіццё гістарычнай навукі, асабліва ў 60-х гадах XIX ст. Прафесар С.-Пецярбургскай духоўнай акадэміі М. В. Каяловіч (1828—1891) пры непасрэднай дапамозе органаў унутраных спраў раз'язджаў па беларускіх паветах перш за ўсё з мэтай прапаганды праваслаўя і палітыкі царызму, выконваў іх сацыяльны заказ. Акрамя таго, ён збіраў матэрыялы для сваёй кнігі па гісторыі Заходняй Расіі [1]. Паралельна са збіраннем матэрыялаў для навуковых прац ён складаў спіс бібліятэк, архіваў, музейных калекцый для вызначэння іх каштоўнасцей. Асабліва яго цікавіла калекцыя музейных прадметаў і збор дакументаў у Нясвіжы [2].

Археалагічнае вывучэнне Лепельшчыны вёў М. Ф. Кусцінскі (1828—1905), які пад уплывам А. С. Уварава яшчэ з 1852 г. раскопваў курганы. Яму належыць прыарытэт у даследаванні вядомага Гнёздаўскага могільніка [3]. Ён жа першым у гісторыі археалогіі пачаў складаць фататэку помнікаў старажытнасцей. У сваёй навуковай дзейнасці М. Ф. Кусцінскі арыентаваўся на Маскоўскае археалагічнае таварыства і на Пецярбургскую акадэмію мастацтваў, з якімі ён пастаянна перапісваўся і нават дасылаў некаторыя матэрыялы раскопак [4]. Ужо ў сталым веку археолаг вельмі актыўна ўключаўся ў падрыхтоўку да IX Археалагічнага з'езда ў Вільні. Ён прыводзіў у сістэму разведанае і вывучанае раней, рыхтаваў па выніках сваіх даследаванняў рэфератыўны даклад [5], склаў археалагічную карту свайго павета.

Кампетэнтным краязнаўцам Віцебшчыны быў А. М. Семянтоўскі-Курыла (1821—1893). Ен прыехаў на Падзвінне напярэдадні паўстання 1863—1864 гг. Лічыўся ён у спісе давераных асоб Віцебскай губ. як капітан рускай арміі [6]. Семянтоўскі вельмі актыўна стаў вывучаць край з пункту гледжання археалогіі, гісторыі, этнаграфіі, геаграфіі, прыроды. Па просьбе Пецярбургскай Акадэміі навук ён выяўляў і вывучаў помнікі археалогіі, найперш зацікавіўся Барысаглебскім манастыром, яго архітэктурна-будаўнічымі асаблівасцямі. Сам даследчык раскопкамі не займаўся, але ён пільна сачыў за раскопкамі іншых археолагаў, фіксаваў помнікі для сваёй карты. Пры гэтым Семянтоўскі ўпершыню правёў класіфікацыю археалагічных аб'ектаў паводле іх колішняга прызначэння. Улік помнікаў вёў па кожным павеце Віцебскай губ. Усяго даследчыкам апублікавана каля 150 навуковых прац, прысвечаных Беларусі. Найбольш грунтоўным даследаваннем з'яўляецца кніга «Белорусские древности» [7] са змешчанымі ў ёй 106 малюнкамі розных прадметаў старажытнасцей.

У 70—80-х гадах XIX ст. у галіне археалогіі і гістарычнага краязнаўства Беларусі пачынаюць з'яўляцца праблемныя і факталагічныя артыкулы новага пакалення вучоных, найперш Е. Р. Раманава, А. П. Сапунова, а таксама І. Ф. Завішы, Р. Г. Ігнацьева, М. М. Турбіна і інш.

Ужо ў 17 гадоў Е. Р. Раманаў (1855—1922) захапіўся краязнаўствам.

Пачалося з вывучэння матэрыяльнай культуры. Яго зацікавіла сама прырода помнікаў археалогіі. Даследчык шмат вандраваў па Беларусі, каб сабраць пра іх звесткі, пачынаў класіфікаваць помнікі старажытнасці паводле эпох і іх даўняй прыналежнасці. Адной з ранніх публікацый вучонага была нататка пра Барысаў камень [8], у якой аўтар не выказаў новых гіпотэз у параўнанні з папярэднікамі.

Е. Р. Раманаў вывучаў курганы. Ён прапанаваў свой, на той час арыгінальны, новы метад раскопак: здыманне пластоў зямлі да палавіны насыпу, а пасля з паўночнага і паўднёвага бакоў на адлегласці 1 аршына прапаноўваў пракопваць траншэі да мацерыка. Стоячы ў гэтых траншэях, рабочыя прадаўжалі тонкімі слаямі здымаць зямлю з астатняй часткі кургана, аж пакуль поўнасцю не будуць выяўлены астанкі [9]. Гэты спосаб не зусім адпавядае сучаснаму, але гэта была раманаўская навінка ў методыцы археалагічных даследаванняў, больш прагрэсіўная ў параўнанні з раней разгледжанымі кіркораўскай і тым больш нарбутаўскай.

Пад уплывам новых веянняў моды на складанне археалагічных карт і Раманаў узяўся за стварэнне карты Магілёўскай губ. На жаль, яна не была выдадзена, і яе рукапіс, перайшоўшы праз некалькі рук, аказаўся ў Львоўскім гістарычным архіве [10]. З выяўленых намі матэрыялаў відаць, што вучоны ўсе вядомыя яму помнікі старажытнасці на тэрыторыі губерні падзяляў па відах, а храналагічна — па эпохах. У асобныя падраздзелы вылучаны ім каменныя крыжы, камяні з надпісамі, камяні з выявамі, нават асобна вылучыў камяні «са ступнёй». Улічыў даследчык усе вядомыя гарадзішчы, «гарадцы», курганы, валы земляныя і г. д.[11]

Е. Р. Раманаў стварыў аналагічныя карты Гродзенскай і Віцебскай губерняў. У рабоце над археалагічнай картай Віцебшчыны дапамагаў яму А. П. Сапуноў. Выданне такіх карт падводзіла вынік работы многіх ранейшых археолагаў, дэманстравала ступень вывучанасці краю.

Беларускі вучоны прынцыпова ставіўся да кожнага акта вандалізму ў адносінах помнікаў гісторыі і культуры. Так, у 80-х гадах XIX ст. ён дачуўся, што пры земляных работах быў разбураны Люцынскі могільнік на захадзе Віцебскай губ. і сам тут жа выехаў на месца. Раманаў правёў тут раскопкі да канца, а выяўленыя прадметы перадаў у музей [12], а пра некаторыя падрыхтаваў публікацыі.

За сваё жыццё Е. Р. Раманаў сабраў звесткі больш як пра 1 тыс. помнікаў археалогіі на тэрыторыі Беларусі. У пераважнай большасці сам стараўся іх убачыць, абмераць, апісаць [13]. Яго археалагічная, этнаграфічная і фалькларыстычная дзейнасць не раз адзначалася ўзнагародамі.

У 1902 г. па ініцыятыве гэтага вучонага ў Магілёве створана Таварыства па вывучэнні Беларускага краю (у 1913 г. рэарганізавана ў Таварыства па вывучэнні Магілёўскай губ.— *Г. К.*) і пры гэтым жа таварыстве быў арганізаваны гісторыка-этнаграфічны музей. Раманаў марыў пра беларускі універсітэт, пра далейшае развіццё навукі.

Энцыклапедычнасцю ведаў вызначаўся віцебскі краязнавец і гісторык А. П. Сапуноў (1851—1924). Ён прайшоў шлях ад радавога даследчыка да прафесара Маскоўскага археалагічнага інстытута. Поруч з педагагічнай працай Сапуноў вёў шырокую пошукавую работу старажытных архіўных матэрыялаў па гісторыі Віцебшчыны. Сабраныя дакументы ўвайшлі ў арганізаванае ім выданне «Витебской старины», якое стала помнікам беларускай археаграфіі. Сабраны ім матэрыял дазволіў

весці грунтоўныя краязнаўчыя даследаванні па гісторыі асобных населеных пунктаў, асабліва такіх, як Віцебск, Полацк, Браслаў, Лепель, Чашнікі і інш. Пры гэтым звярталася ўвага на помнікі археалогіі і архітэктуры. Многія з гэтых матэрыялаў увайшлі ў яго манаграфію «Река Западная Двина»[14], пазней у «Исторический очерк Витебской Белоруссии»[15], «Памятники времен древних и новейших в Витебской губернии»[16]. Ва ўсіх гэтых працах ёсць краязнаўчы і археалагічны матэрыял. А. П. Сапуноў акрамя Віцебшчыны цікавіўся Магілёўшчынай, пісаў пра яе. Ён жа складальнік і каментатар «Материалов по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов...»[17] У гэтай кнізе таксама шмат ёсць звестак пра помнікі старажытнасці.

А. П. Сапуноў быў ініцыятарам стварэння Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея (1893 г.), Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (1909 г.), вельмі дбайна адносіўся да аховы помнікаў старажытнасці, часта выступаў на розных пасяджэннях, чытаў лекцыі па гісторыі Беларусі[18].

Пры падрыхтоўцы да IX Археалагічнага з'езда ў Вільні штогод праводзіў экспедыцыі ў Мінскай і Магілёўскай губернях У. З. Завітневіч (1853—1927). Ён даследаваў 647 курганоў, упершыню ўзяўся грунтоўна вывучаць пахавальны абрад дрыгавічоў, лічыў тыповым пахаваннем насельнікаў гэтага племя пахаванне «на гарызонце». Археолаг праводзіў даследаванні ля Бабруйска, Мазыра, Рэчыцы. Цяжка было ў той час пісаць аб межах плямён, найперш дрыгавічоў. Завітневіч зрабіў такі крок першым[19].

Міхал Федароўскі (1853—1923) у гісторыю беларускай навукі ўвайшоў не толькі як фальклярыст і этнограф, але і як археолаг. Па праву члена розных навуковых таварыстваў ён вёў археалагічныя раскопкі, пераважна ў заходняй частцы Беларусі, капаў курганы, умацаваныя паселішчы, могільнікі і інш. М. Федароўскі адным з першых на Беларусі зацікавіўся старажытнымі паселішчамі эпохі бронзы і нават неалітычнымі, так званымі «крэмневымі стаянкамі»[20]. Большасць археалагічных знаходак ён дасылаў на працягу 15 гадоў (1877—1892) З. Глогеру ў яго маёнтак Яжэва, які таксама цікавіўся беларускімі старажытнасцямі. Усяго Федароўскі пераслаў З. Глогеру каля 11 тыс. прадметаў археалогіі[21]. Некаторыя археалагічныя экспедыцыі М. Федароўскага той жа З. Глогер і асвятляў у друку[22]. Археалагічныя раскопкі Федароўскі праводзіў да 1902 г. У 1904 г. ён увогуле пакінуў Беларусь. Даследчык шмат выступаў у друку і як краязнавец. Вядомы яго публікацыі пра Віцебск і яго ваколіцы, Пружаны, Слонім, Ваўкавыск, Навагрудчыну, Бераставіцу, Свіслач.

У 80—90-х гадах XIX ст. дзеля развіцця археалогіі і гістарычнага краязнаўства на Беларусі плённа працавалі В. А. Шукевіч, М. А. Янчук, А. П. Смародскі, І. Ф. Завіша, М. В. Доўнар-Запольскі, С. Ю. Чалоўскі, Ф. В. Пакроўскі, М. В. Фурсаў, Г. Х. Татур, І. І. Далгоў, А. К. Марэль і інш. Адны з іх вялі раскопкі помнікаў розных археалагічных эпох, другія займаліся сістэматызацыяй выяўленых помнікаў і складалі карты асобных паветаў і цэлых губерняў, іншыя ж паспявалі рабіць і тое і другое. Фактычна к канцу XIX ст. уся Беларусь была ахоплена археалагічным вывучэннем. Як мы ўжо заўважылі, вяліся раскопкі не толькі асобных відаў помнікаў, але і былі сур'ёзныя намеры вывучыць прыроду культуры крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, Чорнай Русі і інш. Склалася пэўнае ўяўленне пра межы гэтых плямёнаў.

У навуковай дзейнасці мясцовых археолагаў у другой палове XIX ст.

шмат дапамогі аказалі Пецярбургскае і Маскоўскае археалагічныя таварыствы. Асаблівую актыўнасць праяўляла Маскоўскае таварыства, якое было створана па ініцыятыве А. С. Уварава і якое з 1869 да 1911 г. правяло 15 усерасійскіх археалагічных з'ездаў. Праводзіліся яны ў розных гарадах і тэрытарыяльна згуртоўвалі на месцах даследчыкаў старажытнасцей. Для Беларусі і Літвы такім з'явіўся IX Археалагічны з'езд, які праходзіў у Вільні з 1 да 14 жніўня 1893 г. Сама падрыхтоўка да з'езда выклікала вялікую патрэбу ў дадатковых даследаваннях, правядзенні новых экспедыцый.

На Магілёўшчыне падрыхтоўкай да з'езда кіраваў мясцовы губернатар А. С. Дамбавецкі — дасведчаны краязнавец, рэдактар трох тамоў «Спробы апісання Магілёўскай губерні» (Магілёў, 1882—1884). Ён перапісваўся са старшынёй падрыхтоўчага камітэта з'езда П. С. Уваравай, дасылаў у Маскву і Вільню матэрыялы археалагічных раскопак на спецыяльныя выстаўкі, пасля выставак прасіў рэчы вярнуць назад, паколькі яны павінны экспанавацца ў Магілёўскім музеі [23]. А. С. Дамбавецкі праяўляў асаблівую цікавасць да археолагаў, якія вялі раскопкі ў Падняпроўі,— У. З. Завітневіча, С. Ю. Чалоўскага, М. В. Фурсава і інш. Надаваў вялікае значэнне выкананню археалагічнай карты Е. Р. Раманавым [24].

Разгледжаныя тут некаторыя аспекты навуковай дзейнасці археолагаў і краязнаўцаў сведчаць, што кожны з іх не проста фіксаваў помнікі, даследаваў іх, а рабіў першыя спробы сінтэзаваць ужо вывучанае. Рабіліся вывады па асобных групах помнікаў, якія складалі арэал культуры насельнікаў. У гэтым галоўная перавага новага перыяду развіцця археалогіі і гістарычнага краязнаўства перад ранейшым — «дваранскім» перыядам.

У перыяд капіталізму не знізілася і колькасць прыватных археалагічных калекцый. Сярод калекцыянераў вызначаліся унікальнасцю сваіх збораў, асабліва па нумізматыцы, А. Ельскі, В. Шукевіч, А. Гутэн-Чапскі, М. Гаўсман, Г. Тэадаровіч, В. Федаровіч, М. Тышкевіч, Ф. Саковіч і інш. А аматар археалагічных збораў генерал Язерскі сваю калекцыю з тысячы каменных сякераў у 1867 г. даставіў з Магілёўскай губерні на парыжскую выстаўку. Калекцыі некаторых даследчыкаў станавіліся своеасаблівымі хатнімі лабараторыямі-музеямі (напрыклад, В. А. Шукевіча ў Начы Лідскага павета).

Адна з самых багатых археалагічных калекцый на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX ст. была ў В. П. Федаровіча (1848—1911) — віцебскага краязнаўца, ініцыятара выдання зборніка «З ваколіц Дзвіны». Свае археалагічныя зборы ён пачаў з набыцця матэрыялаў раскопак з розных паветаў Віцебшчыны, а пасля і Магілёўшчыны, Віленшчыны, Міншчыны, Гродзеншчыны. Акрамя багатых курганных знаходак М. Ф. Кусцінскага ў калекцыі Федаровіча былі падборкі прадметаў нумізматыкі, сфрагістыкі, геральдыкі, а таксама этнаграфіі. Пасля смерці ўладальніка калекцыі яго справу прадоўжыў сын — В. В. Федаровіч, ад якога матэрыялы перайшлі ў Віцебскі абласны краязнаўчы музей, часткова гэтыя матэрыялы захаваліся.

Вялася падрыхтоўка да археалагічнага з'езда ў Віленскай, Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губернях. Напрыклад, В. А. Шукевіч (1852—1912) упершыню вёў даследаванні помнікаў археалогіі Чорнай Русі. За дзесяцігоддзе, якое папярэднічала з'езду, ён апісаў больш за 300 раскапаных ім аб'ектаў, пераважна каменных магіл. Выходзячы са свайго вопыту практычнай работы, Шукевіч упершыню спрабаваў вы-

значыць атрыбутыўнасць гэтых пахаванняў і межы распаўсюджання насельнікаў Чорнай Русі.

У галіне археалогіі В. А. Шукевіч вывучаў помнікі каменнага веку, а таксама эпохі бронзы і ранняга жалезнага веку (латэнскі перыяд), яцвяжскія, літоўскія могільнікі, курганы-жальнікі. Толькі на тэрыторыі былога Лідскага павета да пачатку XX ст. ім даследавана 120 каменных магіл, а да першай сусветнай вайны — 170 пахаванняў. В. А. Шукевіч першы сярод беларускіх археолагаў даследаваў каменныя магілы тыпу жальнікаў XIII—XIV стст. [25], падрабязна апісаў руіны Лідскага замка і зрабіў абмеры. В. А. Шукевіч даследаваў помнікі археалогіі каля Віцебска, Лепеля, каля воз. Дрысвяты. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і ў правядзенні IX Археалагічнага з'езда ў Вільні. У сваім двары Бядулішкі (Нача) з матэрыялаў уласных раскопак сабраў калекцыю археалагічных, нумізматычных, сфрагістычных прадметаў, а таксама калекцыю матэрыялаў антрапалогіі; меліся ў яго зборы і прадметы мастацтва. Некаторыя рэчы з калекцыі В. А. Шукевіча трапілі ў музеі Пецярбурга, Масквы, Кракава, Варшавы, Вільні.

Многія сучасныя даследчыкі звяртаюцца да навуковай спадчыны ранейшых археолагаў, бяруць у іх тое каштоўнае, што і зараз не страціла навуковай вартасці. Вядома, улічваюцца магчымасці таго часу і ніхто не патрабуе ад першапраходцаў узроўню сённяшніх дасягненняў. «Гістарычныя заслугі,— пісаў У. І. Ленін,— прызнаюцца не па тым, чаго не далі гістарычныя дзеячы параўнаўча з сучаснымі патрабаваннямі, а па тым, што яны далі новага параўнаўча са сваімі папярэднікамі» [26].

# МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

Адкрыццё музеяў у Пецярбурзе, Маскве, Адэсе, Керчы, у гарадах Прыбалтыкі спрыяла развіццю музейнай справы на Беларусі, дзе меўся вопыт у збіранні і сегрэгацыі калекцый, а таксама ў стварэнні экспазіцый. Аднак нельга перабольшваць значэнне гэтых збораў для навукі, бо рэдка калі яны станавіліся аб'ектам даследавання. Доказам таму можа служыць вопыт захоўвання радзівілаўскай калекцыі ў Нясвіжскім замку, калі практычна доступ да яе быў закрыты.

Як у Расіі, так і ў большасці краін Еўропы краязнаўцы і археолагі былі звязаны з арганізацыяй і дзейнасцю музеяў старажытнасцей. На Беларусі захапленне краязнаўствам і археалогіяй спалучалася з музейнай справай у Т. Нарбута, Я. Тышкевіча, К. Тышкевіча, А. Кіркора, У. Сыракомлі і некаторых іншых. Менавіта музейны бок дзейнасці, неабходнасць сегрэгацыі археалагічных прадметаў прывялі К. Томсена да адкрыцця «сістэмы трох эпох», якая адыграла выключную ролю ў сусветнай археалогіі. Значэнне музейнай справы, як мы ўбачым далей, у станаўленні гістарычнага краязнаўства і археалогіі выключна важнае.

Пасля ўваходу Беларусі ў склад Расіі актыўным збіральнікам старажытнасцей быў М. П. Румянцаў (1754—1825), арганізатар гуртка гісторыкаў і археографаў у Гомелі. Ён асабіста рыхтаваў экспедыцыі для пошуку старажытных помнікаў; вывучаў манастырскія бібліятэкі; асігнаваў на патрэбы навукі 300 тыс. руб., за што яго называлі «касірам рускай славеснасці». Ён заахвочваў да даследчыцкай дзейнасці І. І. Грыгаровіча. У гомельскім палацы мецэната пастунова назбіралася мноства рэліквій гісторыі і мастацтва краю, тое, што пазней стала асновай вядомага Румянцаўскага музея [1]. У гэтай нумізматычнай калекцыі меліся цэлыя скарбы і асобныя манеты, якія былі выяўлены на тэрыторыі Беларусі. Доступ да іх, як і да іншых каштоўнасцей, што сталі фондавым матэрыялам Румянцаўскага музея, пазней быў адкрыты ўсім даследчыкам, аб чым у 1831 г. паведамлялася ва ўсе губерні Расійскай імперыі [2]. Пра гэта тлумачылася і ў спецыяльнай запісцы. Асобным параграфам статута былі абумоўлены «Правы чыноўнікаў музеума», якія «знаходзяцца на дзяржаўнай службе, карыстаюцца ўсімі яе перавагамі і носяць мундзір, які прысвоены дэпартаментам народнай асветы» [3]. Так пачынаўся агульнавядомы рускі музей, задума стварэння якога пачала рэалізоўвацца на беларускай зямлі, як і сам збор яго ранніх матэрыялаў [4].

З вывазам гомельскіх калекцый у Пецярбург не перапынілася цікавасць да музейнай справы. Новы ўладальнік Гомеля Паскевіч прыбудаваў да палаца вялізную вежу, у якой размясціў музей. Акрамя каштоўнай бібліятэкі тут былі старыя рукапісы, шэдэўры жывапісу і скульптуры, фарфор, срэбра, нефрыт, бронза, прадметы антычнасці. Унікальныя багацці музея рабаваліся пад час апошняй вайны [5].

Разам з гродзенскім мецэнатам А. Тызенгаузам падарожнічала па



Музейная калекцыя гармат у Нясвіжы

Еўропе Ганна Казіміраўна Яблаcоўская (1728—1800) — калекцыянерка, этнограф, эканаміст, дачка генерала артылерыі К. Сапегі. Яна захапілася зборам антыкварыяў. Была ў Парыжы, Рыме. У сваім маёнтку Сямяцічы Гродзенскай губ. сабрала унікальную бібліятэку, калекцыю медалёў, этнаграфічных матэрыялаў, прадметаў з косці, а таксама мела еўрапейскай славы «кабінет натуральнай гісторыі».

Полацкі музей быў адчынены ў 1787 г. пры мясцовай езуіцкай калегіі (з 1812 г.— акадэмія), у адрозненне ад радзівілаўскага і іншых прыватнаўладальніцкіх музеяў яго маглі наведваць выкладчыкі і навучэнцы ўстановы. У экспазіцыі Полацкага музея сустракаліся выпадковыя археалагічныя знаходкі[6]. Тут жа былі розныя дакументальныя рукапісныя матэрыялы, старадрукаваныя кнігі, шматтысячная бібліятэка на розных еўрапейскіх мовах. Магчыма, тады тут быў малавядомы, пазней страчаны Полацкі летапіс, якім карыстаўся В. М. Тацішчаў.

Каля 50 гадоў праіснаваў Полацкі музей, пакуль у 1830 г. міністэрства асветы Расіі не прыняло рашэнне аб закрыцці піярскага вучылішча, музея і бібліятэкі, хоць папячыцель навучальнай акругі Р. І. Карташэўскі выступаў супраць закрыцця. Ён даказваў, што музей і бібліятэку неабходна пакінуць для Беларусі, дзе непараўнальна цяжэй іх камплектаваць[7], і прапаноўваў перадаць кнігі 12 павятовым вучылішчам. Частка бібліятэкі засталася на месцы, 256 пудоў кніг вывезлі, музейныя рэдкасці адправілі ў Маскву, Пецярбург, Вільню і іншыя гарады. Сярод іх былі чатыры мазаічныя карціны, некалькі твораў мастацтва з бурштыну, медалі і іншыя экспанаты. Кіруючыся ўказаннямі пецярбургскага прафесара Папова, былі адабраны лепшыя творы жывапісу для Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў[8]. У паштовым рэестры зафіксавана, што адпраўлена з Полацка дзве скрыні на 160 перагародак кожная, а яшчэ дзве скрыні для карцін і тры скрыні з унікальным сонечным гадзіннікам, мазаічнымі карцінамі, антыкварнымі прадметамі культу. Частка полацкіх скарбаў трапіла ў Маскоўскі універсітэт і іншыя навучальныя ўстановы, а рэшту адправілі ў Вільню, Віцебск і іншыя гарады. Загадкай застаецца лёс полацкіх архіўных матэрыялаў. Толькі значна пазней іх частку адшукаў у цэйхгаузе Сімбірска аматар вывучэння старажытнасцей А. У. Жыркевіч[9]. Яму ўдалося знайсці лі-



Палац у Лагойску

сты з кнігі ганаровых наведвальнікаў Полацкага музея. Сустрэліся яму тут «некалькі пудоў копій з дагавораў XVI—XVII стст.» Усё гэта ў час грамадзянскай вайны бясследна знікла [10].

Па-ранейшаму ў XIX ст. прыцягваў да сябе ўвагу Нясвіжскі музей. Большая частка матэрыялаў гэтага музея ў некалькі этапаў была падзелена паміж культурна-асветнымі і навуковымі ўстановамі Расіі і Украіны, тым не менш ён заставаўся і нават папаўняўся.

Значную работу па вывучэнню нясвіжскіх калекцый у сярэдзіне XIX ст. правёў мясцовы краязнавец Э. М. Катлубай [11]. І ён змог данесці да сучаснага чытача ўяўленне пра старадаўнюю калекцыю, якую збіралі ў сваім замку на працягу амаль трох стагоддзяў дынастыі Радзівілаў. Сваю манаграфію [12] Э. Катлубай пачаў з факта адпраўкі музейных каштоўнасцей у кастрычніку 1813 г. у Харкаў. Аўтар спыніўся на гісторыі некаторых калекцый, у прыватнасці апісаў падборку партрэтаў Радзівілаў і г. д. Акрамя Нясвіжа калекцыі меліся ў Клецку, Капылі, Карэлічах, Цімкавічах. І там Радзівілы трымалі свае зборы «пад ключом». Нават створаная па загаду цара камісія мела права праверыць матэрыялы нясвіжскага, алыкскага архіваў пры ўмове, што нічога «не павінна быць публічна аб'яўлена» [13]. Цяпер цяжка гаварыць аб экспазіцыі музея. Можна толькі здагадвацца па тых звестках, якія прасачыліся ў друк, што збор матэрыялаў ішоў па калекцыях.

Адам Аўгусцінавіч Плятар акрамя археалагічнага і гістарычнага вывучэння краю займаўся калекцыяніраваннем прадметаў старажытнасцей для свайго дамашняга музея. У яго маёнтку Краслаўка Віцебскай губ. знаходзілася багатая бібліятэка, якая мела навуковае значэнне. Не выключана, што скарбамі бібліятэкі і музея карысталася Эмілія Плятар [14], якая натхнёна вывучала помнікі духоўнай культуры Падзвіння.

Частку антыкварыяў А. А. Плятар ахвяраваў Віленскаму музею старажытнасцей, а рэшта згарэла ў перыяд паўстання 1863—1864 гг. Яго

археалагічную калекцыю складалі знаходкі, якія ён выявіў на тэрыторыі Віцебскай губ. і на беларуска-латгальскім пагранiччы. Відаць, пад уплывам збораў А. А. Плятара фарміраваліся дамашнія калекцыі ў яго сваякоў Фелікса і Ігната Плятараў у Бяльмонтах пад Браславам, якія ў час імперыялістычнай вайны былі вывезены ў Петраград.

Не толькі сваяцкія сувязі, але і навуковыя інтарэсы звязвалі дом Плятараў з домам Тышкевічаў у Лагойску. Пры падтрымцы Пія Тышкевіча яго сыны Канстанцін і Яўстрафій арганізавалі к 1842 г. мясцовы музей, дзе змясцілі пераважна матэрыялы краязнаўчага характару, сярод іх археалагічныя — вынік уласных раскопак. Поруч з краёвымі знаходкамі асобна размяшчаўся раздзел прадметаў з Рыма, Фларэнцыі, Неапаля. Але не заходнееўрапейскія рэліквii вызначалі профіль музея. Усе, хто тут бываў, заўважалі агульны кірунак на экспанаванне знаходак, выяўленых на Беларусі — у Мінскай губ., на Лагойшчыне [15]. Нумізматычная і геральдычная калекцыі Тышкевічаў налічвалі 1140 манет, медалёў, гербаў [16]. У бібліятэцы захоўваліся старадрукі і рукапісныя кнігі.

Цяжка меркаваць аб навуковасці апісання музейных экспанатаў, паколькі пра гэта дайшло вельмі мала звестак. Запісы вяліся на польскай мове, у іх часта меліся разыходжанні з народнымі назвамі рэчаў [17]. Датаванне знаходак было на ўзроўні рэчазнаўства сярэдзіны XIX ст. Манеты сістэматызаваліся паводле геаграфічнага прынцыпу, аднак іх апісанне было няпоўным. Паводле каталога ўсе прадметы павінны займаць у музеі сваё адпаведнае месца. Экспазіцыя насіла тэматычны характар. Лагойскі музей братоў Тышкевічаў размяшчаўся ў дзвюх залах палаца — «вялікай» і «малой» [18]. Гэта быў адзін з лепшых беларускіх прыватнаўласніцкіх музеяў таго часу. У 1846 г. К. Тышкевіч вёў перагаворы аб набыцці для Лагойскага музея калекцыі карцін кампазітара князя Міхала Клеафаса Агінскага, якімі ў гэты час уладала яго нявестка [19]. Такім жа чынам ішло камплектаванне нумізматыкі, прадметаў археалагічнага паходжання.

Пазней Тышкевічы арганізавалі яшчэ адну бібліятэку, а пры ёй «кабінет» з этнаграфічна-краязнаўчымі матэрыяламі ў сваім вотчынным маёнтку ў Астрашыцкім Гарадку [20]. Звесткі пра гэта лаканічныя.

У адрозненне ад уладальнікаў Нясвіжскага музея, якія нікога не дапускалі да сваіх каштоўнасцей, браты Тышкевічы самі шырока карысталіся матэрыяламі для навуковых даследаванняў і давалі магчымасць пакарыстацца іншым. Тут плённа працавалі А. Кіркор, І. Крашэўскі, П. Шпілеўскі, П. Янкоўскі і інш. Частку музейных экспанатаў і навуковую бібліятэку лагойскія мецэнаты перадалі ў дар Віленскаму музею старажытнасцей. Выкарыстоўваючы вопыт зарубежных музеяў, у прыватнасці скандынаўскіх, К. і Я. Тышкевічы першымі так шырока прапагандавалі музейную справу, паказвалі ўсім даследчыкам яе вялікія магчымасці ў развіцці навукі і шчыра верылі ў перспектыву развіцця музеязнаўства.

У пачатку XIX ст. Іяхім Храптовіч завяшчаў свой маёнтак Шчорсы разам з вялікай бібліятэкай, архівам і музеем сыну Адаму Храптовічу (1768—1844). Апошні значна пашырыў ранейшыя калекцыі новымі матэрыяламі, а таксама ўкамплектаваў і без таго багатую бібліятэку, пакладаючыся на густ беларускага паэта і фалькларыста Яна Чачота. У Шчорсы пацягнуліся гісторыкі, літаратары, краязнаўцы, этнографы. Зачарпнулі тут звесткі для сваіх твораў А. Міцкевіч, І. Крашэўскі, Я. Чачот і інш.

З пераходам усіх каштоўнасцей ад Адама Храптовіча да яго брата Іераніма яны не толькі не папаўняліся, але рэліквіі пачалі дарыць, раздаваць, прадаваць. У Шчорсы ўжо ехалі больш не даследчыкі, а спекулянты. Каштоўныя матэрыялы расплыліся ў розныя бакі свету, у тым ліку ў Варшаву, Кіеў, Пецярбург, Маскву. Пра веліч шчорсаўскіх збораў гаворыць такі факт, што яшчэ ў 1880 г. вядомы беларускі калекцыянер і даследчык Аляксандр Ельскі налічыў 20 тыс. тамоў літаратуры, хаця ў руках яго быў толькі каталог шчорсаўскай бібліятэкі 1780 г. Апошні ўладальнік Шчорсаў М. Бутэнеў прапіваў антыкварныя рэчы адну за другой або прайграваў іх у карты [21].

Непадалёку ад Вішнеўскага возера ў Дабраўлянах [22] з 1830-х гадоў пачаў збіраць музейную калекцыю Адам Гюнтар, які быў жанаты на сястры ўладальніка Пастаўскага музея — артысткі Аляксандры Тызенгауз. Дом Гюнтараў быў адным з правінцыяльных культурных цэнтраў Беларусі, куды з ахвотай прыязджалі В. Дунін-Марцінкевіч, Т. Зан, С. Манюшка, У. Сыракомля, А. Кіркор, А. Конціі і іншыя, якія пакідалі ў «штамбуху» добразычлівыя водгукі, а часта дарылі дабраўлянскаму музею свае кнігі з аўтографамі, ноты, малюнкі, рэліквіі. У афармленні дабраўлянскага музея адыграў station ролю мясцовы мастак Казімір Бахматовіч (1808—1837) [23]. Высока ацаніў мясцовы музей А. А. Кіркор, адзначыўшы цікавую калекцыю старажытных прадметаў, сярод якіх былі экземпляры зброі крыжаносцаў [24]. Дабраўлянскі музей не меў аналагаў. У ім спалучалася інтэр'ернае і экстэр'ернае размяшчэнне экспанатаў, г. зн. у доме і вакол дома [25]. Сюды былі звезены і пастаўлены некаторыя характэрныя пабудовы бытавога прызначэння. Парк запаўняла мноства помнікаў, у тым ліку і язычніцкія бажкі. У гэтым шматгалоссі не было разладу, ва ўсім адчуваўся густ гаспадара Адама Гюнтара, панавала гармонія. У самім доме, які сваёй знешнасцю напамінаў музей, спецыяльна для яго былі заказаны стылізаваныя вокны і дзверы, аздобленыя мясцовым дэкорам, такая ж была мэбля. У Дабраўлянах знаходзіліся мастацкія творы Рустэма, Смуглевіча, Дамеля, Арлоўскага, шмат экспанавалася мініяцюр. Былі тут і творы антычнасці. Нейкая частка дабраўлянскай калекцыі трапіла і ў Беніцу [26], дзе была замужам за Швайкоўскім дачка А. Гюнтара. Другая дачка — пісьменніца Габрыэля Пузына (1815—1869) — перавезла таксама частку дабраўлянскіх рэліквій у Гарадзілава Ашмянскага павета, куды яна выйшла замуж.

У 1842 г. Т. Зан наведаў Пастаўскі музей графа Канстанціна Тызенгауза і быў уражаны яго багатымі калекцыямі [27]. Музей падзяляўся на два раздзелы: першы — арніталагічны, другі — карцінная галерэя. Экспанаваліся мастацкія палотны як мясцовых, так і зарубежных аўтараў [28]. Былі тут чучалы розных птушак. Другі аматар-арнітолаг Іосіф Слізень з Мсціжоў Барысаўскага павета ў сваіх дамашніх зборах меў калекцыю прэпаратаў насякомых і птушак. Асобна экспанаваліся ў хатнім музеі мясцовыя знаходкі прадметаў археалогіі.

У полымі вайны беззваротна загінула калекцыя карцін мастака Валенція Ваньковіча ў Смілавічах і Шыпянах Ігуменскага павета. Разам з гэтым зборам страцілася бібліятэка, стары архіў Агінскіх, Ваньковічаў і Манюшкаў. Гэтымі матэрыяламі ў свой час карыстаўся кампазітар Станіслаў Манюшка. Тут быў напісаны яго твор «Страшны двор».

Віленскі генерал-губернатар Ф. Я. Міркові 30 чэрвеня 1840 г. аглядаў музейную калекцыю Кабылінскага ў Мінску. Ён бачыў мінералы, скамянеласці, антычныя рэдкасці, нумізматыку, а таксама Статут Вялі-

кага княства Літоўскага і карту Х. Калумба [29]. Нешта накшталт хатняга музея ўбачыў І. Крашэўскі ў 1843 г. у Гарадцы каля Кобрына. Тут была нумізматычная калекцыя і карцінная галерэя, уладальнікам якіх быў Антон Урбаноўскі.

Падарожнік з Польшчы Т. Трыплін, пабываўшы ў 1856 г. у гродзенскім доме князя Чацвяртынскага, убачыў некалькі старажытных шабляў, булаваў, ружжаў, а таксама алейных малюнкаў. Ён лічыў, што гэта быў адзіны прыватны музей у горадзе [30]. Магчыма, у бытнасць Т. Трыпліна гэта быў адзін вядомы прыватнаўласніцкі музей, аднак мы ўжо пісалі, што ў Гродне музейныя калекцыі сустракаліся і ў больш раннія часы — у А. Тызенгауза.

Калекцыі старадаўніх прадметаў, пераважна мясцовага паходжання, меліся ў хатніх музеях у Дзядзілавічах Барысаўскага павета і ў Новых Дзявяткавічах Слонімскага павета, дзе былі сабраны нумізматыка і калекцыя зброі [31]. У палацы Адама Браніцкага ў Росі Ваўкавыскага павета [32], у маёнтку Іосіфа Славінскага ў Раванічах Ігуменскага павета, у двары Лешня роду Саковічаў каля Маладзечна [33] меліся калекцыі антыкварных рэчаў, манускрыпты, рэдкія кнігі, творы мастацтва. У Шчучыне Лідскага павета захоўваліся ўзоры мастацтва, старадаўняя мэбля, посуд, а таксама 50 тамоў сямейнага архіва Друцкіх-Любецкіх [34]. З увагай ставіліся да збору старажытных матэрыялаў у Паланечцы пад Навагрудкам, дзе акрамя даўніх «вырабаў з бронзы» і іншых рэліквій быў нумізматычны кабінет [35]. Так званая «малая збраёўня» была ў двары Пуслоўскіх у Песках Слонімскага павета. Акрамя гэтага ў доме былі старадрукі, мастацкая галерэя, архіў. Даволі значная археалагічная калекцыя мелася ў хатнім музеі ў Косіне Ваўкавыскага павета. Музей гэты знішчыўся ў час паўстання 1863 г.

У сярэдзіне XIX ст. узніклі дамашнія музеі і галерэі ў Веліжы Віцебскай губ., Чарэі, Слуцку, Віцебску [36]. У сярэдзіне XIX ст. заснавалі значную дамашнюю калекцыю графы Чапскія ў сваім маёнтку Станькава пад Мінскам [37].

У канцы 50-х — пачатку 60-х гадоў XIX ст. пачаў ствараць калекцыю дамашняга музея вядомы краязнавец і вучоны Аляксандр Карлавіч Ельскі (1834—1916). У сваім маёнтку Замосце Ігуменскага павета ён сабраў мноства манет, медалёў, прадметаў старажытнай зброі, рэчаў гістарычнай значнасці, рукапісы. У яго сямітысячнай бібліятэцы можна было сустрэць фаліянты рэдкіх выданняў. Ён ездзіў па Беларусі, наладжваў сувязі з аматарамі старажытнасці і такім чынам змог сабраць унікальны для таго часу музей. Яго зборы часткова загінулі, часткова былі вывезены ў іншыя гарады — Львоў, Кракаў, Вільню [38].

У маёнтку Шо на Віцебшчыне Іосіф Жаба сабраў вялікую нумізматычную калекцыю, большасць якой складалі манеты, знойдзеныя на тэрыторыі краю. Захоўваліся ў яго бібліятэцы аўтографы, дакументы, бібліяграфічныя рэдкасці. Віцебскі карэспандэнт «Кур'ера Віленьскага» пісаў, што бібіятэка І. Жабы адчынена «для ўсіх, хто добрасумленна імкнецца да святла», і выказаў думку, што гэтую бібліятэку варта прызнаць за «маці сярод прыватных бібліятэк Віцебшчыны» [39].

Вядомым калекцыянерам лічыўся ў той час і паланізатар Тадэвуш Чацкі (1765—1813), які, жывучы на Беларусі, стараўся не прапусціць ніводнага горада, маёнтка, двара, старой сядзібы, бібліятэкі, касцёла, царквы дзеля прэстыжнага збору рукапісаў, кніг і інш. [40]. Ён меў у Крамянцы ўласныя нумізматычны і натуралістычны кабінеты.

У зборы мінскага калекцыянера Міхаіла Гаусмана [41] знаходзіліся



Будынак Віленскага універсітэта, дзе знаходзіўся музей старажытнасцей

прадметы археалагічных экспедыцый, матэрыялы быту беларусаў. У яго была добра падабраная калекцыя старажытных манет, выяўленых на тэрыторыі краю. Дапамагаў яму ў зборы матэрыялаў бацька беларускага паэта Янкі Лучыны— Люцыян Неслухоўскі, а таксама Т. Дабкевіч, Г. Раманоўскі і інш. У канцы свайго жыцця М. Гаусман арганізаваў археалагічную выстаўку і запрасіў на яе ўсіх, каму ён быў абавязаны плённымі зборамі [42]. Выстаўка засведчыла ўменне калекцыянера весці мэтанакіраваныя зборы матэрыялаў, паводле якіх няцяжка прасачыць усе тры археалагічныя эпохі.

Настойліва збіраў музейныя калекцыі літаратар Юрый Кабылінскі [43]. У яго «хатнім кабінеце» былі карціны розных мастакоў, пераважна яго сучаснікаў, а таксама старыя выданні, манускрыпты. У гэтым музеі захоўваўся рукапісны зборнік жартаў «Тысячы фацэцыяў і адна». Ю. Кабылінскі сябраваў з В. І. Дуніным-Марцінкевічам, у спектаклях якога ён разам з ім выступаў на мінскай сцэне [44].

Рэдкімі матэрыяламі доўгі час папаўнялася прыватная калекцыя ў двары Савічы Слуцкага павета. У палацы вёўся архіў родаў Алелькавічаў, Хадкевічаў, Вайніловічаў яшчэ з пачатку XVII ст. Паводле каталога, у бібліятэцы мелася каля 5 тыс. кніг. У палацы шмат было сабрана прадметаў мастацтва, разьбы па дрэве, сярод іх і мэбля з аздобай. Усе каштоўнасці загінулі пры пажары 6 лютага 1918 г.

У прыватных калекцыях і музеях знаходзіліся найбольш каштоўныя рухомыя помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Абмежаваная магчымасць або ўвогуле недаступнасць іх вывучэння і агляду рабіла гэтыя каштоўнасці здабыткам толькі прывілеяваных асоб. У выйгрышы заставаўся адзін бок справы — ахова помнікаў. І таму вопыт арганізацыі агульнадаступных музеяў у Расіі, Прыбалтыцы, Заходняй Еўропе падказваў ідэю стварэння падобнай установы і на Беларусі, якая б аб'ядноўвала на добраахвотных асновах матэрыялы прыватных калекцый і музеяў. Пачатак паклаў Я. Тышкевіч. Яшчэ ў 1852 г. ён паслаў у Пецярбург пісьмо з дадаткам — праектам музея старажытнасцей. Доўга ішлі бюракратычныя перапіскі, пакуль у красавіку 1855 г. афіцыйна не было дазволена адчыніць музей старажытнасцей у Вільні. Губернатару і кіраўніцтву Віленскай навучальнай акругі даручаўся кантроль за дзейнасцю музея. У адной з буйнейшых залаў бібліятэкі універсітэта пачаліся работы па стварэнні экспазіцыі, прынцыпам якой быў тэматычны, а па сутнасці пакалекцыйны паказ. Экстэр'ер музея ўпрыгожвалі гербы Віленскай, Ковенскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў.

У штат супрацоўнікаў музея ўвайшлі археолагі, краязнаўцы, этно-

графы, гісторыкі, пісьменнікі, сярод іх Яўстафій Тышкевіч, Канстанцін Тышкевіч, Адам Кіркор, Міхаіл Балінскі, Уладзіслаў Сыракомля, Тэадор Нарбут, Міхаіл Гамаліцкі, Ігнат Ходзька, Мікалай Маліноўскі. Усе яны мелі публікацыі, вопыт даследчыцкай і збіральніцкай работы, а некаторыя і вопыт стварэння экспазіцый. Пры музеі была арганізавана Віленская археалагічная камісія. Статут і праграма музея і Археалагічнай камісіі былі агульнымі. Правадзейным і ганаровым членам музея і Археалагічнай камісіі ўручаліся дыпломы ўстаноўленага ўзору.

Старшынёй Віленскага музея старажытнасцей і Археалагічнай камісіі выбралі Яўстафія Тышкевіча, віцэ-старшынёй — Міхаіла Балінскага, сакратаром — Уладзіслава Сыракомлю. Былі абраны правадзейныя члены музея і члены-супрацоўнікі. Усяго 40 чалавек.[45] Афіцыйная цырымонія адкрыцця адбылася 17 красавіка 1856 г.

Першы найбольш буйны ўзнос у фонды музея зрабілі браты Тышкевічы (матэрыялы археалагічных раскопак, творы мастацтва, бібліятэка)[46]. Нумізматыку, геральдыку, кнігі перадаў У. Сыракомля. Асабістыя творы, рукапісы, рэдкія гістарычныя рэчы ахвяравалі А. Кіркор, І. Ходзька, Т. Нарбут, І. Крашэўскі, М. Балінскі і інш.

Знайшліся і іншыя ахвяравальнікі, якія лічылі за гонар здаць свае зборы антыкварыяў з надзеяй, што іх матэрыялы будуць прадстаўлены ў экспазіцыі.

У кнізе рэгістрацыі музейнага фонду значацца самыя розныя экспанаты, якія паступалі з далёкіх і блізкіх гарадоў і мястэчак. Слалі іх шаснаццацігадовы гімназіст Францішак Багушэвіч, пазней вядомы беларускі паэт, настаўнік з Гродзеншчыны Ігнат Кулакоўскі, калекцыянер і выдавец Казімір Буйніцкі з Падзвіння, а таксама А. Кабылінскі са Случчыны, А. Каставіцкі з-пад Мінска, Я. Будкевіч з Магілёўшчыны[47]. Сярод прысланых у музей матэрыялаў былі наканечнікі стрэлаў, каменныя сякеры, прасліцы, акамянеласці, шмат манет, творы мастацтва. Нехта Марцін Капуцкі з Маладзечна даслаў выяўлены ім скарб манет колькасцю каля 100 штук, Міхаіл Тышкевіч перадаў 143 старажытныя манеты. Іх заносілі ў кнігу пярвічнай рэгістрацыі фондаў. Коратка запісваліся толькі асноўныя звесткі аб прадметах. У 1856 г. Віленская археалагічная камісія сваім спецыяльным зваротам прасіла ўсіх зацікаўленых асоб рабіць ахвяраванні для музея старажытнасцей[48].

Паводле «Перечневого каталога предметов в Виленском музее древностей», у 1856 г. было зарэгістравана 1,5 тыс. адзінак захавання археалагічных матэрыялаў, 1 тыс. налічвалі рэчавыя помнікі гісторыі, рукапісы, аўтографы, гравюры, карты, дыпломы. Нумізматычная калекцыя дасягала 3 тыс. грашовых знакаў, мелася 750 адзінак — прадметаў з каменя[49], у тым ліку 387 каменных сякераў. Мастацкія палотны, творы дробнай пластыкі і выяўленчага мастацтва маглі б скласці самастойную галерэю. Складзены ў 1858 г. А. Кіркорам каталог уключаў больш за 10 тыс. адзінак захавання.

Музей меў аддзелы: археалагічны, мастацтва, мінералагічны, арніталагічны. Археалогія была прадстаўлена тымі матэрыяламі, якія былі выяўлены ў асноўным на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Асобна экспанаваліся курганныя знаходкі, якія Я. П. Тышкевіч прывёз са Скандынавіі для практычнага параўнання з адпаведнымі мясцовымі ўзорамі[50]. Найбольшы раздзел экспазіцыі займалі матэрыялы курганных раскопак, праведзеных на Беларусі[51].

Калекцыя з умоўнай назвай «прадметы, якія маюць міфалагічнае значэнне», налічвала 40 рэчаў. Сюды ўваходзілі акрамя літоўскага



Адна з залаў Віленскага музея старажытнасцей

бажка грому Пяркунаса (Перуна) скульптуры мангольскага, кітайскага ідалаў і іншыя экспанаты. У музеі былі таксама прадметы са старадаўніх замкаў, зброя XIX ст., слуцкія паясы,

У нумізматычным аддзеле экспазіцыі ў 1858 г. значылася 3247 адзінак захавання, з іх 246 «рускіх манет і медалёў», 698 — «літоўскіх і рускіх». На жаль, месца знаходак многіх манет не было вызначана. Пры вывучэнні грашовых скарбаў не звярталася ўвагі на колькасную перавагу тых ці іншых манет.

Віленскі музей старажытнасцей шмат у чым пераняў вопыт прыватнаўласніцкіх музеяў. Так, музейная экспазіцыя яго падпарадкоўвалася не храналогіі, а тэматыцы.

Мэтай Віленскай археалагічнай камісіі было ажыццяўленне раскопак на тэрыторыі Беларусі і Літвы, каб пасля гэтыя матэрыялы паступалі ў музей і сталі аб'ектам навуковага даследавання. Старшынёй з'яўляўся Я. П. Тышкевіч, віцэ-старшынёй — М. І. Балінскі, а членамі — Т. Я. Нарбут, К. П. Тышкевіч, А. К. Кіркор, І. І. Крашэўскі і інш. Дзейнічала Археалагічная камісія з 1855 па 1865 г., пакуль па загаду Мураўёва яе не ліквідавалі. Усё ж дзесяць гадоў работы з'явіліся для камісіі вельмі насычанымі і плённымі: слуханне дакладаў аб археалагічных раскопках, абмеркаванне рэфератаў па пытаннях краязнаўства, археаграфіі, дыскусіі па праблемах выяўлення, вывучэння і выдання дакументаў. Члены камісіі распрацавалі метадычную інструкцыю. Сумеснымі намаганнямі складаўся археалагічны слоўнік. Большасць матэрыялаў мясцовых даследчыкаў друкавалася ў «Записках Виленской археологической комиссии».

З арганізацыяй Віленскай археалагічнай камісіі і Віленскага музея старажытнасцей пытанні збору экспанатаў, археалагічных, этнаграфічных, археаграфічных і іншых экспедыцый вырашаліся калегіяльна.

Члены Віленскай археалагічнай камісіі і супрацоўнікі музея старажытнасцей пастаянна падтрымлівалі цесныя сувязі з навуковымі арганізацыямі Расіі, Англіі, Швецыі, Даніі, Швейцарыі Францыі і інш.[52]

Ішоў абмен навуковай інфармацыяй, кнігамі, а таксама былі асабістыя сустрэчы [53]. Усё гэта павышала аўтарытэт археалагічнай камісіі і музея і абавязвала быць на ўзроўні навейшых дасягненняў навукі.

Паўстанне 1863—1864 гг. закранула і Віленскую археалагічную камісію. Улады павялі вайну з так называемай «польскай інтрыгай». Музей рэвізавала створаная Мураўёвым камісія. Экспанаты прызнаваліся «шкоднымі». Іх канфіскоўвалі і адпраўлялі ў Маскву, перадавалі Румянцаўскаму музею [54]. Рэвізія музея перайшла ўсе межы аб'ектыўнасці і выклікала незадавальненне ў грамадскасці. Ранейшая мураўёўская камісія была прызнана некампетэнтнай і заменена новай. 256 экспанатаў музея вярнулі назад у Вільню [55]. Некаторыя з гэтых матэрыялаў пазней трапілі ў Гісторыка-этнаграфічны музей Літоўскай ССР, а таксама ў Нацыянальны музей у Варшаве [56] і іншыя месцы.



Каменная баба, выяўленая ў двары Зубкі каля Клецка

Нягледзячы на цяжкасці ў дзейнасці Археалагічнай камісіі, яна з'явілася першай у краі навукова-даследчай арганізацыяй, якая змагла не толькі ацаніць назапашаны вопыт, але і сваімі ідэямі захапіць новае пакаленне даследчыкаў, якім выпала жыць і працаваць ужо ў наступнай гістарычнай эпосе. Фактычна быў пакладзены пачатак кантролю за археалагічнымі раскопкамі, бо пасля кожнага экспедыцыйнага лета на разгляд камісіі выносіліся навуковыя справаздачы, даклады, а самі матэрыялы станавіліся экспанатамі Віленскага музея старажытнасцей.

У Віцебску і Полацку існавалі «музеумы розных прадметаў лясной гаспадаркі». У адпаведнасці з інструкцыяй ляснога дэпартамента дзяржаўных маёмасцей сюды дасылалі рэчы, якія часта не мелі ніякіх адносін да профілю музеяў. Больш прыходзіла матэрыялаў па этнаграфіі [57].

Немалы ўплыў на развіццё цікавасці да помнікаў мінулага беларускага народа аказалі навуковыя таварыствы, якія знаходзіліся за межамі Беларусі. Створанае ў 1846 г. Рускае археалагічнае таварыства мела сваіх памочнікаў і на Беларусі. Праўда, доўгі час гэтае таварыства не мела спецыяльнага беларускага аддзела. Толькі ў 1908 г. з'явіўся аддзел «літоўскіх старажытнасцей», куды было аднесена і вывучэнне беларускіх археалагічных і гісторыка-краязнаўчых матэрыялаў. Аднак гэта не азначае, што тут раней не цікавіліся Беларуссю. Матэрыялы з гэтага краю паступалі і захоўваліся ў музеі пры Рускім археалагічным таварыстве, аб чым сведчаць пратакольныя запісы паседжанняў. Так, археалагічныя знаходкі прыводзілі з Віцебскай і Мінскай губерняў [58]. Улічваліся ўсе аб'екты археалогіі (з XI ст. да 1700 г.). Акрамя таго, таварыства звярталася да насельніцтва з просьбай паведамляць пра розныя знаходкі, а таксама пра помнікі архітэктуры, археалогіі, асаблі-

ва цікавілася яго старажытнымі рэчамі ў культавых будынках [59], нават рассылала праграму сваіх збораў, якая распаўсюджвалася і па Беларусі [60].

«Калі ў наваколлі новай вёскі,— звярталася Археалагічнае таварыства,— знаходзяцца гарадзішчы, курганы, месцы былых баёў, рэшткі старажытных збудаванняў, то ў такім выпадку апісваць даўнія аб'екты, а пра новыя паведамляць толькі іх назву, каб прывязаць да мясцовасці» [61]. Археолагі з Пецярбурга прасілі таксама паведамляць мясцовыя назвы розных частак помніка, а таксама народныя паданні.

У 1856 г. цыркулярна распаўсюджвалася новая «Запіска Археалагічнай камісіі імператарскага Археалагічнага таварыства аб праграме збору звестак пра помнікі даўніны» [62]. Гэты дакумент у адрозненне ад папярэдняга дапаўняўся пытаннямі аб ахове і магчымым рамонце некаторых помнікаў.

Рассылаліся надрукаваныя праграмы для статыстычнага апісання Віленскай губ. Як водгук на іх паступалі рукапісныя матэрыялы, дзе аўтары заўсёды трымаліся толькі адной статыстыкі, а часта давалі краязнаўчыя апісанні гарадоў, мястэчак і самога губернскага цэнтра.

Карысць ад такіх зваротаў да насельніцтва была відавочная. Але яшчэ і да таго, як узніклі гэтыя «запіскі», людзі добраахвотна здавалі свае знаходкі ўладам.

У археалогіі не апошняе месца займае нумізматыка. Асаблівае значэнне надавалася і надаецца манетным скарбам. Іх пошукі амаль ніхто ніколі не планаваў. Яны часцей за ўсё адшукваліся выпадкова. Калі ў наш час многія манетныя скарбы трапляюць у музеі, дык у XIX ст. яны або зусім траціліся для навукі, або, перайшоўшы праз некалькі рук, даходзілі да зацікаўленых асоб. Гісторыя знаходак скарбаў на тэрыторыі Беларусі, як і ў многіх краінах, была таксама даволі драматычная, і яна дае яскравыя прыклады для характарыстыкі не толькі ўзроўню навукі, але і адносін розных слаёў насельніцтва да гэтых помнікаў мінулага. Часта непісьменны селянін праяўляў большую сумленнасць, чым памешчык ці чыноўнік у адносінах да выяўленага ў зямлі старадаўняга скарбу.

Дылетанцтва панавала не толькі сярод непісьменных ці малапісьменных нізоў, гэтым у большасці выпадкаў вызначаліся і адукаваныя вярхі. Толькі нязначная частка манетных скарбаў і іншых каштоўнасцей трапляла ў музеі. Вызначальнікамі манет былі нешматлікія дапаможнікі. Карысталіся маскоўскім выданнем 1834 г. «Апісання старажытных рускіх манет». Спецыяльна гербам Вялікага княства Літоўскага прысвячалася работа Б. Кёнэ [63]. Для аматараў геральдыкі некаторую інфармацыю даваў «Гербоўнік польскі» К. Нясецкага [64]. Аб польскіх медалях мелася работа Ф. Бянткоўскага, у якой сярод апісаных 879 экземпляраў 21 манета была з Нясвіжа [65].

Не толькі нумізматыкай, геральдыкай і сфрагістыкай вычэрпвалася цікавасць народа да мінулага роднага краю. Збіраліся звесткі пра старажытныя прадметы культу ў цэрквах, касцёлах, мячэцях. З такімі запытаннямі ў 1829 г. мінская епархія разаслала свае анкеты. Адказаў прыйшло шмат, аднак у большасці выпадкаў гэта былі звычайныя казённыя адпіскі. Здзіўляе тая акалічнасць, што нічога істотнага не паведамілі культавыя ўстановы з павятовых цэнтраў, хоць тут звычайна канцэнтравалася шмат розных прадметаў антыкварыяту [66].

Збіраў звесткі пра гістарычныя помнікі на беларускай зямлі заснаваны ў 1837 г. музей старажытнасцей пры Кіеўскім універсітэце, які

прасіў у тым жа 1837 г. прысылаць «рознага роду старажытнасці, што заслугоўваюць увагі і з якіх можна мець карысць для навукі» [67]. Усе дасланыя матэрыялы, як тлумачыцца ў інструкцыі, павінны пайсці ў музей пры Кіеўскім універсітэце.

Найбольшую цікавасць выклікала знаходка каля Віцебска шэрага дзікага каменя з адлюстраваннем постаці з некаторым падабенствам да чалавека. Да гэтага «дзіва» пацягнуўся народ. Пачаліся разгадкі, хто гэта ўвасоблены ў граніце. Занепакоіўся віцебскі губернатар І. С. Жыркевіч, якому даносіў пра зборышчы людзей епіскап полацкі і віленскі Ісідар, тлумачачы небяспеку, ад якой «могуць быць шкодныя вынікі» [68]. Няўменне растлумачыць помнікі, іх прызначэнне і выклікала такое рэагаванне ў людзей, царкоўнікаў, прадстаўнікоў улады.

У Рагачоўскім павеце выявіліся дзве медныя гарматы з гербамі, якія былі адліты ў Жлобіне ў 1769 г. вядомым майстрам-ліцейшчыкам Крыстофам Чахоўскім. Пасля двухгадовай валакітнай перапіскі музейныя рэліквіі адправілі ў Кіеў [69]. Гэта ўжо прыклад настойлівасці тых, хто жадаў выратаваць помнік.

У спецыяльным пісьме пецярбургскія вучоныя звярталіся да жыхароў Расійскай імперыі адносна збору акамянеласцей, рабіўся напамінак пра косці насарогаў, мамантаў. Хоць і мала, але былі водгукі, былі і пасылкі з матэрыяламі, якія ішлі да мясцовых губернатараў. Акамянелае дрэва вагой 25 фунтаў з в. Сляпцы Мазырскага павета было дастаўлена ў 1832 г. губернатару Скапіну [70]. «Незвычайнага аб'ёму і велічыні» костку знайшоў селянін з в. Хлясіна Рослаўскага павета [71]. Ды і сам мінскі губернатар рассылаў просьбы паведамляць яму пра рэшткі старажытных жывёл, а таксама пра археалагічныя знаходкі і іншыя прадметы даўніны [72].

Царская адміністрацыя не дбала пра ахову помнікаў. Не выпрацаваны быў прынцып адбору аб'ектаў пад ахову. Часта кіраваліся старым пятроўскім указаннем браць тое, «что зело старо и необыкновенно». Паступалі звесткі ў Акадэмію навук у Пецярбург пра кепскі стан помнікаў гісторыі і культуры на Беларусі.

Яшчэ ў 1819 г. Ю. Нямцэвіч пісаў пра разбурэнні замка ў прадмесці Пінска (Лешч) і нагадаў пра захаванасць толькі дзвюх вежаў. У Заполлі, каля Пінска, гэты ж падарожнік убачыў руіны яшчэ аднаго замка. Тыя ж «эмоцыі» ён зведаў і ў Навагрудку [73]. Тут знаходзіўся ў занядбанні вядомы гістарычны замак — помнік архітэктуры часоў Вялікага княства Літоўскага. Мясцовы гараднічы паводле ўказанняў гродзенскага губернатара ў лютым 1802 г. аддаў загад разбіраць вежы, а камень выкарыстоўваць на брукаванне вуліц Навагрудка [74]. Гэта збудаванне і ў той час было ўжо ў кепскім стане, але не катастрафічным. Толькі вайна 1812 г. перашкодзіла да канца разабраць увесь замак. Такія выпадкі былі не адзінкавыя. Нарэшце дзяржаўныя органы кіравання вымушаны былі ў 1824 г. даць распараджэнне, каб ніякія старажытнасці ў «приобретенных от Польши губерниях не были разбураемы без особенной осмотрительности» [75].

Патрэбны былі больш радыкальныя меры. 31 снежня 1826 г. Мікалай І выдаў «высочайшее повеление», у якім гаварылася «о доставлении сведений об остатках древних зданий в городах и о запрещении разрушать оные». Аднак тут жа ўдакладніў: «Разрушать их не должно, но и чинить ненужного не надобно, а поддерживать одне ворота или такие здания, в которых есть нужные помещения...» [76]

Ажыццяўляць кантроль за выкананнем на месцах царскага загаду

даверылі малакампетэнтнаму органу — дэпартаменту дзяржаўнай гаспадаркі і публічных будынкаў. Апошні і рассылаў па ўсіх губернях свае цыркуляры, якія датычыліся помнікаў архітэктуры. Прадпісвалася здымаць планы помнікаў, вызначаць іх пашкоджанасць і складаць каштарысы на рамонт ці рэстаўрацыю. У тлумачальнай запісцы павінна быць сказана, для чаго будуць выкарыстаны аднаўленыя збудаванні [77].

Прапаноўвалася анкета для мясцовых чыноўнікаў, якія павінны былі даць вычарпальныя адказы. Была істотная парада: для складання планаў, выканання замалёвак помнікаў старажытнасцей раілася запрашаць кампетэнтных у гэтай справе людзей.

На першы погляд гэта разумная мера афіцыйных улад павінна была даць свой плён. Аднак на месцах часцей за ўсё не знаходзілася дасведчаных людзей і выконвалі яе старасты, гараднічыя, нават паліцыя. Вось чаму многія з іх нават і адказаў не давалі, а тыя, хто адважваўся даваць, могуць выклікаць толькі здзіўленне і расчараванне. Вось адзін з такіх узораў адказа. Гараднічы з Копыся з дапамогай каморніка Ялмашэвіча склаў план мясцовага ўмацавання. У запісцы сказана: «Крепость состоит из земли насыпаная. Об оной знать не можем. Обросшая дерном, от Днепра диким камнем накачана» [78]. За «выкананую» работу гараднічы прасіў магілёўскага губернатара заплаціць «пагонныя вёрсты ад Копыся да Магілёва і назад» [79].

Пра помнікі паступалі адказы, якія складаліся з двух слоў: «Таковых нет». Вельмі рэдка сустракаюцца поўныя апісанні старажытных аб'ектаў. Падрабязна апісана Рагачоўскае замчышча, якое абнесена крапасным валам, што падмываецца вадой р. Друць. Як паведамляў аўтар гэтай запіскі, на месцы былога замка ўзвышаецца драўляны псеўдагатычнага стылю касцёл. У гэтай жа запісцы, адрасаванай губернатару, прыводзяцца крыніцы, якімі карыстаўся даследчык [80].

З таго ж Рагачова земскі суддзя рапартаваў, што «каля Дняпра, справа па цячэнні ракі, пад Кісцянямі і Вішчынам... ёсць толькі земляныя акопы ў невялікай колькасці і на невялікай плошчы. Другі акоп каля вёскі Зборава па левую руку Дняпра» [81]. На самой справе гэта былі не «акопы», а курганы. Пра рагачоўскія помнікі старажытнасцей у архівах сустракаецца многа цікавых матэрыялаў. Трэба меркаваць, што ў гэтым павеце імі займаўся нейкі для таго часу дасведчаны чалавек. У другіх жа гарадах мясцовыя чыноўнікі нічога не выявілі.

Інфармацыі пра помнікі старажытнасці сабралася небагата. Некаторыя з іх проста разбураліся, як, напрыклад, Мікольская царква ў Магілёве ці шматлікія археалагічныя аб'екты, і такія факты даходзілі да цэнтра навукі Расіі — Пецярбурга. Вось чаму ў 1837 г. па краіне прайшла новая хваля апытанняў. На пісьмо Мінскага цывільнага губернатара давалі адказы перш за ўсё чыноўнікі. Калі гараднічыя Вілейкі, Мазыра і іншых гарадоў нічога не маглі адказаць, то слуцкі гараднічы І. Андрыеўскі аптымістычна заявіў, што гатоў збіраць звесткі пра мясцовыя старажытнасці і перш за ўсё звесткі пра павятовы цэнтр [82].

Невядомы краязнавец Міхаіл Лукашэвіч старанна апісаў помнікі Пінска. Ён указаў на знаходжанне каля р. Піны землянога ўмацавання, якое «мае выгляд правільнага паўкруга, папярэчнік даходзіць да шасцідзесяці сажняў, было абводнена, як можна заўважыць па ўпадзінах, якія засталіся, ровам...» [83] Аўтар дакладной запіскі зрабіў апісанне і пінскага замка, ад якога засталіся сляды рова і вала: «Даўжыня сцяны больш за дваццаць сажняў, вышыня паўразбураных варот да двух

сажняў, а па другой — у тры... Замак цікавы тым, як абарончае ўзвядзенне для Караліна і Пінска. Паўночна-заходні бок быў пануючым над будынкамі абодвух частак горада. Дарогі, якія вялі ў Валынскую губерню, у Брэст, Мінск, былі зусім адкрыты на значнай прасторы» [84]. Тут ужо не проста інфармацыя, а спроба заглянуць у глыбіню вякоў, спроба ўявіць выгляд старажытнага помніка Пінска ў гады найлепшага стану, абгрунтаваць узнікненне помніка менавіта тут, а не ў іншым месцы. М. Лукашэвіч указаў таксама і на Ляшчынскі манастыр, узнікненне якога адносіў да часоў Уладзіміра Манамаха. Яго цікавілі і мясцовыя курганы, у сутнасці якіх ён яшчэ не мог разабрацца [85].

Даволі падрабязную «ведамасць» пра замкавыя ўмацаванні ў Радашковічах склаў у 1838 г. Ігнат Марцінкоўскі [86], маючы на ўвазе абарончае збудаванне каралевы Боны. Замак стаяў паміж дзвюма рэчкамі — Гуйкай і Вязынкай, меў умацаванні. Інфарматар зрабіў абмеры замчышча, успомніў пра вежы і інш. Пазней гэты аб'ект вывучалі А. Я. Міцянін, М. В. Вараксін [87], а М. А. Ткачоў даў уяўленне аб прынцыпе пабудовы і абарончым значэнні гэтага замка [88].

С. Папейка з Маладзечна апісаў мясцовае замчышча над р. Вушой і рэшткі палацавага збудавання XVII—XVIII стст., зрабіў абмеры землянога вала [89]. Пра гарадзішча ў Насілаве каля р. Азярышча паведамляў нехта Г. Сарока з Вілейскага павета [90]. Б. Дзядзіцкі даслаў інфармацыю пра земляныя ўмацаванні ў Гарадку, што ў 18 км на поўдзень ад Маладзечна.

Не без удзелу тады ўжо добра вядомага даследчыка-археолага К. Тышкевіча складалася даведка аб Лагойскім замчышчы [91].

Абавязкі па ахове помнікаў гісторыі і культуры былі ўскладзены на паліцыю. Як нельга лепш характарызуе гэты казённы падыход такі прыклад. Органы ўнутраных спраў у Полацку не маглі разабрацца, што ў гэтым горадзе мае каштоўнасць для гістарычнай навукі, і афіцыйна паведамілі, што ў горадзе ніякіх старажытнасцей не выяўлена, акрамя дома Пятра I. І толькі тады, калі з Пецярбурга прыйшло новае пісьмо-напамінанне аб велічных помніках дойлідства — Сафійскім саборы і Спаса-Ефрасіннеўскай царкве, полацкая паліцыя як магла, так і апісала тутэйшыя манастыры і цэрквы [92].

Нават тое, што захавалася да XIX ст., цяпер разбуралася. У пэўнай меры ў гэтым разбурэнні помнікаў адыграла сваю найгоршую ролю вайна 1812 г. Такі лёс напаткаў замак у Маладзечне, які напярэдадні вайны належаў роду Агінскіх, а пасля вайны перайшоў ва ўладанне вядомага кампазітара і дыпламата Міхала Агінскага (1765—1833). Апошні ўжо не аднаўляў маладзечанскі замак, які быў узведзены на месцы былога старажытнага ўмацавання. Так пазней і прадаўжала ўсё гэта рушыцца да поўнага знішчэння сцен, якія сяляне разбіралі для сваіх патрэб. Гэтак жа разбіраліся сялянамі навакольных вёсак сцены геранёнскага і гальшанскага замкаў. Для сваіх гаспадарскіх патрэбаў развозілі жыхары мястэчак Крэва цэглу з вядомага гісторыка-архітэктурнага помніка. Здзіўляе і тое, што ўсе гэтыя акты вандалізму здараліся тады, калі царом быў падпісаны ў 1848 г. новы ўказ аб ахове помнікаў.

У гэтым указе закраналіся пытанні аховы тых культавых будынкаў, якія па сутнасці з'яўляліся помнікамі старажытнасці. Вось чаму ў 1848 г. вёўся рамонт царквы і старажытнага манастыра ў Барунах Ашмянскага павета [93], у 1854 г.— манастыра бернардзінак у Беніцы таго ж павета [94].

Для захавання полацкай Спаса-Ефрасіннеўскай царквы яшчэ ў 1831 г. мясцовыя ўлады вырашылі пачаць яе рамонт. Спецыяльна агаворана было, што ўнутры помніка старажытнабеларускага дойлідства ёсць росписы, якія да таго ж з'яўляюцца яшчэ і помнікам пісьменнасці [95]. Генерал-губернатару віцебскаму, смаленскаму і магілёўскаму ўказвалася з боку пецярбургскай вярхоўнай улады на неабходнасць папераджальных ахоўна-рэстаўрацыйных работ: «Для захавання яе (царквы.— *Г. К.*) ад пашкоджання ў непагадзь за кошт казны зрабіць сваё распараджэнне» [96]. Губернатар адмовіўся ўзяць на сябе такую адказнасць, спаслаўшыся на тое, што «ў маёнтку Спас жыве пан Ігнат Пяткевіч, які няхай і рамантуе» [97]. Чыноўнікі з міністэрства ўнутраных спраў вырашылі перадаць Спаса-Ефрасіннеўскую царкву ў ведамства грэка-расійскага духавенства. І нават пасля гэтага доўга яшчэ цягнулася перапіска, пакуль высвятлялі, хто ж возьме на сябе адказнасць, хто будзе рабіць рамонт і як [98]. Праз тры гады было аб'яўлена, што помнік архітэктуры адрамантаваны, і ў 1834 г. тут пачалося адпраўленне службы. Прыкладалася і гістарычная даведка, у якой расказвалася пра лёс гэтага храма [99]. Акрамя таго, знаходзім такія ж даведкі пра Барысаглебскі, або Бельчыцкі, манастыр [100]. Невядомы аўтар даведкі аказаўся няўдалым даследчыкам гісторыі Полаччыны. Хаця ён прывёз апісанне крыжа Ефрасінні Полацкай, які быў выкананы майстрам Лазарам Богшам у 1161 г. [101], а таксама пералічыў найбольш каштоўныя рэчы храмаў, аднак зрабіў памылкі: Бельчыцкі манастыр узведзены не ў 1220 г.[102], а ў пачатку XII ст. [103] Барысам Усяславічам, а не Генвілавічам.

На Беларусі ў эпоху феадалізму выпадкі рамонту, такія, як старажытнага храма ў Полацку, хаця і рэдка, але былі. Затое не сустракалася ніводнага навукова абгрунтаванага прыкладу рэстаўрацыйных работ па аднаўленні помнікаў архітэктуры і археалогіі. Звычайна рабілі цякучы рамонт старажытных збудаванняў, пераважна культавых. Не было выпадку правядзення хоць невялікага рамонту якога-небудзь нежылога замка. Таму і не дзіва, што прыходзілі ў заняпад і разбураліся колішнія фартэцыі ў Лідзе, Навагрудку, Крэве, Міры, Крычаве, Гродне, Геранёнах, Старым Быхаве, Смалянах, Ляхавічах і ў іншых месцах. Гэта характарызавала адносіны адміністрацыі да помнікаў старажытнасці, калі словы розных указаў і распараджэнняў разыходзіліся з іх рэальным выкананнем. Толькі часам пасля напамінкаў зверху (як гэта было, напрыклад, у Гродзенскім губернскім праўленні ў сярэдзіне XIX ст.) пачыналі збіраць звесткі аб стане помнікаў і рабілі некаторыя крокі па іх ахове [104]. Дарэчы, у Гродзенскай губ. збор звестак пра курганы, гарадзішчы, нумізматычныя скарбы даручаўся статыстычнаму камітэту [105]. Гэтым камітэтам, напрыклад, складзена была гістарычная даведка пра Каложскую царкву [106].

Усе прыведзеныя прыклады паказваюць, у якім дрымучым стане знаходзілася справа аховы і выкарыстання помнікаў старажытнасці на Беларусі. А гэта ў сваю чаргу з'яўлялася часткай агульнага працэсу станаўлення гістарычнага краязнаўства і археалогіі Беларусі.

Музейна-збіральніцкая дзейнасць на Беларусі дапаўняла працэс станаўлення археалогіі і краязнаўства. Менавіта калекцыянерства стала пачаткам музейнай справы. Хаця калекцыянерства насіла прыватнаўласніцкі характар, аднак яно засцерагло ад звычайных страт каштоўныя гістарычныя рэліквіі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Яшчэ ў сярэднявеччы зарадзілася звычайная патрэба ў апісанні сваёй мясцовасці, цэлага рэгіёна, у фіксацыі ўсяго адметнага, што з часам пераходзіла ў свядомы адбор краязнаўчых матэрыялаў. Пачыналася з аматараў-адзіночак, а ўжо ў сярэдзіне XIX ст. дасягнула арганізацыйных формаў вывучэння краю. Такімі з'явіліся перш за ўсё Віленская археалагічная камісія і Віленскі музей старажытнасцей, а пазней музеі ў губернскіх цэнтрах — Магілёве, Віцебску, Гродне, Мінску.

Даследчыкамі, намаганнямі якіх беларуская археалогія і гістарычнае краязнаўства атрымалі шырокае прызнанне і вядомасць, у той час былі З. Даленга-Хадакоўскі, Т. Нарбут, Я. Тышкевіч, К. Тышкевіч, А. Кіркор, М. Кусцінскі, У. Завітневіч, В. Шукевіч, Е. Раманаў і інш. За невялікім выключэннем, у жыцці тагачасных даследчыкаў былі і цяжкія гадзіны ссылак, адлучэння ад любімых заняткаў, вымушаныя эміграцыі (З. Даленга-Хадакоўскі, А. Кіркор, Р. Друцкі-Падбярэзскі, Я. Чачот, У. Сыракомля і інш.), што з'явілася вынікам іх прагрэсіўных поглядаў, нязгоды з тагачасным ладам насілля і бяспраўя.

Аналіз разнастайных матэрыялаў па гісторыі вывучэння беларускіх старажытнасцей сведчыць, што ўжо ў дарэформенны перыяд археалогія вылучылася ў самастойную галіну ведаў, перажыла важны этап свайго станаўлення. Яе даныя хоць і рэдка, але пачалі выкарыстоўвацца для рэканструкцыі гістарычнага мінулага.

Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі не адставалі ад іншых раёнаў Расіі і суседніх дзяржаў: даследчыкі паводле матэрыялаў раскопак заўважылі ўзаемаўплывы розных этнакультур, асабліва славянскай і балцкай, вызначылі іх найбольш характэрныя рысы, карысталіся пры гэтым данымі тапанімікі, этнаграфіі, фалькларыстыкі, археаграфіі; з дапамогай параўнальна-гістарычнага метаду археолагамі падводзіліся вынікі даследаванняў помнікаў старажытнасцей, пераймаўся вопыт вучоных іншых краін, у прыватнасці ўслед за вядомым дацкім археолагам К. Томсенам на беларускім матэрыяле была пацверджана «тэорыя трох эпох»; археалагічныя раскопкі, іх матэрыялы давалі вучоным падставы рабіць тэарэтычныя вывады, адначасова набываўся вопыт палявых экспедыцый, выпрацоўвалася навуковая тэрміналогія; прадмет, які знаходзілі пры археалагічных раскопках, стаў набываць значэнне крыніцы, што адпаведна прывяло да пачатку навуковага рэчазнаўства; змяшчэнне матэрыялаў раскопак у экспазіцыях музеяў павышала аўтарытэт археалогіі ў даследаванні старажытнай гісторыі краю і ў гэтым аспекце яшчэ цяснейшая была сувязь з гістарычным краязнаўствам; у XIX ст. публікацыі пра асобныя знаходкі і матэрыялы археалагічных экспедыцый з'яўляліся на старонках перыядычных выданняў, звесткі краязнаўчага характару траплялі ў тагачасныя падручнікі, аб многім паведамлялася на пасяджэннях навуковых арганізацый Вільні, Масквы, Пецярбурга, Кіева, Кракава, Варшавы; вучоныя,

передавая грамадскасць Беларусі нават ва ўмовах прыватнай уласнасці на зямлю, а заадно і на помнікі старажытнасці ставілі задачу аб іх ахове, аб іх рэстаўрацыі; сам працэс станаўлення і развіцця гістарычнага краязнаўства і археалогіі Беларусі ўцягваў у сферу навуковых пошукаў усё новых даследчыкаў, тым самым уплываў на фарміраванне свядомасці мясцовай інтэлігенцыі; усталёўвалася пераемнасць паміж пакаленнямі вучоных, менавіта дзякуючы гэтай даўняй традыцыі некаторыя аспекты тагачасных адкрыццяў сталі здабыткам гістарычнай навукі; паскораны працэс станаўлення археалогіі дазволіў ёй да сярэдзіны XIX ст. вылучыцца ў самастойную галіну ведаў.

У сувязі з нераспрацаванасцю многіх праблем сённяшняй гістарыяграфіі і крыніцазнаўства гісторыі Беларусі зварот да разгледжаных аўтарам матэрыялаў можа выклікаць яшчэ не раз даследчыцкую зацікаўленасць і ў будучым. Абавязковай умовай кожнай навукі якраз і з'яўляецца ўзбагачэнне яе вопытам папярэдніх вучоных. Пры сучаснай інтэнсіўнасці раскопак, масе публікацый усё ж многае застаецца гіпатэтычным, і, напрыклад, яшчэ доўга будуць ісці дыскусіі пра паходжанне славян, у тым ліку і насельнікаў Беларусі, аб чым гаворка ішла ўжо больш за паўтара стагоддзя назад. Бясспрэчна, усё зробленае крытычна аналізавалася і будзе аналізавацца з улікам апошніх дасягненняў гістарычнай навукі. Менавіта зыходзячы з яе сённяшняга ўзроўню і можна канстатаваць, што беларускае краязнаўства і археалогія к канцу XIX ст. прайшлі важны этап свайго станаўлення і развіцця.

# ЗАЎВАГІ

### ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

[1] Тышкевич К. О курганах в Литве и Западной Руси: Археологическое исследование. Вильна, 1865; Wiadomość historyczna o zamkach, horodyszczach i okopiskach starożytnych na Litwie i Rusi Litewskiej przez. K. Tyszkiewicza.— TW, 1858.
[2] Tyszkiewicz K. O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej : Studium archeologiczne. Berlin, 1968.
[3] Tyszkiewicz E. Opisanie powiatu Borysowskiego. Wilno, 1847; Badania archeologiczne nad zabytkami przedmiotów sztuki rzemiosł i t. d. w dawnej Litwie i Rusi Litewskiej. Wilno, 1849.
[4] Брэжга Баляслаў Рычардавіч (1887—1951) — археограф, гісторык мастацтва і славіст. Нарадзіўся пад Рэжыцай (Рэзэкне) Віцебскай губ. Скончыў Віцебскую гімназію, Маскоўскі археалагічны інстытут. Працаваў прафесарам Маскоўскага археалагічнага інстытута, у Віцебскім архіве, прафесарам Рыжскага універсітэта імя П. Стучкі.
[5] Brężgo B. Ochrona zabytków przedhistorycznych w Witebszczyznie i w Inflantach Polskich. W-wa, 1928, s. 5.
[6] Brężgo B. Muzeja Witebskie. W-wa, 1926.
[7] Каспяровіч М. З гісторыі краязнаўства (беларускага).— Наш край 1928, № 2, с. 13—19; Ён жа. Краязнаўства. Мн., 1929; Ён жа. Беларуская навука да Кастрычніка і пасля яго.— Маладняк, 1928, № 10.
[8] Дубінскі С. А. Бібліяграфія па археалогіі Беларусі і сумежных краін. Мн., 1933.
[9] Каспяровіч Мікалай Іванавіч (1900—1945) — краязнавец, этнограф, мовазнавец і літаратуразнавец. Нарадзіўся ў в. Ізабеліна Ігуменскага павета. У 1926—1930 гг. навуковы сакратар Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інбелкульце.
[10] Дубінскі Сяргей Антонавіч (1884—1937) — археолаг. Нарадзіўся ў в. Нароўкі Бельскага павета Гродзенскай губ. Скончыў Пецярбургскі універсітэт. Працаваў у Інбелкульце і ў Інстытуце гісторыі АН БССР. Даследчык і аўтар прац па культурах жалезнага веку на Беларусі.
[11] Ламака М. Вывучэнне Магілёўшчыны.— Магілёўшчына, 1927, т. 1, с. 150—155.
[12] Васілеўскі Д. Сталецце краязнаўчай працы на Беларусі.— Наш край, 1926, № 2/3.
[13] Никольский Н. М. Проблемы древней истории Белоруссии.— Вестн. древней истории, 1938, № 1, с. 164—175.
[14] Пичета В. Очередные вопросы белорусской историографии.— Вестн. нар. комиссариата просвещения ССРБ, 1922, № 11/12, с. 30/32.
[15] Перцаў У. М. Гістарычная думка ў Беларусі ў XVI—пачатку XX стагоддзя.— ВАНБ, 1957, № 2, с. 15—27.
[16] Бандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. Мн., 1964; Ён жа. Основные этапы и тенденции в развитии дореволюционной белорусской этнографии. М., 1964.
[17] Пилипенко М. Ф. Этнография Белоруссии. Мн., 1981, с. 13—46.
[18] Очерки истории исторической науки в СССР. М., 1955, т. 1, с.. 523—535.
[19] Формозов А. А. Очерки по истории русской археологиии. М., 1961, с. 7—8.
[20] Формозов А. А. Некоторые итоги и задачи исследований в области истории археологии.— СА, 1975, № 4, с. 7.
[21] Формозов А. А. Некоторые итоги и задачи исследований в области истории археологии.— СА, 1975, № 4, с. 7.
[22] Формозов А. А. Очерки по истории русской археологии, с. 67—69.
[23] Алексеев Л. В. Очерки истории белорусской дореволюционной археологии и исторического краеведения до 60-х годов XIX в.— СА, 1967, № 4, с. 149—163; Ён жа. Белорусская археология и историческое краеведение во второй половине XIX — на-

чале XX в.— СА, 1968, № 3, с. 85—100; Ён жа. Вяртаючы народу мінулыя стагоддзі.— Полымя, 1969, № 12, с. 189—200.

[24] Будько В. Д. и Митрофанов А. Т. Археология Белоруссии за советский период.— СА, 1967, № 4, с. 123—145.

[25] Гісторыя Беларускай ССР. Мн., 1972, т. I, с. 5.

[26] Там жа, с. 12.

[27] Пяткевіч А. Сцежкамі роднага краю.— У зб.: Наднёманскія былі. Мн., 1968.

[28] Калеснік У. Зорны спеў. Мн., 1975.

[29] Мальдзіс А. Астравеччына, край дарагі... Мн., 1977.

[30] Kostszewski J. Dzieje polskich badań przedhistorycznych. Poznań, 1949.

[31] Abramowicz A. Wiek archeologii. Problemy polskiej archeologii dziewiętnastowiecznej. W-wa, 1967; Dalecy i bliscy.— Acta archeologica Łodziensia. Łódź, 1974, N 23; Urny i cerannie. Łódź, 1979.

[32] Abramowicz A. Dalecy i bliscy..., s. 65.

## РАННІ ЭТАП ГІСТАРЫЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА

[1] ПВЛ. М., 1950, ч. 1, с. 207.

[2] Там жа, с. 209.

[3] Там жа.

[4] Там жа, с. 207.

[5] Там жа, с. 210.

[6] Там жа, с. 215.

[7] Очерки по археологии Белоруссии. Мн., 1972, ч. II, с. 72—149.

[8] ПВЛ, ч. 1, с. 159.

[9] Чамярыцкі В. А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. Мн., 1969, с. 6.

[10] Там жа.

[11] ПСРЛ. М., 1975, т. 32.

[12] Сборник летописей, относящихся к истории Южной и Западной Руси. Киев, 1888; ПСРЛ, т. 32.

[13] ПСРЛ, т. 32, с. 174—175.

[14] Там жа, с. 174.

[15] Там жа, с. 175.

[16] Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Мн., 1968, т. 1, с. 267.

[17] Хроника Быховца. М., 1966; ПСРЛ, т. 32, с. 128—173.

[18] ПСРЛ, т. 32, с. 38—39.

[19] Stryjkowski M. Kronika Polska, Żmódzka i wszystkiej Rusi. W-wa, 1846.

[20] Стрыйкоўскі Мацей (каля 1547—каля 1586) — гісторык, паэт. Пасля вучобы ў Кракаўскай акадэміі жыў на Беларусі. У час падарожжа па краі збіраў гістарычныя матэрыялы. Дзякуючы яму дайшлі да нас рэдкія звесткі аб мінулым Беларусі.

[21] Рогов А. И. Русско-польские культурные связи в эпоху Возрождения. М., 1966, с. 177; Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильна, 1870, т. IX, с. 53—55.

[22] Рогов А. И. Русско-польские культурные связи..., с. 151.

[23] Воронин Н. Н. Древнее Гродно.— МИА. М., 1954, № 41, с. 149.

[24] Рогов А. И. Русско-польские культурные связи..., с. 136—138; ПСРЛ, т. XVII, с. 232, 245—246, 300—301, 362, 427, 479; Булкин В. А., Дубов И. В., Лебедев Г. С. Археологические памятники Древней Руси IX—XI вв. Л., 1978.

[25] Татищев В. Н. История Российская. М., 1963, т. II, с. 123.

[26] Сапунов А. П. Двинские, или Борисовы, камни. Витебск, 1890.

[27] Могилевские губернские ведомости, 1886, № 42.

[28] Погодин М. П. Древняя русская история до монгольского ига. М., 1871, т. III, с. 156.

[29] Таранович В. П. К вопросу о древних лапидарных камнях — памятниках с историческими надписями на территории Белорусской ССР.— СА, 1946, VIII, с. 254—255.

[30] Ермолович Микола. Раскрытие свидетельства истории.— Неман, 1982, № 1, с. 157.

[31] Stryjkowski M. Kronika..., t. 1, s. 108.

[32] Гваньіні Аляксандр (1538—1614) — гісторык, мемуарыст. Ураджэнец г. Вероны (Італія). Служыў у арміі С. Баторыя і Зыгмунта III, быў камендантам Віцебска. Карыстаючыся сваім службовым становішчам, вывучаў помнікі беларускай старажытнасці.

[33] Gwagnius A. Kronika..., t. III, cz. 2, s. 25, 26; Алексеев Л. В. Полоцкая земля. М., 1966, с. 183.

[34] Starożytna Polska przez M. Balińskiego i T. Lipińskiego. W-wa, 1846, t. III, s. 813.
[35] Гваньини А. Описание всей страны, подчиненной царю Московии.— ЧОИДР. М., 1897, кн. IV, с. 122—123; [Guagnini A.] Sarmatia Eurorapae descriptio guae Regnum Poloniae, Lituanim, Samogitium Russiam, Mosoviam, Prussiam, Pomeraniam, Livoniam et Moschoviae, Tartariae gue partem complectitur. Gracoviae, 1578.
[36] Калеснік Уладзімір. Зорны спеў. Мн., 1975, с. 96.
[37] Цыт. па: Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980.
[38] Там жа, с. 40; Герберштейн С. Записки о московитских делах. СПб., 1908.
[39] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь, с. 46.
[40] Relazione dell imperio Moscovita, 1553.
[41] Аделунг. Древнейшие путешествия иностранцев по России.— ЧОИНДР. М., 1863, разд. III, с. 175; Алексеев Л. В. Очерки истории белорусской дореволюционной археологии и истории краеведения до 60-х годов XIX в.— СА, 1967, № 4, с. 146.
[42] Ласіцкі Ян (1534—1605) — этнограф, краязнавец, асветнік, дыпламат. Выракся каталіцызму. Пакінуў сваю радзіму і 30 гадоў правёў на Беларусі пры двары Глябовічаў. Даследаваў звычаі і абрады на Беларусі і часткова ў Заходняй Украіне.
[43] De Russorum. Moscovitarum et Tartarorum, Religione, sacrificii nurtiarum funerum vitu... Spirae, 1582.
[44] Mitologia Jana Łasickiego polaka. O bogach Żmudzinów i innych sarmatów.— Dz. Wil., 1823, t. I, s. 248—255, 398—406; t. III, s. 308—314.
[45] Рысінскі Саламон (1560—1625) — фалькларыст, тапаніміст. Нарадзіўся ў Рысіне пад Полацкам. Працаваў настаўнікам. Жыў спачатку ў Даляцічах, а пазней у Любчы, дзе і памёр. Даследаваў Панёманне. Больш падрабязна пра яго гл.: Порецкий Я. Соломон Рысинский. Мн., 1983; Каханоўскі Г. Збіральнік народных скарбаў.— Беларусь, 1975, № 10, с. 19.
[46] Proverbiorum polonicorym a Solomone Rysinio collectorym. Lubecae ad Chronym in officina Petri Blasti Kmitae. An. Dni. M. DCXIIX (1618).
[47] Korotyński W. Solomon Rysiński. Wilno, 1863.
[48] Каратынскі У. Творы. Мн., 1981, с. 105.
[49] Там жа.
[50] Malinowski M. Rys historyczno-krytyczny piśmiennictwa heraldycznego polskiego.— BW, 1847, t. III, s. 491—492; Baliński M. Dawna Akademia Wileńska. Ptg., 1862, s. 501—507.
[51] Fasti Radiviliani. Gesta illustrissimae Domus Ducum Radzivil, compledio coutinentas. Wil., 1653.
[52] Historia Lithuaniae parsprior, derebus Lithuanorum ante susceptam christianam religionem, conjunctionemque. Magni Lituania Ducatus cum Regno librionorem. Gdańsk, 1650.
[53] Michalonis Litvani de moribus Thartarorum et Moschorum. Bazyleja, 1615.
[54] На думку М. Ф. Мельнікава, А. Меер быў галандскім вучоным. Гл.: Мельнікаў М. Ф. Адміралцейства ў Крычаве.— ПГКБ, 1973, № 3, с. 30.
[55] Мейер Андрей. Описание Кричевского графства 1786 года или же бывшего староства.— Могилевская старина. Могилев, 1901, в. 2.
[56] Там жа, с. 89.
[57] Дневник путешествия в Московскую державу.— Чтение в императорском обществе истории и древностей российских при Московском университете. М., 1866—1867.
[58] Karpiński H. Lexykon geograficzny dla gruntownego pojęcia gazet i historyi z różnych autorów zebrany... Wilno, 1766, s. 492.
[59] Krótkie zebranie historyi i geografii Polskiej. Suprasl, 1767, s. 382.
[60] Dyaryusz podróży na sejm Grodzieński. 1752.— Litwa i Ruś, t. II, z. 1, kwiecień 1912, s. 1—27.
[61] Алексеев Л. В. Полоцкая земля..., с. 10; Mienicki Wincenty. Wykopalicko w Mosarzu.— Wiadomości numizmatyczno-archeologiczne, 1892, 1—2, s. 285—289.
[62] Тацішчаў Васіль Мікітавіч (1686—1750) — дзяржаўны і ваенны дзеяч, гісторык, археограф, географ. Нарадзіўся ў Пскоўскай губ. Паходзіў з беларускага роду князёў Саламярэцкіх. Збіральнік старажытных рукапісных дакументаў. Удзельнічаў у Паўночнай вайне (1700—1721), у час якой на чале вайсковага атрада праходзіў па Беларусі.
[63] Татищев В. Н. История Российская. М.— Л., 1963, т. 2, с. 79; Ермолович Н. И. Из истории Новогрудка.— У зб.: БД. Мн., 1972, с. 343; Ён жа. Тацішчаўскія звесткі пра Беларусь.— ПГКБ, 1976, № 2, с. 33—35; Ён жа. Новыя факты, старая схема.— Неман, 1983, № 1, с. 148—149.
[64] Татищев В. Н. История Российская, т. 2, с. 79.
[65] Гісторыя Беларускай ССР, т. 1, с. 88, 594.
[66] Татищев В. Н. История Российская, т. 2, с. 54.

[67] Там жа, с. 63.

[68] Кульчынскі Ігнат (1707 — каля 1747) — гісторык і царкоўны дзеяч. Нарадзіўся каля Гродна. Жыў у Рыме (1727—1735), дзе пачаў займацца гісторыяй царквы. Адну працу прысвяціў святыням Жыровіцаў. З 1735 г. — гродзенскі архімандрыт. Не раз рабіў захады па ахове помнікаў старажытнасці, даваў распараджэнні па іх умацаванні. Напісаў хроніку кляштара Каложы. Памёр у Гродне.

[69] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильно, 1870, т. IX, с. 409—412.

[70] Воронин Н. И. Древнее Гродно, с. 137.

[71] Богуш-Сестранцэвіч Станіслаў Іванавіч (1731—1826) — вучоны, літаратар, царкоўны дзеяч. Нарадзіўся ў в. Занкі Ваўкавыскага павета. З 1813 г. прэзідэнт Вольнага эканамічнага таварыства. Прапагандаваў ідэі асветніцтва, гуманізму. Узначальваў каталіцкую царкву ў Расіі. Арганізаваў друкарню ў Магілёве.

[72] Wiaryha-Darewski. Młodość Bohusza Siestrancewicza. Kraków, 1873.

[73] Мальдзіс Адам. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974, с. 83—84.

[74] Historia narodu Polskiega przez A. Naruszewicza. Lipsk, 1780—1824, s. I—VII.

[75] Нарушэвіч Адам-Станіслаў (псеўданім Даніэль Кальвінскі, 1733—1796) — гісторык і паэт, нарадзіўся ў Пінску ў сям'і шляхціца. Быў смаленскім, а пазней луцкім епіскапам, выступаў за моцную каралеўскую ўладу. На гісторыю глядзеў як на свецкую навуку. У яго паэзіі гучыць любоў да роднага краю.

[76] Гаранин Э. Киевская летопись XII в. в польской историографии. — ВИ, 1974, № 9, с. 188.

[77] Dzieje folklorystyki polskiej. W-wa, 1970, s. 177.

[78] Таранович В. П. Экспедиция академика И. И. Лепехина в Белоруссию и Лифляндию в 1773 г. — Архив истории, науки и техники. М.; Л., 1935, сер. I, вып. 1, с. 545—568.

[79] Записки путешествия по западным провинциям Российского государства, или Минералогические хозяйственные и другие примечания, учиненные во время проезда через оные в 1802 году академиком В. Севергиным. СПб., 1803, с. 136.

[80] Там жа, с. 129.

[81] Гісторыя Беларускай ССР, т. 1, с. 88, 593.

[82] Державин Г. Р. Соч. СПб., 1871, т. VI, с. 390—393, 719—723, 742.

[83] Кіркевіч А. Гродна 400 год назад. — Беларусь, 1965, № 11, с. 30.

[84] Кішык Ю. М. Гродна сярэдневяковы. — ПГКБ, 1974, № 4, с. 23—28.

[85] Воронин Н. Н. Древнее Гродно, с. 149—195; Ён жа. Раскопки в Гродно. — КСИ ИМ, вып. XXVII.

[86] Макоўскі Тамаш (каля 1562—каля 1575—каля 1630) — гравёр, картограф, друкар. Працаваў пры нясвіжскім двары князёў Радзівілаў.

[87] Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии (XVI—XVII вв.). Мн., 1966, с. 22.

[88] Jakubowski Jan. Tomasz Makowski sztukarz i kartograf Nieświeski. W-wa, 1923, s. 1.

[89] Пахалавіцкі Станіслаў — інжынер, мастак-графік XVI ст. Сакратар каралеўскай канцылярыі Стэфана Баторыя ў час яго паходу праз паўночную Беларусь і дзяржаву Маскоўскую.

[90] Чертеж и описание 1701 г., декабря 11, учиненное стольником Максимом Цызаревым, начав от Витепска вверх до вершин Двины реки, с показанием сел, деревень, лесов и судов по оной реке ходящих. — Река Западная Двина. Сост. и изд. А. Сапунов. Витебск, 1893, с. 52—53, 501—506.

[91] Река Западная Двина..., с. 506.

[92] Там жа, с. 506.

[93] Чантурия В. А., Трацевский В. В. Охрана архитектурного наследия и сел Белоруссии. — Стр-во и архит. Белоруссии, 1981, № 4, с. 16; Федорова И. С. Архитектурно-ландшафтные аспекты охраны и реставрации памятников истории и культуры. — Стр-во и архит. Белоруссии, 1981, № 2, с. 8—10.

[94] Мальдзіс А. Музы ў Нясвіжы і Слуцку. — Беларусь, 1965, № 2.

[95] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. I, спр. 55, л. 488.

[96] Каханоўскі Г. Збіральніцтва і ахова помнікаў у XVIII ст. на Беларусі. — ПГКБ, 1975, № 4, с. 44—45.

[97] Numizmatyka. Medale Radziwiłłowskie. Gabinety numizmatyczne: Nieświeżski, Charkowski. — Tygodnik Petersburski, 1830, N 38, 40.

[98] Kotłubaj Edward. Galerja Nieświeżska potretów Radziwiłłowskich. Wilno, 1857, s. 534.

[99] Chwalewik E. Zbiory polskie archiwa biblioteki gabinety muzea i inne zbiory pamiątek przeszłości w Ojczyznie i Obczyznie. W-wa. NCMXXVII, t. II, s. 11.

[100] Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понемонья. М.; Л., 1965, с. 5; ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 55, л. 448—449.
[101] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 55, л. 407—419.
[102] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 3, спр. 467, л. 41—52; 43—44; 64 і інш.
[103] Цыбуля В. Прыватная бібліятэка Храптовічаў.— Голас Радзімы, 1973, № 44.
[104] Храптовіч Іахім (1729—1812) нарадзіўся ў Шчорсах каля Карэліч. Быў міністрам замежных спраў Вялікага княства Літоўскага, падканцлерам, канцлерам.
[105] Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понемонья, с. 6; Ettinger Paweł. Iochim Chreptowicz jako miłośnik sztuki.— Odgłosy, 1916, s. 59—65.
[106] Мальдзіс А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980, с. 239.
[107] Przezdziecki A. Galerja obrazów Postawska.— Athenaeum, 1842, t. II, s. 194—202.
[108] Radziszewski F. Krótka wzmianka o jezuitach na Bialorusi i o byłej Połockiej Akademii.— Rubon, 1847, t. VIII, s. 63.
[109] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь, с. 256.
[110] Формозов А. А. Очерки по истории русской археологии. М., 1961, с. 8.

### ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА І АРХЕАЛОГІЯ Ў ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XIX ст.

[1] Гісторыя Беларускай ССР, т. 1, с. 447.
[2] Очерки истории исторической науки в СССР. М., 1955, т. 1, с. 273.
[3] Surowiecki W. Rozprawa o sposobach dopełnienia historii i znajomości dawnych słowian, czytana [...] dnia 19 stycznia 1809.— Roczniki TPNW, s. 100.
[4] Maślanka J. Zorian Dołęga Chodokowski. Wrocław—W-wa—Kraków, 1965, s. 87.
[5] Bandkie J. Dzieje narodu Polskiego. Kraków, 1810.
[6] Monety dawnej Polski jako też prowincji i miast do niej niegdyś należących, z trzech ostatnich wieków. Zebrane, uporządkowane i z przywiedzieniem źródeł historycznych opisane przez Ignacego Zagorskiego. W-wa, 1845.
[7] Czarnowska M. Zabytki mitologii słowiańskiej w czasopismach ludu wiejskiego na Bialej Rusi dochowane (gub. Mogilewska).— Dz. Wil., 1817, t. VI, s. 396—408.
[8] Chołdziewski K. Archeologia słowiańska.— Аддзел рукапісаў бібліятэкі АН ЛітССР, ф. 148, арк. 1—312.
[9] Плятар Адам Аўгусцінавіч (1790—1862) — археолаг, біёлаг, краязнавец і калекцыянер. Належаў да вядомага на Беларусі магнацкага роду. Скончыў Віленскі універсітэт (1817). Вёў археалагічныя раскопкі ў Віцебскай губ. Супрацоўнічаў з Я. П. Тышкевічам, К. А. Буйніцкім і інш. Ганаровы член Кракаўскага навуковага таварыства (1821), член Віленскай археалагічнай камісіі (1857).
[10] Plater A. O dawnich grobach i starożytnościach odkrytych w Inflantach Polskich.— Rubon, 1845, t. 5.
[11] Гэта сцвярджае і вядомы сучасны археолаг В. В. Сядоў (Длинные курганы кривичей. М., 1974, с. 5).
[12] Poszukiwania historyczne, do jakiego narodu należeć mogły groby znajdowane w Inflantach i innych Nadbałtyckich prowincjach przez A. Platera.— Rubon, 1846, t. 6, s. 8—9.
[13] Plater A. Połock,— Rubon, 1843, t. 4; Rzut oka na wioski i pola w Inflantach.— Rubon, 1843, t. 3.
[14] Plater A. O dawnych grobach..., s. 18.
[15] Там жа, с. 19.
[16] Там жа, с. 25—31.
[17] Русский библиофил, 1912, № 3, с. 102.
[18] Алексеев Л. В. Полоцкая земля..., с. 223.
[19] Список русским памятникам, служащим к составлению истории художеств и отечественной полиграфии, собранным и объясненным П. Кеппеном. М., 1822, с. 45.
[20] Материалы для истории и просвещения России, собираемые Петром Кеппеном. Библиографические листы. СПб., 1825, с. 562—564.
[21] Нямцэвіч Юльян Марцэлевіч (1757—1841) — пісьменнік і краязнавец. Адъютант Т. Касцюшкі. З 1827 г. старшыня Варшаўскага таварыства сяброў навук. Нарадзіўся ў Скоках пад Брэстам, памёр у эміграцыі.
[22] Limanowski Bolesław. Dzieje Litwy. W-wa, 1917, s. 43.
[23] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь, с. 75—76.
[24] Zbiór pamiętników historycznych o dawnej Polsce przez J. U. Niemcewicza. W-wa, 1830, t. V, s. 176.
[25] Белорусский архив. М., 1824, ч. I.
[26] Улашчык М. Літаратурная спадчына Івана Грыгаровіча.— ЛіМ, 1960, 12 крас.;

Краязнаўства на Магілёўшчыне да Кастрычніцкай рэвалюцыі.— Магілёўшчына. Магілёў, 1927, т. I, с. 150.

[27] Даніловіч Ігнат Мікалаевіч (1787—1843) — археограф, гісторык права, прафесар Віленскага, Харкаўскага, Кіеўскага і Маскоўскага універсітэтаў.

[28] Боричевский И. П. Известия о древних памятниках, находящихся в ведомстве Главного управления путей сообщения и публичных зданий.— Известия имп. археологич. о-ва, 1861, т. 3, в. 4.

[29] Нарбут Юстын (1773—1845) — гісторык і ваенны дзеяч. Стрыечны брат гісторыка Т. Нарбута. Нарадзіўся пад Гроднам, жыў у Юрчышках Лідскага павета. Збіраў разнастайныя крыніцы па гісторыі старажытнай Беларусі і Літвы.

[30] N[arbytt] J[ustyn]. Rys pierwiastków narodu Litewskiego. Grodno, 1818.

[31] Witkowska Alina. Rowieśnicy Mickiewicza. W-wa, 1962, s. 193.

[32] Мальдзіс Адам. Творчае пабрацімства. Мн., 1966, с. 21.

[33] Пыпин А. Н. История русской этнографии. Белоруссия и Сибирь. СПб., 1892, т. IV, с. 144.

[34] Лойка А. А. Адам Міцкевіч і беларуская літаратура. Мн., 1959; Jankowski W. Mickiewicz a podania ludu białoruskiego.— Pamiętnik Literacki. Lwów, 1904, zesz. II, s. 305—306; Swirko S. Filomaci a folklor.— Ludowość u Muckiewicza. W-wa, 1958, s. 64—68.

[35] Мицкевич А. Собр. соч. М., 1954, т. 4, с. 84.

[36] Чачот Ян (1796—1847) — беларускі паэт, фалькларыст і грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў в. Малюшчыцы Навагрудскага павета. Вучыўся ў Віленскім універсітэце. Адзін з кіраўнікоў таварыства філаматаў. Быў у ссылцы на Урале.

[37] Мальдзіс Адам. Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мн., 1969, с. 16.

[38] Ольшанский П. Декабристы и польское национальное освободительное движение. М., 1959, с. 117.

[39] Каханоўскі Г. Ян Чачот на Урале.— Беларусь, 1979, № 1, с. 14.

[40] Зан Тамаш (1796—1855) — паэт і фалькларыст, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў в. Мясата каля Маладзечна. Вучыўся ў Маладзечне і Вільні. Кіраваў таварыствам філаматаў.

[41] Баброўскі Міхаіл Кірылавіч (1784—1848) — славіст, гісторык, археограф, археолаг. Скончыў Віленскі універсітэт і сам пазней стаў прафесарам гэтага універсітэта. Член Археалагічнай акадэміі ў Рыме, член многіх навуковых таварыстваў. У 1824 г. за прагрэсіўныя погляды быў пазбаўлены прафесарскага звання.

[42] Карский Е. Ф. Белорусы. Варшава, 1903, т. III, с. 78.

[43] Контрым Казімір Пятровіч («Пётр з-пад Крэвы», 1772—1836) — журналіст, эканаміст, грамадскі дзеяч, удзельнік паўстання 1794 г. Нарадзіўся ў Багданаве Вілейскага павета. Ініцыятар стварэння (у 1817 г.) таварыства шубраўцаў, а з 1818 г. яго кіраўнік. Памочнік рэдактара «Дзенніка Віленьскага».

[44] Podróż Kontryma, urzędnika danku polskiego, odbyta w roku 1829 po Polessiu. Poznań, 1839.

### З. Я. ДАЛЕНГА-ХАДАКОЎСКІ

[1] В. Падгайная знаходзіцца ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобл. Гэтую назву падаюць польскія і некаторыя іншыя крыніцы. Украінскія даследчыкі называюць фальварак «пад Гайнай» у сучасным Лагойскім р-не (УРЕ, т. 4, 1961, с. 283; Українські народні пісні в записах Зоріана Доленги-Ходаковського. Київ, 1974, с. 23). Пакуль што пытанне аб месцы нараджэння З. Даленгі-Хадакоўскага застаецца адкрытым. Не дае канкрэтнага адказу і радаслоўная Чарнецкіх (ЦДГА БССР, ф. 299, воп. 1, спр. 422, л. 1—713; ф. 319, воп. 2, спр. 3617, л. 1—55).

[2] Формозов А. А. Очерки по истории русской археологии..., с. 60.

[3] «O słowiańszczyznie przed chrześćjańsťwem» oraz inne pisma i listy. W-wa, 1967, s. 278.

[4] Там жа, с. 226.

[5] Каханоўскі Г. Унікальны дакумент.— ЛіМ, 1964, 21 жн.; Ён жа. Открытый лист З. Доленги-Ходаковского.— У кн.: Белорусские древности. Мн., 1967, с. 453—455. Зараз гэты дакумент захоўваецца ў абласным краязнаўчым музеі ў г. Маладзечна (а. ф. № 1675).

[6] Историческая система Ходаковского.— РИС. М., 1838, кн. 3.

[7] Maślanka J. Dolęga Chodakowski. Jego miejsce w kulturze polskiej i wpływ na polskie piśmiennictwo romantyczne. Wrocław, 1965.

[8] «O słowiańszczyznie przed chrześćjańsťwem» oraz inne pisma i listy. W-wa, 1967.

[9] Азадовский М. История русской фольклористики. М., 1958, т. 1, с. 283.

[10] Rawita-Gawroński. Zorian Dolęga Chodakowski, jego zycie i praca. Lwów, 1898.

[11] Малаш-Аксамітава Л. А. Доленга-Ходаковский (Адам Черноцкий) и его наследие.— Lud, t. 51, s. 123—163; Яна ж. Пионер славянской фольклористики З. Я. Доленга-Ходаковский. Автореф. дис. ... канд. филол. наук. К., 1967.
[12] Українські народні пісні в записах Зоріана Доленги-Ходаковского. К., 1974.
[13] Lud, t. 51, s. 124—125.
[14] Историческая система Ходаковского.— РИС, т. I, кн. 3, 1838.
[15] Колайдович К. Ф. Письма об археологических исследованиях в Рязанской губернии. М., 1822.
[16] Историческая система Ходаковского..., с. 5.
[17] Там жа.
[18] Розыскания касательно Русской истории..., с. 279.
[19] Спицын А. А. Городища дьякова типа.— ЗОРСА, т. V, вып. 3, СПб., 1903; Ён жа. Новые сведения о городищах дьякова типа.— ЗОРСА, т. IVII, вып. 1. СПб., 1905.
[20] Алексеев Л. В. Очерки истории белорусской дореволюционной археологии..., с. 149; Рыбаков Б. А. Стольный город Чернигов и удельный город Вшиж.— У кн.: По следам древних культур. М., 1953, с. 108—113; Никольская Т. Н. Городище у деревни Николо-Ленивец.— СА, 1962, № 1, с. 240.
[21] Письмо Ходаковского к З. Я. Корнееву.— КС, 1891, т. XXXIII, с. 473.
[22] Историческая система Ходаковского..., с. 12.
[23] Там жа.
[24] Рукапіс захоўваецца ў Дзяржаўнай бібліятэцы СССР імя У. І. Леніна, ф. 255, к. 18, адз. зах. 30 і Публічнай бібліятэцы імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе, ф. 488. Часткова слоўнік быў апублікаваны ў РИС, 1844, т. VII, с. 41—367.
[25] Монгайт А. Л. Археология Западной Европы. Каменный век. М., 1973, с. 49—50.
[26] Bronowski Fr. Wawrzyniec Surowiecki jako badacz dawnej Słowiańszczyzny.— Zeszyty naukowe Uniwersytetu Łódzskiego. Seria I, 1956, z. 3, s. 73—100.
[27] Majewski W. O słowianach i ich pobratymcach. W-wa, 1816.
[28] Цыт. па: Maślanka J. Zorian Dołęga Chodakowski..., s. 64—65.
[29] Доленга-Ходаковский З. Розыскания касательно Русской истории.., с. 290.
[30] Там жа, с. 293.
[31] Завитневич В. З. Формы погребального обряда в могильных курганах Минской губернии.— Тр. IV АС. М., 1895, т. 1; Ён жа. Область дреговичей как предмет археологического исследования.— Тр. Киевск. духовн. академии, 1886, кн. 8, с. 580.
[32] «O słowiańszczyznie przed chrześćjaństwem»..., s. 53.
[33] Athenaeum. Wilno, 1842, od. 2, z. 1, s. 228—229.
[34] «O słowiańszczyznie przed chrześćjaństwem»..., s. 51.
[35] Лысенко П. Ф. Города Туровой земли. Мн., 1974, с. 34.
[36] Пути сообщения в древней России.— РИС, М., 1837, т. 1, кн. 1, с. 37.
[37] Карамзин Н. М. История государства Российского, т. II, с. 71, заўвага 117; т. III, с. 216.
[38] Жучкевич В. А. Дороги и водные пути Белоруссии. Мн., 1977, с. 17—49.
[39] Цяпер мясцовыя жыхары называюць «Пераваланчя».
[40] Пути сообщения в древней России, с. 36.
[41] Там жа, с. 38.
[42] Athenaeum, 1842, od. 2, z. 1, s. 228—229.
[43] Там жа, с. 230.
[44] Цыт. па: Малаш-Аксамитова Л. А. Доленга-Ходаковский..., с. 130—131.
[45] Listy Zoriana Chodakowskiego do J. S. Bandkiego.— Pamiętnik naukowy, 1837, t. III, s. 12—25.
[46] «O słowiańszczyznie przed chrześćjaństwem», s. 361.
[47] Цыт. па: Аляксееў Леанід. Вяртаючы народу мінулыя стагоддзі.— Полымя, 1969, № 12, с. 190.
[48] Maślanka J. Наз. твор, с. 81; Ленінградская публічная бібліятэка імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына, рук. аддзел, сігн. 2018/1.
[49] Погодин М. Древняя русская история до монгольского ига. М., 1871.
[50] Путевые заметки Ходаковского.— ЖМНП, 1838, № XI, с. 279—527.
[51] Biblioteka Warszawska, 1889, t. 1, s. 378.
[52] Путевые заметки Ходаковского..., с. 523.
[53] Durczewski Z. Stary zamek w Grodnie w świetle wykopalisk dokonanych w latach 1937—1838.— Niemen, 1939, N 1, s. 4.
[54] Воронин Н. Н. Древнее Гродно, с. 32.
[55] Историческая система Ходаковского, с. 47.
[56] Письмо Ходаковского к З. Я. Корнееву.— КС, 1891, т. XXXIII, с. 470.
[57] Спицын А. А. Сопки и жальники.— ЗРАО, т. XI, вып. 1—2, новая серия, 1899, с. 149.
[58] Пушкин А. С. Соч., т. V, с. 100, 418; Формозов А. А. Пушкин и Ходаков-

скнй.— Прометей. М., 1974, т. X, с. 100—105; Формозов А. А. Пушкин и древности. М., 1979, с. 69—78.

### Т. Я. НАРБУТ

[1] Narbutt T. Dzieje starożytne narodu Litewskiego. Wilno, 1835—1841, t. I—IX.
[2] Каханоўскі I. Тодар Нарбут — археолаг і крыніцазнаўца.— Беларусь, 1976, № 6, с. 29.
[3] Narbutt T. O kurhanach. Badanie starożytności Litewskich.— Tyg. Wil., 1818, t. VII, N 123, s. 163.
[4] Там жа, с. 161.
[5] O kurhanach..., s. 164.
[6] Narbutt T. Dzieje starożytne narodu Litewskiego, t. I, s. 361.
[7] Narbutt T. Pomniejsze pisma historyczne. Wilno, 1856, s. 4—5.
[8] Там жа, с. 21—25.
[9] Narbutt T. Dzieje starożytne narodu Litewskiego, t. II, s. 121.
[10] Очерки по археологии Белоруссии, ч. II, с. 42—47.
[11] Narbutt T. Dzieje starożytne, t. V. Dodatek 1, s. 1.
[12] Ткачоў М. А. Лідскі замак.— ПГКБ, 1971, № 2, с. 14; Грыцкевіч А. П. Калі заснавана Ліда? — ПГКБ, 1972, № 3, с. 29—30; Гісторыя Беларускай ССР, т. 1, с. 88.
[13] Narbutt T. Dzieje starożytne..., t. V. Dodatek 1, s. 3.
[14] Там жа, т. 8, с. 477.
[15] Там жа, т. V.
[16] Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. Мн., 1978, с. 31.
[17] Narbutt T. Pomniki do dziejów Litewskich. Wilno, 1846.

### СТАНАЎЛЕННЕ АРХЕАЛОГІІ І ГІСТАРЫЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА Ў ДАРЭФОРМЕННЫ ПЕРЫЯД

[1] Гісторыя Беларускай ССР, т. 1, с. 579.
[2] Там жа, с. 534.
[3] Дело петрашевцев. М.— Л., 1937, т. 1, с. 336.
[4] Чепко В. В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. Мн., 1972, с. 164.
[5] Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць. Мн., 1968, с. 205.
[6] Nadolski A. Iachim Lelewel nakład do archeologii.— Kw. H., RLXXVIII, z. 4, 1961, s. 931.
[7] Tomsen Ch. J. Ledetraad til Nordisk Oldkyndighend. Kopenhavn, 1836; Монгайт А. Л. Археология Западной Европы. Каменный век, с. 16—17.
[8] Гісторыя Беларускай ССР, т. 1, с. 517.
[9] Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968, с. 157.
[10] Дыплом ганаровага члена Навуковага таварыства ў Даніі захоўваўся ў праўнучкі І. Р. Кулакоўскага — пісьменніцы Людвікі Войцік (Зоські Верас).
[11] ЦДГА БССР, ф. 295, воп. 1, інв. № 609, зв. 46, л. 14—15.
[12] Rypiński A. Białoruś. Kilka słów o poezji prostego ludu tej naszej polskiej prowincji, o jego muzyce, spiewie, tańcach etc. Paryż, 1840.
[13] Там жа, с. 16.
[14] Там жа, с. 18.
[15] Szlachcic Zawalnia, czyli Białoruś w fantastycznych opowiadaniach przez J. Borszczewskiego. Petersburg, 1844—1846, t. I—IV.
[16] Szlachcic Zawalnia..., t. 1, s. 3.
[17] ЦДГА Карэльскай АССР, ф. 1, воп. 10, спр. 7/7, л. 1—52.
[18] Дзяржархіў Арэнбургскай вобл., ф. 6, воп. 18, спр. 253, л. 1—40.
[19] Там жа, л. 37.
[20] Друцкий-Подберезский Р. Город Борисов. Исторический взгляд.— Иллюстрация, 1848, т. 6, № 22.
[21] Там жа, с. 134.
[22] Зараз Стара-Барысаў, цэнтр саўгаса «Стара-Барысаў» Барысаўскага р-на.
[23] Очерки по археологии Белоруссии, ч. II, с. 92—93.
[24] Друцкий-Подберезский Р. Город Борисов..., с. 136.
[25] Мохнач Н. И. Идейная борьба в Белоруссии в 30—40-е годы XIX в. Мн., 1971, с. 98; Дорошевич Э., Конон В. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. М., 1972, с. 156.
[26] Борх Міхал Іосіфавіч (1806—1881) — краязнавец, гісторык, бібліяфіл, паэт. Жыў

у сваім маёнтку Прэлі Дынабургскага павета. Цікавіўся віцебскімі старажытнасцямі.

27 Dwa slowy o Dźwinie przez Michała Borcha. Wilno, 1843.

28 Tygodnik Petersburgski, 1844, N 24.

29 Tygodnik Petersburgski, 1844, N 43, N 44.

30 Алексеев Л. В. Полоцкая земля..., с. 109.

31 ЦДГА БССР, ф. 2512, воп. 1, спр. 667, арк. 251, 253.

32 Jaroszewicz J. Materiały do statystyki i etnografii gubernii Grodzieńskiej. Powiat Belski.— Athenaeum. Wilno, 1848, t. VI, s. 168—186.

33 Ярашэвіч Іосіф Бенядзіктавіч (1793—1860) — этнограф, гісторык, юрыст, краязнавец. Нарадзіўся ў г. Бельску Гродзенскай губ. Пасля заканчэння Віленскага універсітэта выкладаў у Крамянецкім ліцэі, а з 1886 г.— прафесар Віленскага універсітэта. Апошнія 30 гадоў жыў у Бельску.

34 Jaroszewicz J. Obraz Litwy pod względem cywilizacji od czasów najdawniejszych do konca wieku. T. I—III. Wilno, 1844—1845.

35 Jaroszewicz J. Drohiczyn. Opis historyczny.— Athenaeum, 1847, t. IV, s. 38.

36 Ч. Янкоўскі лічыць, што М. Балінскі нарадзіўся ў Яшунах (за 30—40 км ад Вільні).

37 Baliński M. Historia miasta Wilna. Wilno, 1836—1837, t. I—II.

38 Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska. W-wa, 1846, t. III.

39 Там жа, с. 7.

40 Там жа, с. 222—224.

41 Там жа, с. 252—257.

42 Там жа, с. 623—648.

43 Там жа, с. 243.

44 Там жа, с. 237—238.

45 Там жа, с. 239—240; Покровский Ф. В. Археологическая карта Виленской губернии. Вильно, 1893.

46 Starożytna Polska. T. I—IV. W-wa, 1885—1886.

47 Там жа, т. III, с. 794.

48 Там жа, т. IV, с. 595.

49 Baliński M. Krewo, starożytny zamek w Litwie. W-wa, 1842—1843.

50 Там жа, с. 29.

51 Baliński M. Pamiętniki historyczne do wyjasnienia spraw publicznych w Polsce XVIII w. Wilno, 1859, s. VIII—IX.

52 Kondratowicz L. (Syrokomla Wł.). Dzieje literatury w Polsce. W-wa, 1875, t. III, s. 169.

53 Athenaeum, 1847, t. IV, zesz. IV; Kolberg O. Białoruś-Polesie. Dzieła wszystkie, t. 52. Wrocław—Poznań, 1958.

54 O uroczyskach i zwyczajach ludu Pińskiego, oraz o charakterze jego pieśni przez Romualda Zieńkiewicza.— BW, 1852, t. IV, s. 506—507.

55 Саламевіч Я. Рамуальд Сымонавіч Зянькові.— Полымя, 1968, № 9, с. 253.

56 Zieńkiewicz Romuald. O kurhanach i grodziskach powiatu Oszmiańskiego.— Athenaeum, 1848, t. V.

57 Бібліятэка АН ЛітССР, рукапісны аддзел, ВГ—1925, л. 1—42.

58 Куторга Сцяпан Сымонавіч (1805—1861) — геолаг, заолаг, медык. Прафесар Пецярбургскага універсітэта. Прапагандыст ідэй Ч. Дарвіна. Лаўрэат Дзямідаўскай прэміі.

59 Kutorga S. Notiz über zwei Menschen—Schodel aus dem Gouvernement Minsk.— Verhandlungen der Russisch kais erlichen Mineralogischen Gesellschaft zu St.— Petersburg, 1842, S. 35—39.

60 Формозов А. А. Проблемы древнего человека в русской печати XIX столетия (наука, церковь, цензура).— СА, 1982, № 1, с. 6.

61 Белорусские древности А. М. Сементовского. СПб., 1890, вып. 1.

62 Артыкул К. А. Гаворскага захаваўся ў архіве (ЦДГА БССР, ф. 1416, воп. 6, адз. зах. 184, л. 53—72).

63 Алексеев Л. В. Очерк истории белорусской дореволюционной археологии, с. 154, Полоцкая земля, с. 36.

64 Говорский К. А. Поездка 14 сентября 1852 г., с. 93.

65 Там жа, с. 100.

66 Говорский К. А. Историческое описание Полоцкого Борисоглебского монастыря.— ВЗР, 1864, ноябрь, с. 16.

67 Воронин Н. Н. Бельчицкие руины.— Археологическое наследство, вып. 6. М., 1956, с. 18.

68 Алексеев Л. В. Очерки истории белорусской дореволюционной археологии, с. 158.

69 ЦДГА БССР, ф. 1430, воп. 1, спр. 32731, л. 1—9.

[70] Турчинович О. В. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. СПб., 1857.
[71] ЦДГА СССР, ф. 777, воп. 2, аддз. зах. 9, л. 9.
[72] ЖМВД, 1851, ч. 33, с. 212—226.
[73] Емельянов А. С. Крестьянская поэзия белорусов в Латгалии.— У зб.: Тыпалогія славянскіх моў і ўзаемадзеянне славянскіх літаратур. Мн., 1977, с. 23.
[74] Мугуревич Э. С. Восточная Латвия и соседние земли в X—XIII вв. Рига, 1965.
[75] Rosińska-Derwojed A. Z twórczości malarza białostockiego Michała Kuleszy.— Rocznik Białostocki, 1961, t. 1, s. 255—271.
[76] Кішык Ю. На малюнках — нашы гарады.— Беларусь, 1976, № 10, с. 28—29.
[77] Дробаў Л. Н. Напалеон Орда — мастак і збіральнік.— ПГКБ, 1971, № 3, с. 45—47.

## Я. П. ТЫШКЕВІЧ

[1] Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Мн., 1948.
[2] Улащик Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. М., 1973, с. 51.
[3] Тышкевич Е. Быстрый взгляд на источники местной археологии или описание некоторых древних памятников, открытых в западных губерниях Российской империи.— Вил. В., 1843, № 21; Tyszkiewicz J. Rzut oka na źródła archeologii krajowej. Wilno, 1843.
[4] О древних могилах в Минской губернии и Литве.— СО, 1838, т. VI.
[5] О древних могилах в Минской губернии и Литве.— СО, 1838, т. VI, отд. VI, с. 51—58.
[6] Там жа, с. 52.
[7] О древних могилах в Минской губернии..., с. 56.
[8] Там жа.
[9] Badanie archeologiczne nad zabytkami przedmiotów sztuki rzemiosł i t. d. w dawnej Litwie i Rusi Litewskiej przez Eustachego hr. Tyszkiewicza. Wilno, 1850, s. 49—55.
[10] Там жа, с. 60.
[11] Спицын А. А. Расселение древнерусских племен по археологическим данным.— ЖМНП, 1899, № 8.
[12] Арциховский А. В. Курганы вятичей. М., 1930.
[13] Левашева В. П. Височные кольца.— В сб.: Очерки по истории русской деревни X—XIII вв. М., 1967.
